№ 38 (396) 15 кастрычніка 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Э Т А

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Браты Крэчаты**
Жыццё ў канспірацыі.
старонка 3

**Шырын Эбадзі**
Калі спрацоўвае байкот.
старонка 4

**Сяргей Навумчык**
Не сумую, што Быкаў не атрымаў Нобэлю.
старонка 2

**Школа**
Эсэ Эльфрыды Елінэк, нобэлеўскай ляўрэаткі-2004.
старонка 15

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Чаму я прагаласую за камуніста

Выступаючы на АНТ, Урал Латыпаў выказаў думку, што «чытачы «Нашай Нівы» прагаласуюць за Лукашэнку, бо толькі Лукашэнка можа адстаяць дзяржаву». Я ўпэўнены ў адваротным. Яны выкажуцца нават не супраць асобы Лукашэнкі, а супраць сыстэмы, якая ствараецца пры зьняцьці канстытуцыйных абмежаваньняў. Нічога не вартая тая сыстэма, што трымаецца на адным чалавеку. Гарантыя незалежнасьці — воля грамадзтва, а не аднаго чалавека. У рэдакцыйнай пошце за два апошнія месяцы не было ніводнага ліста «за», толькі «супраць». Аргумэнты, чаму людзі выбіраюць галасаваньне «супраць» або байкот, — у падсумаваньні чытацкае пошты на **старонцы 2**.

Высакамерна разьлічваючы на адміністрацыйны рэсурс, Урал Латыпаў кінуў нацыянальнаму руху перад рэфэрэндумам нават ня костачку, а абяцанку на вецер. Раней трэ было дбаць, панове!

Тое, што адбываецца ў Беларусі, — гэта не свабодныя выбары і не дэмакратыя. Але і такі фарс правярае грамадзтва на сьпеласьць. Тое грамадзтва, якое галасуе ці байкатуе выбары, і тое, якое лічыць halasy. Любая фальсыфікацыя стане вядомай.

Улады разьлічваюць, што нацыянал-дэмакраты не прагаласуюць за камуністаў, а камуністы — за нацыянал-дэмакратаў. Што атрымаюцца такія вынікі, каб людзі зьняверыліся ў апазыцыі, каб зьніклі апазыцыйныя структуры. Лукашэнкаўцы чакаюць гэтага нават болей за самога прэзыдэнта. Тады б ім удалося хутчэй і бяз рызыкі замяніць Лукашэнку, гады якога зьлічаны, на выгадную ім новую фігуру, пры якой яны захавалі і ўзмацнілі б кантроль над эканомікай.

Я аддам свой голас кандыдату-камуністу ня толькі таму, што ён у мяне ў акрузе адзін супрацьстаіць «беспартыйнаму».

Выбарчая і рэфэрэндумная кампанія не прайшлі без карысьці для нацыянальнага руху. Ён адкрыў магчымасьць супрацы нацыянал-дэмакратаў з сацыялістамі і новымі камуністамі ў рамках «Пяцёркі+» і наблізіўся да пераасэнсаваньня сваіх маральных і сацыяльных ідэалаў.

Сацыялістычны асяродак спарадзіў нацыянальнае адраджэньне пачатку XX ст., першую «Нашу Ніву» і дзяржаўнасьць 1918—1919 г. Пасьля левая ідэя зьнішчыла сябе ў савецкі час, устаўшы на службу шавіністычнай ідэі Вялікай Расеі і яе гегемоніі. Беларусі патрэбныя новыя левыя, угрунтаваныя на ідэалах сацыяльнай справядлівасьці, роўных шанцаў, права і творчага нацыянальнага будаўніцтва.

Ператварэньне цяперашніх сацыялістаў і камуністаў у новую левую сілу, ужо ня постімпэрскую, а скіраваную ў будучыню, адкрывае перад нацыянальным рухам новую праграму і пэрспэктыву.

**Андрэй Дынько**

# Мы любім вас усіх




PHOTO.BYMEDIA.NET

Максім Танк

Мы любім вас усіх,
І вашы ўсе заслугі
Ня сьцерліся з худых
Плячэй зь сьлядамі пугі.
З пашанай хілім карк
Да самых ботаў, нізка,
Нічога, што рука
Чагось шукае блізка.
Калі ж пад рызманом
Вам нешта ўдасца выкрыць —
Сякеру альбо лом,
Ці ў слове нашым іскры, —
Ня трэба дзіка выць
І псуць жалезам зубы,
Ня можа нешта быць,
Калі мы вас так любім!
Сьвятыя вы для нас,
Вялікія над ўсімі, —
А некалі ж мы вас
Яшчэ вышэй падымем!
*1937*

## Дык падпісвайся

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага жыцьця на 16 старонках. Атрымлівай газэту сваёй душы, газэту без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 1500 рублёў на шапікі «Белсаюздруку» ў Менску.

Р Э П А Р Т А Ж З К Р А Ю С Ь В Е Т У

## Чаму яны галасуюць за Лукашэнку.

**Старонкі 8—11.**



# Загнаныя ў кут знайшлі выйсьце

### У суботу дэмакратычныя кандыдаты могуць выйсьці з гонкі

12 кастрычніка ўвечары беларускія Інтэрнэт-старонкі замільгацелі паведамленьнямі, што дэмакратычныя кандыдаты могуць увадначас адмовіцца ад далейшага ўдзелу ў выбарах. Тлумачылася гэта жорсткімі паводзінамі ўладаў, якія скасоўвалі рэгістрацыю найбольш пэрспэктыўным, найбольш моцным кандыдатам. Лідэры кааліцыі «5+» абвясьцілі пра тэрміновую нараду 13-га з гэтай нагоды й прэсавую канфэрэнцыю пасьля яе.

Такая пэрспэктыва напалохала ўлады. Ужо 13 кастрычніка старшыня Цэнтравыбаркаму Лідзія Ярмошына абвясьціла, што ЦВК ня будзе перашкаджаць апытаньню выбарцаў на выхадзе з выбарчых участкаў (экзыт-пул) 17 кастрычніка. У 2001 г. пазыцыя Ярмошынай была больш жорсткай: нельга, і ўсё!

«Сэнсацыяў ня будзе», — гэтымі словамі пачаў 13 кастрычніка прэсавую канфэрэнцыю кааліцыі «5+» старшыня АГП Анатоль Лябедзька. Насуперак абвешчанаму напярэдадні, кіраўніцтва кааліцыі вырашыла не здымаць кандыдатаў-«дублёраў» зь перадвыбарчай гонкі. Больш за тое: тактыка здыманьня «дублёраў» у акругах на карысьць мацнейшага таксама будзе спыненая. Няма ніякае гарантыі, што пакінуты адзіны дэмкандыдат дойдзе да фінішу. «Самі мацнейшыя кандыдаты просяць нас пакінуць астатніх», — адзначыў старшыня ПБНФ Вінцук Вячорка.

Гаворачы пра выбарчую кампанію, лідэры «пяцёркі» адзначылі выкарыстаньне адміністрацыйнага рэсурсу дзеля арганізацыі датэрміновага галасаваньня.

**Працяг на старонцы 4.**

### Апошні рэфэрэндум

Нават на Захадзе быў толькі адзін выпадак, калі ўлада, што ініцыявала рэфэрэндум, засталася ў аўце: у красавіку 1969 г. дэ Голь прайграў плебісцыт і пайшоў у адстаўку. Левым вокам Лёліка Ушкіна — **на старонцы 16.**

## На што наракаюць людзі ў лістах, якія прыходзяць у «НН»?

— што амаральнасьць пранізала сыстэму ўлады;
— што гаворыцца пра барацьбу з карупцыяй, а карупцыя, выкарыстаньне службовага становішча ў прыватных мэтах дасягнулі нечуванага для Беларусі размаху;
— што элемэнты разлажэньня пранікі ў сілавыя структуры, што антызаконнае «крышаваньне» стала нармальнай зьявай. Замест таго, каб ахоўваць парадак, сілавікі ўсьцяж змагаюцца за левыя «прыбыткі» і кантроль над эканомікай;
— што законы падмененыя «мэтазгоднасьцю»; запалохваньне людзей — ці то работнікаў, ці то выбарцаў — стала звычайнай зьявай;
— што мараль перастала пашырацца на палітыку;
— што варта камусьці выказаць крытыку, як яго душаць і зьневажаюць, што Лукашэнка спарадзіў тысячы маленькіх банапартаў на месцах;
— што безгустоўнасьць і падхалімства пануюць у культуры; што калі і нарадзілася нешта вечнавартае ў культуры за 10 апошніх гадоў, дык толькі насуперак рэжыму, на прыватных кватэрах;
— пішуць з абурэньнем пра зачыненьне слаўнага Беларускага ліцэю і «Рэгіянальнай газеты»;
— нарэшце, пішуць пра незабытыя ганьбу 1995-га і кроў 1999-га.

**Рэдактар**

## Аргумэнты «за», якія вылучыў Урал Латыпаў

— Лукашэнка — прэзыдэнт простага народу, ён дбае аб простых людзях;
— Лукашэнка — абаронца незалежнасьці Беларусі ад Усходу і Захаду, ён не прасіў у Масквы дазволу на рэфэрэндум, прымае ўсе рашэньні ў Менску, а не ў Маскве і не паддаецца дыктату высакамерных ЗША;
— ад дабра дабра не шукаюць;
— эканоміка краіны расьце дзякуючы палітыцы Лукашэнкі;
— сацыяльная абарона высокая, а людзі з розных слаёў грамадзтва маюць роўныя шанцы дзякуючы палітыцы Лукашэнкі;
— беларускія вайскоўцы зарабляюць больш за расейскіх;
— Лукашэнка за 10 гадоў не дапусьціў адпраўкі беларускіх войскаў за мяжу, і беларускія хлопцы ня гінуць у войнах;
— галасаваць за зьмену Канстытуцыі трэба проста так, дзеля прынцыпу, аднак прэзыдэнт яшчэ ня вырашыў, ці будзе балятавацца нават у 2006 годзе.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Дзяды

2 лістапада а 17-й гадзіне на Ўсходніх могілках адбудзецца адкрыцьцё помніка Васілю Быкаву.

### 18 кастрычніка



Дэмакратычная апазыцыя заклікала выбарцаў сабрацца для падвядзеньня вынікаў рэфэрэндуму й выбараў у панядзелак 18 кастрычніка на Кастрычніцкай плошчы а 18-й. Дазволу на сход ніхто не прасіў, бо пасьля выбараў, у прысутнасьці міжнародных назіральнікаў і журналістаў улады традыцыйна не ўжывалі рэпрэсіўных захадаў супраць грамадзянаў.

ЦЫТАТА

### Самы спакойны кандыдат

Аграры заклікаюць галасаваць за людзей, адданых зямлі.

**БелТА, 12 кастрычніка, 15.09**

# На самацэнзуру ня маем права

На пытаньні «НН» адказвае кіраўніца Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**«НН»: Ідзе павальнае закрыцьцё недзяржаўных выданьняў праз найдрабнейшыя прычэпкі. Што рабіць у гэтай сытуацыі? Ці ня трэба рэдактарам газэтаў увесьці самацэнзуру, абы захаваць выданьні?**

**Ж.Л.:** У нас ужо ёсьць выданьні, дзе людзі кожны дзень апынаюцца перад выбарам — ставіць інфармацыю ў нумар цалкам, ці падцэнзураваць яе, ці не друкаваць зусім. Гэта найперш тычыцца рэгіянальных выданьняў, якія застаюцца закладнікамі мясцовай улады. Яшчэ тры гады таму, у прэзыдэнцкую кампанію 2001 г., самацэнзуры ў недзяржаўнай прэсе амаль не было. Была цэнзура ў друкарні «Мэджык», арышты накладаў газэтаў па друкарнях, крымінальныя справы… І ўсё адно друкаваліся матэрыялы, зьвязаныя з тэмай зьніклых палітыкаў, пра карупцыю ў атачэньні кіраўніка дзяржавы. Мы разумелі: ёсьць лічаныя дні, за якія нам варта зрабіць усё патрэбнае для нашых чытачоў. І сёньня на самацэнзуру мы ня маем права!

**«НН»: Якія могуць быць іншыя шляхі інфармаваньня ва ўмовах закрыцьця выданьняў? Сыходзіць у падпольле, ствараць радыёстанцыю, якая б вяшчала з-за мяжы?**

**Ж.Л.:** Можна зачыніць выданьне і звольніць людзей. Нельга пазбавіць прафэсіі. Журналістам закрытых і прыпыненых выданьняў варта любымі шляхамі працягваць сваю дзейнасьць. Яны могуць, напрыклад, працаваць над сайтамі сваіх выданьняў.

**«НН»: Каб застацца найперш журналістамі?**

**Ж.Л.:** Так! Пры цяперашнім росквіце прапагандысцкай машыны мы губляем стандарты журналісцкай дзейнасьці. Журналістаў дзяржаўных СМІ заганяюць у сфэру абслугі, яны становяцца ідэолягамі і трацяць прафэсійныя якасьці. Мае калегі зь недзяржаўных СМІ сёньня пачуваюць сябе палітолягамі. А адчуць розьніцу: дзе ты палітоляг, а дзе журналіст — страшэнна важна.

**Гутарыў Аркадзь Шанскі**

КУЛЬТУРА

## Новы пах Нобэлю



ІЛЬЛЯ ГЛЫБОЎСКІ

Сяргей Навумчык

«Брыгіта вылізвае задніцу ў Хайнцавай мамачкі. Там яна не знаходзіць нічога, акрамя такога ж гаўна, як ва ўнітазе, які яна якраз цяпер і вычышчае. Але рана ці позна гэта застанецца ў мяне ззаду, а наперадзе будзе будучыня, калі гаўно апынецца ззаду, я ўжо буду ў будучыні».

Гэта яшчэ ня самы эпатажны ўрывак з раману «Палюбоўніцы» Эльфрыды Елінэк, ушанаванай Нобэлеўскай прэміяй па літаратуры «за музычныя патокі галасоў і контрагаласоў у яе раманах і п’есах, якія з выключнай моўнай стараннасьцю дэманструюць абсурднасьць грамадзкіх клішэ і іх прыгнятальную сілу».

Вядома, прыгожае пісьменства не абавязкова павінна быць прыгожанькім (а нават і не павінна ім быць). Бясспрэчна, што праўда жыцьця каштоўная сама па сабе і ёсьць эстэтычнай катэгорыяй. Калі зьява існуе ў жыцьці, на яе адлюстраваньне ў мастацтве, літаратуры не павінна быць табу. Усё вырашае толькі талент. І ў гэтым сэнсе прыгоды якога-небудзь «чыкацілы» для сапраўднага мастака роўныя ўзьнёсламу першаму каханьню дзяўчыны-падлетка. Адсюль на апісаньні вылізваньня чыйсьці задніцы ці раструшчваньня палавых органаў як бы таксама не павінна існаваць табу — пэўна ж, такія рэчы ў жыцьці здараюцца, то чаму б і не?

Я нават ня буду ўжываць слова «вычварэньне» — выглядае, сэксапаталёгія як галіна мэдыцыны вычэрпвае сябе. Нішто не паталёгія, усё — норма. І нават паяданьне чалавечых экскрэмэнтаў мае свой навуковы назоў, ну а ў выпадку ўдалага адлюстраваньня ў літаратуры можа прынесьці прэстыжную прэмію. Літаратура ж пры гэтым, выглядае, хутка зробіцца прадметам вывучэньня нейкай новай навукі — на мяжы сутыкненьня філялёгіі, гінэкалёгіі і практалёгіі.

Уганараваньне Нобэлеўскай прэміяй — гэта сусьветнае прызнаньне ня толькі асобы, але і мастакоўскага мэтаду, стылю, узьвядзеньне яго, калі хочаце, у клясычны канон.

Працяг на старонцы 15.



За, супраць, чаму, калі і як Аляксандра Лукашэнкі

## Новы нумар «ARCHE»

### «J-Морс» і рэфэрэндум

Гурт «J-Морс» можа раскалоцца па палітычных перакананьнях. Прадусар і гітарыст групы Раман Арлоў адмовіўся браць удзел у музычна-палітычнай акцыі ў падтрымку рэфэрэндуму, што мае прайсьці 13 кастрычніка ў Палацы спорту. Лідэр гурту Ўладзімер Пугач, які даў папярэднюю згоду граць, ад камэнтароў адмаўляецца. Ці хопіць сумленьня ня выступіць — пабачым 13-га.

**СБ**

IN MEMORIAM

## Міхась Пацук



У выніку трагічнага зьбегу акалічнасьцяў ва ўзросьце 54 гадоў пайшоў з жыцьця Міхась Пацук…

Сьпявак нарадзіўся на Палесьсі ў вёсцы Пярэраўскі Млынок у шматдзетнай сям’і. Меў добрую і грунтоўную адукацыю ды прыгожы арыгінальны тэнар. Міхась Пацук стаяў ля вытокаў адраджэньня беларускай мовы і культуры канца 80-х — пачатку 90-х гадоў. Калі ў 1991 г. Вольга Іпатава заснавала новае беларускамоўнае выданьне — штотыднёвік «Культура» — менавіта Міхась Пацук быў сфатаграфаваны на вокладку першага нумару газэты. Ён шмат выступаў з канцэртамі ў нашай краіне і па-за яе межамі. Быў салістам ансамбляў «Вясельле» і «Сьвята». Пацук сябраваў з многімі дзеячамі культуры і быў шчырым беларусам.

**Аляксей Шалахоўскі**

СЬМЕХ



**Тата Карла: Здаецца, Джузэпэ, гэтым разам ён вырашыў абысьціся бяз нашай дапамогі.**

ТЭНДЭНЦЫІ

## Чырвона-зялёныя вобразы

Калі паглядзець на прапаганду сёлетняга рэфэрэндуму й аналягічнага мерапрыемства 1996 году, то кідаецца ў вочы адрозьненьне. У 1996 г. плякатны прэзыдэнт «прасіў паддзержкі» на тле ананімнага натоўпу зацятых выбарнікаў, якія «хорам» галасавалі й аддавалі свае паўнамоцтвы лагоднаму чалавеку ў чорным пінжаку.

Аднаасобныя й уладныя амбіцыі прэзыдэнта не хаваліся, фігура з прыціснутай да грудзей рукой была і цэнтрам, і апраўданьнем канстытуцыйнага перавароту.

Сёньня, калі пытаньне рэфэрэндуму гучыць надзвычай аголена, прапаганда хаваецца «за Беларусь». А пасьля таго, як Лукашэнка наведаў тэлевізію, зьніклі ролікі, дзе непрыхавана сьпяваліся дыфірамбы ў гонар кіраўніка.

Засталася «Беларусь». Беларусь гэтая пяцідзесяцігадовая, чырвона-зялёная — і хрустальная, яе трымае вядома чыя рука. Ёсьць радасныя вэтэраны, юнакі й дзяўчаты — і подпіс «за».

Подпіс гэты ўводзіць у зман, бо «ненавязьліва» падказвае, як галасаваць. Але паказальна, што падобнага кшталту вобразы не маглі зьявіцца ў 1996-м, калі шалела інтэграцыя з Расеяй.

Імпэт аголенага кумірніцтва ў грамадзтве пакрысе аслабляецца.

Каб выжыць, аўтарытарызм мусіць ужо паразытаваць на няхай абскубаных на свой лад, гвалтоўна зьзялененых вобразах незалежнасьці.

**Андрэй Расінскі**

# Браты Крэчаты: Жыцьцё ў канспірацыі

## Антырэфэрэндумная агітацыя «зрабіла» са Зьмітра Крэчата злачынцу

**Братоў Зьмітра й Дзяніса Крэчатаў вышуквае міліцыя. Фотаробаты маладых хлопцаў 21 і 26 гадоў разьвешаны па ўсіх аддзяленьнях міліцыі. «Злачынцамі» Зьміцер і Дзяніс сталіся пасьля таго, як пры канцы верасьня за ўласныя грошы надрукавалі тысячу асобнікаў антырэфэрэндумных плякатаў «Лукашэнка зажраўся. Мы павінны мець права на выбар. Галасуем «не» (на расейскай мове) і разьвесілі плякаты па Менску. Хто яны такія, Крэчаты?**

Крыху пра сябе хлопцы расказваюць на ўласным сайце www.golosuem.net. Зьмітру (на фота справа) — 26 гадоў, Дзянісу (зьлева) — 21 год. Родам хлопцы з Гарадзенскай вобласьці, некаторы час пражылі ў Менску. Крэчат-старэйшы скончыў Белдзяржунівэрсытэт, цяпер працуе на прыватным прадпрыемстве. Маладзейшы — сяржант запасу памежных войскаў, працуе ахоўнікам.

Маці хлопцаў да пачатку 90-х працавала інжынэрам-канструктарам. Аднак эканамічны крызыс выкінуў жанчыну, як і масу іншых адукаваных людзей, на рынак, дзе яна гандлюе драбязой і па сёньня. Маці — «адзіны чалавек, якому мы ўдзячныя і абавязаныя за тое нямногае, што ў нас ёсьць у жыцьці», — пішуць браты Крэчаты.

Зьвязацца са Зьмітром і Дзянісам Крэчатамі, якія захоўваюць партызанскую канспірацыю, цяжкавата. І ўсё ж «НН» удалося ўзяць у іх інтэрвію.

### Зьміцер: Хопіць абурацца на кухнях

— Мы вырашылі скарыстаць на плякатах больш экспрэсіўную фармулёўку — каб яна прыцягнула ўвагу, — кажа Зьміцер. — Мы як грамадзяне Беларусі маем права на такое ацэначнае меркаваньне. Гэтыя словы — пра тое, як паводзіць сябе Аляксандар Лукашэнка на пасадзе прэзыдэнта. Мы лічым, што ён выкарыстоўвае сваё цяперашняе службовае становішча не дзеля дабрабыту беларускага народу, а выключна дзеля задавальненьня сваіх уласных патрэбаў…

Апошняй кропляй, якая падштурхнула нас да змаганьня, сталася само аб'яўленьне рэфэрэндуму… Калі ён аб'явіў рэфэрэндум, я зразумеў — трэба дзейнічаць. Трэба было зрабіць нешта маленькае, але — канкрэтнае. Мой малодшы брат мяне падтрымаў.

**— На якія сродкі надрукаваныя плякаты?**

— Выключна на ўласныя грошы. Першапачаткова мы зь Дзянісам аплачвалі ўсё з уласнае кішэні. Усяго пайшло 600 даляраў на друкаваньне тысячы плякатаў фармату А2, каля 40 даляраў — на вэб-сайт www.golosuem.net, плюс іншыя незапланаваныя траты накшталт рэгулярных паездак у Маскву ды назад — мы прывозілі плякаты партыямі па 200—400 штук. Пасьля да фінансаваньня далучылася адна наша добрая сяброўка — яна прапанавала 150 даляраў. Былі й іншыя прапановы паўдзельнічаць у фінансаваньні, якія прыходзілі, сярод іншага, і па электроннай пошце. Людзі прапаноўвалі па 50—100 даляраў. Чалавек пяць. Але, шчыра кажучы, мы баяліся якой-небудзь правакацыі з боку органаў, і дапамогі ад незнаёмых людзей не прымалі.

**— Якіх вынікаў ад акцыі чакаеце?**

— У маленькай акцыі — маленькія вынікі. Мы спадзяёмся, што нашы дзеяньні падштурхнуць яшчэ некага да канкрэтных крокаў. Асноўны заклік: хопіць абурацца на кухнях — давайце штосьці рабіць, хай невялікае, але канкрэтнае.

Мы зьбіраемся выкарыстаць нашу акцыю як першы крок для стварэньня нефармальнай сеткі нашых аднадумцаў, якія, дзейнічаючы самастойна, па заклiку сэрца, робяць штосьці разам. Чым шырэйшая сетка — тым большыя ў яе магчымасьці.

Наша канчатковая мэта — каб людзі, не баючыся быць пакаранымі, пачалі адкрыта казаць, што яны сапраўды думаюць, пачалі рабіць актыўныя захады…

Ведаеце, у першых чыслах кастрычніка мяне затрымалі, калі мы зь Дзянісам расклейвалі плякаты ў мэтро. За час, праведзены ў міліцыі, я заставаўся сам-насам з двума-трыма міліцыянтамі — ад сяржанта да маёра. Усім тром я задаваў два пытаньні: ці зьбіраюцца яны прымаць удзел у рэфэрэндуме і як будуць галасаваць? Ведаеце, ніводзін — я падкрэсліваю, ніводзін — не сказаў, што на рэфэрэндуме будзе галасаваць «за». Нехта сказаў: «Я лічу, што тры тэрміны — гэта многа». А адзін нават заявіў: «Я ня толькі супраць трэцяга тэрміну — я лічу, што й пяць гадоў (для аднаго тэрміну) — гэта зашмат».

А ў мэтро, калі мы вешалі плякаты, толькі двойчы мы сутыкнуліся з нэгатыўнай рэакцыяй пасажыраў. І калі гэта адбылося, тут жа знайшліся тыя, хто гатоў быў уступіцца у палеміку і падтрымаць нас. Многія казалі: «Малайцы!»

Я думаю, многія, нават тыя, хто зь нейкіх прычынаў усё яшчэ падтрымлівае Лукашэнку, выступаюць супраць зьняцьця канстытуцыйнага абмежаваньня на колькасьць прэзыдэнцкіх тэрмінаў.

**— Ці зьмяніла нешта ваша палітыка ва ўласным жыцьці?**

— Перасьледу пакуль што мы не заўважылі. Але зьмены ў жыцьці адбыліся важныя: увесь вольны час толькі гэтай акцыі і аддаём.

Пасьля затрыманьня ў мяне не было магчымасьці наступным днём зьвяціца для разьбіральніцтва: трэ было ехаць у Маскву па плякаты. Цяпер мой фатаробат вісіць ва ўсіх аддзяленьнях міліцыі. І калі затрымаюць (агітацыя дазволена і за, і супраць, але каму гэта дакажаш?), то простым штрафам ужо не абыдуся. Даводзіцца дзейнічаць асьцярожней.

Часамі здавалася, што за намі сочаць… Толькі нашы дзеяньні — кропля ў моры. І мы, бадай, самая дробная рыба сярод тых, хто выказвае сваё нездавальненьне. Таму можна дапусьціць: а каму мы трэба?..




**Браты Крэчаты з надрукаванымі на ўласныя грошы ўлёткамі.**

### Дзяніс: Калі ў нешта веру — я іду да канца

Дзяніс Крэчат — малодшы з братоў Крэчатаў, зьбіраецца паступаць у БДУ. Ён з «ідэйных», паводле ягонага ж выразу. Знаёмства зь Дзянісам адбывалася пры захаваньні найстрожэйшых канспірацыйных умоў: ніякіх тэлефонаў для кантактаў, усе стасункі — з дапамогай электроннай пошты. Гэта й зразумела: хлопцу — 21 год, па шчасьлівай выпадковасьці супрацоўнікі КДБ два тыдні таму пры затрыманьні нічога ў яго не знайшлі. «Пашанцавала», — гаворыць сам Дзяніс.

Карэспандэнт «НН» сустрэўся зь Дзянісам Крэчатам на плятформе станцыі мэтро «Інстытут культуры».

**— Пасьля абвяшчэньня рэфэрэндумных плянаў уся Беларусь пагрузілася ў пэсымізм. Вашы акцыі супраць рэфэрэндуму, дакладней, супраць падаўжэньня прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў на трэці тэрмін, нагадваюць астравок аптымізму ў безнадзейным моры песымізму.**

— Гэта проста грамадзянская пазыцыя. Мы заклікаем не маўчаць, не на кухнях выказваць незадаволенасьць, ня дома, ня ў коле сяброў — якія маленькія заробкі і гэтак далей, а невялікімі крокамі, хто што можа, дабіваць нечага канкрэтнага. Некаторыя студэнты дапамагалі нам расклейваць улёткі, некаторыя шукалі месцы пад захоўваньне плякатаў.

**— Апазыцыя, якая чакала рэфэрэндуму не адзін год, перад самім галасаваньнем аказалася загнаная ў кут і пазбаўленая магчымасьці дзейнічаць. Застаецца толькі разводзіць рукамі…**

— Наша акцыя — невялікая, аднак магчыма, некага і падштурхне да больш актыўных дзеяньняў. Наша акцыя цягнецца ўжо тры тыдні.

**— І многа актыўных прыхільнікаў знайшлі?**

— Вельмі і вельмі мала. Я зьвяртаўся па дапамогу больш чым да сотні чалавек, але нас па ўсёй Беларусі падтрымалі чалавек 30. Некаторыя працуюць у дзяржаўных структурах — непажадана сьвяціцца, нехта баіцца выключэньня з ВНУ…

**— Маючы на ўвазе вашы ўласныя пляны паступаць у Белдзяржунівэрсытэт, вы не баіцеся за сваю будучыню?**

— Я — за ідэю: калі ў нешта паверу — я іду да канца. Я веру, што я дзейнічаю слушна, — і гатовы пацярпець за тое. Я ня думаю пра тое, што мне нешта будзе. Нават калі мяне арыштуюць, я буду ведаць, што я — ня злодзей, не забойца, не рэцыдывіст, а пацярпеў за палітычныя перакананьні.

**— Канспірацыя — відавочны вынік вашай палітычнай дзейнасьці…**

— Дасюль я вылучаўся зьнешнім выглядам: была іншая прычоска, насіў бараду, па-іншаму апранаўся. Тыдні са тры таму мяне затрымалі супрацоўнікі КДБ — і толькі па шчасьлівай выпадковасьці ўсё закончылася для мяне без наступстваў: пры мне нічога не знайшлі.

**— Дзейнасьць пад сапраўдным прозьвішчам — таксама ваш прынцып?**

— А калі б я называўся Івановым — перасадзілі б усіх Івановых? Гэта сьмешна. Крэчат Дзяніс — такіх многа на Беларусі, дастаткова паглядзець у кампутары тэлефонную базу.

*Глеб Хмяльніцкі*

### Справу БХК замялі

Беларускаму Хельсынскаму камітэту не пагражае суд за заклікі супраць рэфэрэндуму. Раней Мінюст накіроўваў пазоў аб ліквідацыі праваабарончай арганізацыі ў Вярхоўны суд, але адтуль дакумэнт вярнулі на дапрацоўку. Паўторна пазоў чыноўнікі Мінюсту вырашылі не дасылаць.

### Зімовыя жыроўкі

З пачаткам ацяпляльнага сэзону ўзрастуць сумы аплаты за кватэры. Зь лістапада, паводле словаў намесьніка міністра ЖКГ Мікалая Ліпеня, за аднапакаёўку ў сярэднім трэба будзе плаціць 60 тыс. руб., за двухпакаёўку — 90 тыс., за трохпакаёўку — 124 тыс.

### Каваленя — дырэктар гісторыкаў

12 кастрычніка супрацоўнікам акадэмічнага Інстытуту гісторыі быў прадстаўлены новы дырэктар — Аляксандар Каваленя. Некалькі апошніх гадоў інстытутам кіраваў выканаўца абавязкаў Мікалай Сташкевіч. Сярод магчымых кандыдатаў называлі экс-міністра адукацыі Пятра Брыгадзіна, магілёўца Якава Трашчанка. Каваленя як гісторык спэцыялізуецца на другой сусьветнай вайне. Найбольш вядомая ягоная праца прысьвячаецца моладзевым нацыянальным арганізацыям у Беларусі — Саюзу беларускай моладзі, расейскім, украінскім ды татарскім арганізацыям.

### Пасольства Арафата

Падчас прыезду міністра замежных справаў Палестыны Набіля Шааса ў Менску мае адбыцца адкрыцьцё пасольства. Хаця пасольства фактычна дзейнічае з 5 лютага 2003 г., афіцыйнага адкрыцьця дагэтуль не было.

### БГ заступаецца за Леванеўскага і Васільева

Культавы расейскі рок-музыка Барыс Грабеншчыкоў звярнуўся да Аляксандра Лукашэнкі зь лістом у абарону Валер'я Леванеўскага і Аляксандра Васільева. БГ сьледам за «Міжнароднай амністыяй» лічыць іх вязьнямі сумленьня й патрабуе вызваліць гарадзенскіх прадпрымальнікаў з турмы.

### Абхазія аддаляецца ад Масквы

На прэзыдэнцкіх выбарах у Абхазіі выйграў кандыдат Сяргей Багапш, якому сымпатызуюць Тбілісі і Вашынгтон: ён набраў 50,08% галасоў. Фаварыт Масквы, былы афіцэр КДБ Рауль Хаджымба, прэм'ер сёньняшні, прайграў. Хаджымба заяўляе пра фальсыфікацыі на выбарах, абхаская генпракуратура нават распачала сьледства ў гэтай справе. Грузія ўсё адно не прызнала законнасьці выбараў.

### Ахвяры Садама

Масавыя захаваньні курдаў, забітых у 1987—1988 г. рэжымам Садама Хусэйна, знойдзеныя каля вёскі Гатра недалёка ад Масулу ў паўночным Іраку. Колькасьць ахвяраў ацэньваецца ў некалькі тысяч, сярод іх — жанчыны й дзеці. Паводле міжнародных ацэнак, за 24 гады Хусэйнавага кіраваньня ў Іраку забіта больш за 300 тыс. чалавек.

### СПС супраць рэфэрэндуму

Каля 50 актывістаў маладзёвага крыла расейскага Саюзу правых сілаў правялі 13 кастрычніка несанкцыяваны мітынг каля пасольства Беларусі ў Маскве. Мітынг супраць рэфэрэндуму скончыўся перадачай міліцыянтам лялькі, якая нагадвала беларускага прэзыдэнта.

**АШ, БелаПАН, Gazeta.pl**

# Загнаныя ў кут знайшлі выйсьце

Працяг са старонкі 1.

На выбарчым участку №480 Коласаўскай 106-й акругі за першы дзень, 12 кастрычніка, як сказаў лідэр ПКБ Сяргей Калякін, прагаласавала 42% усіх выбарцаў. Ён мяркуе, што датэрмінова на выбарчых участках прагаласуе каля 30% выбарцаў. «Лічыць гэтыя галасы волевыяўленьнем нашых выбарцаў я б ня стаў».

У акругах, дзе не засталося дэмакратычных кандыдатаў, «пяцёрка» заклікала галасаваць за кандыдата «супраць усіх». Па выніках выбарчай кампаніі кааліцыя мае выпусьціць «чорную кнігу» парушэньняў, зробленых уладнымі структурамі падчас выбарчай кампаніі й рэфэрэндуму. Сярод мераў, якія прыме «5+» пасьля кампаніі, Лябедзька назваў і такую: дэмпартыі будуць дамагацца ўнясеньня ў сьпіс беларускіх чыноўнікаў, якім забаронены ўезд у іншыя краіны, тых, хто будзе займацца фальсыфікацыямі.

Сяргей Калякін (**на фота**) паказаў нумар «СБ — Беларуси сегодня» за 14 кастрычніка (наступны дзень ад прэс-канфэрэнцыі) з агітацыяй за рэфэрэндум: «Сам нумар надрукаваны яшчэ ў выхадныя дні. Выходныя зьвесткі тут пазначаныя ў 800 тыс. асобнікаў, а насамрэч аддрукавана 3 млн 200 тыс. асобнікаў, якія далі арганізацыям сувязі для распаўсюду. Гэта фактычны крадзеж бюджэтных сродкаў, бо грошай у бюджэце на гэта няма».

Лідэры кааліцыі падтрымалі тактыку, агучаную праваабаронцам Гары Пагаяйлам у «Народнай Волі»: у кабінцы для галасаваньня адарваць палову рэфэрэндумнага бюлетэню з подпісамі сяброў выбарчай камісіі й забраць з сабой. Адарваную частку можна перадаць альбо дэмакратычнаму назіральніку на самім участку, альбо ў месца, агучанае дэмкандыдатамі праз незалежную прэсу. «Многія сябры камісіяў задумаліся пасьля абвяшчэньня гэтай тактыкі: куды пойдуць іхныя подпісы? Яны ж праз нейкі час могуць быць далучаныя да крымінальнай справы, бо гаворка ідзе пра фальсыфікацыі», — адзначыў Лябедзька. Кааліцыя спадзяецца, што гэтую тактыку ёй удасца рэалізаваць прынамсі ў Менску і буйных гарадах. «Мы маем шмат зьвестак, што сябры выбарчых камісіяў адмаўляюцца ад фальсыфікацыяў», — адзначыў Калякін.

«18-га не заканчваецца гісторыя Беларусі, 17-га не заканчваецца нашая барацьба з гэтым рэжымам. Нашая асноўная задача — зрабіць так, каб падтрымка грамадзянамі дэмакратычнай апазыцыі складала не 25%, як летам бягучага году, а 50%», — вызначыў кірунак дзейнасьці «пяцёркі» Лябедзька.

Апазыцыя нечакана перахапіла ініцыятыву ў выбарчай гонцы. Улада баіцца байкоту. Шок выбарцаў, якія 17 кастрычніка пабачаць, што зь бюлетэняў выкрасьленыя дэмакратычныя кандыдаты, перадвызначыць лёс рэфэрэндуму. Адкладаючы канчаткова вырашэньне лёсу выбараў на суботу 16-га, дэмакраты маюць усе выгоды: напоўніцу выкарыстоўваюць магчымасьць агітаваць супраць рэфэрэндуму ды прапагандаваць свае ідэі. Апроч таго, пагрозаю байкоту «Пяцёрка» змушае лукашэнкаўцаў да суботы ўстрымацца ад масавых карных захадаў супраць дэмакратычных кандыдатаў. Пытаньне толькі ў тым, ці хопіць апазыцыі рашучасьці й адзінства для ажыцьцяўленьня супольнага пляну.

**Аркадзь Шанскі**




PHOTO.BYMEDIA.NET

## Артыст!

Па Купалаўскай акрузе быў зарэгістраваны цэлы спэктар кандыдатаў, сярод якіх прадстаўніца АГП **Валянціна Палевікова** (на прэзыдэнцкіх выбарах зьяўлялася кіраўніком штабу Ўладзімера Ганчарыка), актывіст Партыі БНФ **Сяргей Мудрачэнка** і дырэктар Купалаўскага тэатру **Генадзь Давыдзька**. За тыдзень да галасаваньня акруговая камісія зьняла з рэгістрацыі В.Палевікову, каб расчысьціць дарогу артысту, на якога робіць стаўку партыя ўлады.

Артыст ведае, куды ідзе. Паводле некаторых зьвестак, Г.Давыдзька, акрамя дырэктарскіх абавязкаў, мае яшчэ й бізнэс, а яго сукупны даход за 2003 г. сягнуў 17 тысяч даляраў ЗША. Стаўшы дэпутатам ПП, дырэктар Купалаўскага тэатру павінен будзе перадаць, паводле прэзыдэнцкага ўказу, даходы ад бізнэсу ў даверчае кіраваньне «Беларусбанку» і жыць на стандартны дэпутацкі заробак — каля 420 даляраў. Дэпутацкі мандат дае парлямэнтару права атрымоўваць толькі ганарары ад артыкулаў ды выступаў — астатнія крыніцы даходаў выключаюцца.

Мяркуючы па ўсім, Г.Давыдзька не адчувае патрэбы ў агітацыі за сваю кандыдатуру. Ва ўсякім разе, спробы знайсьці хоць бы адну ўлётку кандыдата посьпеху не прынесьлі.

**ГХ**

## Шырын Эбадзі: «Байкот спрацоўвае, толькі калі гэта ўзгоднена робяць усе»

**На пытаньне карэспандэнта «НН» адказвае Шырын Эбадзі, іранская адвакатка, ляўрэатка Нобэлеўскай прэміі міру за 2003 г.**



TSF-SAPO.PT

**«НН»: У Беларусі разышліся думкі, ці мусяць дэмакратычныя сілы байкатаваць выбары і рэфэрэндум цяпер, калі стала яснай ступень іх справядлівасьці. Што падказвае іранскі досьвед?**

**Шырын Эбадзі:** Са свайго іранскага досьведу я ведаю, што байкот — гэта апошняе выйсьце, бо заўжды знаходзяцца тыя, хто прыходзяць і галасуюць «за», або тыя, каго заганяюць гэта рабіць. Але калі робіцца відавочна, што вынікі галасаваньня абавязкова будуць сфальшаваныя, тады дэмакратычным кандыдатам няма сэнсу заставацца ў выбарчых бюлетэнях. Хачу падкрэсьліць: гэта спрацоўвае толькі тады, калі гэта ўзгоднена робяць усе кандыдаты адначасова і калі сапраўды ніякіх шанцаў на справядлівыя выбары няма. Тады застаецца толькі галасаваць «супраць» і байкот.

Зычу цярпеньня тым у Беларусі, хто змагаецца за свабоду і дэмакратыю.

**Барыс Тумар, Осла**

# У «нажніцы» зь першага дня

**Незалежныя назіральнікі разышліся з Цэнтравыбаркамам у падліках колькасьці галасоў.**

Паводле статыстыкі незарэгістраванай грамадзянскай ініцыятывы «Партнэрства», 12 кастрычніка датэрмінова прагаласавалі 1,66% беларусаў. Гэтыя зьвесткі «Партнэрства» вывела з інфармацыі, атрыманай па 1420 выбарчых участках з 6629.

Паводле Цэнтравыбаркаму, 12 кастрычніка прагаласавала 2,68% выбарцаў. «Яўка выбаршчыкаў штучна завышаецца, прычым за кошт ненатуральных прыёмаў», — пракамэнтаваў «нажніцы» ў лічбах каардынатар «Партнэрства» Мікалай Астрэйка. Улада можа паўтарыць маніпуляцыі з падлікам галасоў на прэзыдэнцкіх выбарах-2001, калі 6 верасьня 2001 г., за тры дні да выбараў, датэрміновае галасаваньне складала 5,4% ад усіх выбарцаў, а ўжо наступным днём ЦВК аб'явіў, што датэрмінова прагаласавалі 10,21%. Грамадзянская ініцыятыва «Незалежнае назіраньне» сьцьвярджала, што ЦВК, каб не быдаражыць міжнародную грамадзкасьць сьведчаньнямі масавага загону на датэрміновае галасаваньне, заніжаў лічбы. А перад днём выбараў аб'явіў сапраўдныя.

І сёлета назіральнікі «Партнэрства» канстатавалі шматлікія парушэньні заканадаўства ў першы ж дзень датэрміновага галасаваньня. Так, паводле М.Астрэйкі, па Каліноўскай акрузе №108 12 кастрычніка сябры камісіі ўчастку №557 пайшлі са скрыняй па дамах і 16 чалавек прагаласавалі, хаця галасаваньне дома законам прадугледжанае толькі ў дзень выбараў — 17 кастрычніка. У той самы дзень студэнтаў БДЭЎ сабралі на Сьвярдлова, 7 у кабінэце №419 і выдавалі на рукі бюлетэні для галасаваньня.

Паводле інфармацыі прэс-сакратаркі ліквідаванага праваабарончага цэнтру «Вясна» Тацяны Равякі, на ўчастку №560 Каліноўскай выбарчай акругі №108 сакратарка камісіі прапанавала ёй паставіць адзін подпіс за два бюлетэні: «выбарчы» і «рэфэрэндумны». На пытаньне, якім чынам будзе адлюстраваны ў сьпісе выбарцаў няўдзел у рэфэрэндуме, сакратарка адказала: «Ніякім».

За тры месяцы назіраньня за падрыхтоўкай да выбараў і рэфэрэндуму 3600 назіральнікаў «Партнэрства» зарэгістравалі каля 600 парушэньняў заканадаўства.

Выбарца ў такой сытуацыі мае толькі адзін варыянт дзеяньняў — прыйсьці й прагаласаваць у выхадны дзень, 17 кастрычніка. «У адваротным выпадку існуе высокая імавернасьць, што ваш голас будзе сфальсыфікаваны», — заключыў М.Астрэйка.

Старшынька ЦВК Лідзія Ярмошына нэрвова адрэагавала на заявы «Партнэрства»: «Заканадаўства не прадугледжвае дзейнасьці ніякіх грамадзянскіх ініцыятыў. Таму ўсе заявы гэтае ініцыятывы мусяць разглядацца, разглядаюцца і будуць разглядацца як заявы прыватнай асобы. Такое ж стаўленьне ў мяне да нейкага камітэту, які ўзначаліў спадар Вайтовіч; гэта асабістая думка спадара Вайтовіча, а не арганізацыі. Мы будзем мець справу толькі з юрыдычна зарэгістраванымі органамі». Камэнтаваць заключэньне Вэнэцыянскай камісіі Рады Эўропы пра тое, што А.Лукашэнка «ўнёс незаконны асабісты элемэнт у пытаньне рэфэрэндуму», яна адмовілася, спаслаўшыся на тое, што «ня бачыла заключэньня».

**Глеб Хмяльніцкі**

# Усё як заўсёды

Усялякія размовы пра аб'яднаную апазыцыю ў Баранавічах пайшлі дымам. На карысьць іншых кандыдатаў ад удзелу ў выбарах адмовіліся толькі прадстаўнікі ўлады. Іх засталося па адным на акругу — цяперашні дэпутат Мікола Сергіенка (Усходняя выбарчая акруга №5) і начальнік галоўнага штабу, першы намесьнік камандуючага ВПС і войскаў ППА Анатоль Ваньковіч (Заходняя выбарчая акруга №4).

Апазыцыя ж пачала замінаць сама сабе. Акругу №4 будуць дзяліць між сабою сацыял-дэмакраты — сябар БСДГ Карней Пятровіч і чалец БСДП (НГ) Натальля Стахно. Па акрузе №5 ідуць ажно чатыры кандыдаты ад апазыцыі, зь іх прынамсі трое — ад «Пяцёркі-плюс»: Сяргей Андрушчанка ад АГП, Аркадзь Блінкоўскі ад БСДГ, Аляксей Галькевіч ад ПКБ. І яшчэ Аляксандар Долмат ад БСДП (НГ). Ля фінішу ніводны зь іх здымаць сваю кандыдатуру на карысьць іншага сябра кааліцыі не зьбіраецца. Марнымі былі падпісаньня раней дамовы і пагадненьні.

Сярэдні выбаршчык разгубіцца ад аднолькавых праграмаў, што прапануюць ім трое «пяцёрачнікаў». Галасы расьцярушацца сярод мноства кандыдатаў.

Адзінае, што пакуль здолелі зрабіць прадстаўнікі «Пяцёркі» й іншых партый разам, — гэта разасланы больш за дзьвесьце лістоў дырэктарату гораду і сябрам выбарчых камісій. Іх папярэдзілі, што парушэньне выбарчага заканадаўства ня мае тэрміну даўнасьці, і заклікалі не прымушаць сваіх падначаленых галасаваць датэрмінова.

Між тым людзей пагналі ўжо на датэрміновае галасаваньне. Выкладчыкаў Баранавіцкага ўнівэрсытэту папярэдзілі: хто не прагаласуе да пятніцы, працаваць у БарДУ ня будзе. Студэнтам, кажуць, выдадуць адмысловыя паперкі, а ні якія яны мусяць засьведчыць на ўчастках нейкай пячаткаю датэрміновы «візыт» да скрыні. Студэнты млява абмяркоўваюць сытуацыю: што здарыцца, калі галасаваць ня пойдзе ўся група…

На прадпрыемствах маюць адпускаць людзей з працы, развозіць па ўчастках на адмысловa нанятых аўтобусах, выдаваць паперкі з прозьвішчамі, якія трэба будзе пакідаць на выбарчых участках. Датэрмінова павінны прагаласаваць сама меней 53%. Усё як заўсёды. Нічога новага.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

### Прэзыдэнцкі інспэктар за ўшчамленьне правоў

Прэзыдэнцкаму інспэктару, былому кіраўніку Шчучыншчыны Вінцэнтаму Казяку заманулася зноў патрапіць у парлямэнт. У праграме запісаў шчыра: «Выступаю за… ушчамленьне правоў і годнасьці грамадзян у любых формах і праяўленьнях» (апублікавана ў райгазэце «Дзянніца»). Тое самае — на каляровых улётках, якімі аблеены ледзь ня ўсе шчучынскія крамы. Такая вось красамоўная абдрукоўка. Супернік Казяка, Аляксандар Мілінкевіч, актыўнай агітацыі ў горадзе не вядзе.

**Максім Доўгі, Шчучын**

### Кішэньнікі ў гардэробе

Пакуль ішоў урок, у аднаго са школьнікаў баранавіцкай СШ №7 скралі мабільны тэлефон «Эрыксан» коштам ня мала 250 даляраў. Хлопец забыў яго ў кішэні курткі, якую павесіў у гардэробе. Навошта бацькі куплялі такі дарагі тэлефон падлетку, невядома.

### Спынілі «Крыніцу»

Мінулі тыя часы, калі супрацоўнікі «органаў» лавілі кантрабанднае расейскае піва. На мінулым тыдні было затрымана сем з паловай тысяч літраў піва «Крыніца». Яго па несапраўднай накладной везлі зь Менску баранавіцкаму прадпрымальніку. Бурштынавага напою канфіскавалі на 11 млн. рублёў.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

### Помнік сталінскім ахвярам

Да 50 самых заможных людзей Беларусі зьвярнуўся жыхар Асіповіч, старшыня дабрачыннага Фонду «Памяць ахвяр сталінізму Беларусі» Валянцін Пабарцаў з просьбай аб дапамозе ва ўсталяваньні помніка беларускім ахвярам сталінскага генацыду. Помнік мяркуецца ўсталявіць у Менску недалёка ад будынку КДБ, на скрыжаваньні вуліц Камсамольскай і Маркса побач з помнікам Дзяржынскаму.

**Рыгор Латышэвіч, Асіповічы**

### Прыгоды аршанцаў у Смаленску

Сёлетні ўдзел майстроў Аршанскага дому рамёстваў ды музыкаў фальклёрнага гурту «Сакавінка» ў днях гораду Смаленску запомніцца ім надоўга. Перад пачаткам сьвяткаваньня нехта пусьціў чутку пра тэракты, якія быццам бы адбудуцца ў горадзе. Праз гэта месьцічаў сабралася на вуліцах і плошчах гораду як ніколі мала. Да таго ж міліцыянты правяралі ўдзельнікаў ды гасьцей з дапамогай розных дэтэктараў, абшуквалі торбы — карацей, атмасфэра была зусім не сьвяточная. Дзіўна, але непаразуменьне выклікала ў смаленскіх чыноўнікаў вялізная харугва з выявай гістарычнага аршанскага гербу (ён жа з 2002 г. і афіцыйны). Нагадаю, што на ім зьмешчаны крыж ды паўмесяц. Страх перад апошнім яшчэ можна растлумачыць, хоць у дадзеным выпадку ён ня мае аніякага дачыненьня да ісламу. А вось крыж здаўся ім вельмі падобным на нямецкі. Распарадчыкі нават запатрабавалі згарнуць харугву. І толькі калі кіраўнік аршанскай дэлегацыі паказаў ім афіцыйныя паперы ды буклеты з гербам Воршы, тыя супакоіліся.

### Утрох на аднаго

У Воршы пра выбары нічога не нагадвае, акрамя некалькіх расьцяжак над вуліцамі ды чырвона-зялёных цэнтравыбаркамаўскіх плякатаў. Нідзе няма ніводнай агітацыйнай улёткі, незаўважнымі прайшлі два выступленьні кандыдатаў па мясцовым радыё. Амаль ня згадвае пра ход выбарчай кампаніі вэртыкальная «Аршанская газета». Відаць, улада ўжо канчаткова зрабіла свае стаўкі і ў асаблівай публічнасьці ды масавай агітацыі «за» ці «супраць» не зацікаўленая. Пра гэта сьведчыць арганізаваная ідэалягічным аддзелам гарвыканкаму сустрэча выбарцаў з кандыдатамі ў дэпутаты па 26-й акрузе. Яна адбылася 28 верасьня ў гарадзкой бібліятэцы імя Пушкіна. Пра гэтую сустрэчу не паведамлялі СМІ, і толькі некалькі невыразных афіш былі расклеены на рэклямных тумбах. Зь пяцёх зарэгістраваных кандыдатаў на яе прыйшлі трое са сваімі даверанымі асобамі. Прысутнічалі таксама дырэктарка бібліятэкі, гарвыканкамаўскі чыноўнік ды адзін журналіст. Дарэчы, мясцовая тэлекампанія «Скіф», якая здымае для сваіх навін нават ранішнікі ў дзіцячых садках, гэтае важнае гарадзкое мерапрыемства праігнаравала. Таму на сустрэчу прыйшоў усяго адзін выбаршчык. Яму і расказвалі кандыдаты пра свае праграмы. Ён уважліва ўсё выслухаў ды мовіў, што ў Воршы шмат хворых ды вялікая сьмяротнасьць, таму будучаму дэпутату трэба дабівацца пабудовы новай бальніцы. Праўда, ніхто з прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат яму гэтага не паабяцаў. На гэтым і разышліся.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Будаўніцтва паперні ў Шклове

Канцэрн «Беллеспаперапрам» абвяціў адкрыты тэндэр на вызначэньне генэральнага падрадчыка па будаўніцтве заводу газэтнай паперы ў Шклове. Паводле інфармацыі прадстаўнікоў «Беллеспаперапраму», фінская кампанія «Яка Пёрэ» ўжо распрацавала бізнэс-плян будаўніцтва. Дакумэнт знаходзіцца на ўзгадненьні ў зацікаўленых у рэалізацыі праекту міністэрствах і ведамствах. Пошук замежных партнэраў, гатовых уклясьці сродкі ў будаўніцтва заплянаванага аб'екту, працягваецца і вядзецца на ўрадавым узроўні. Схема фінансаваньня новага заводу пакуль не адпрацавана. Раней меркавалася, што фінансаваньне зь беларускага боку ў памеры 50% кошту будзе забясьпечваецца за кошт крэдытных сродкаў, якія беларускія банкі плянавалі ўзяць пад гарантыю ураду ў эўрапейскіх банках. Калі будзе вырашана гэтае пытаньне, канцэрн аб'явіць тэндэр на пастаўку поўнага камплекту абсталяваньня для заводу, гавораць у канцэрне. Паводле папярэдніх падлікаў, на рэалізацыю праекту па будаўніцтве заводу газэтнай паперы, уключанага ў пералік найважнейшых інвэстыцыйных праектаў Беларусі, спатрэбіцца прыблізна каля 395 млн даляраў.

**Region.mogilev.by**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Цэмэнт або сьвечка

**Рэканструкцыя менскіх Вайсковых могілак нагадвае руйнаваньне. Між магілаў капаюць траншэі, карчуюць дрэвы, раўняюць тэрыторыю бульдозэрам, абэліскі ссунулі ў кучу — хай паляжаць. Хоць нядаўна ў дырэкцыі могілак не было грошай на паўбутэлькі кіслаты, каб сьцерці сатанісцкі надпіс на помніку Якубу Коласу. Афіцыйныя мэмарыялы і рэальная памяць пра тых, што сышлі, — зусім розныя рэчы ў сьвядомасьці грамадзтва. Тоны цэмэнту значаць меней, чым запаленая сьвечка. Таму няхай лепей ня будзе «афіцыйнага» мэмарыялу ў Курапатах, пакуль могілкі й каналізацыю рамантуюць у адзін спосаб.**

### Зьнялі Леру Сом

6 кастрычніка стала вядома, што выбарчая камісія Полацкай акругі №28 зьняла кандыдатку ў дэпутаты, сябра ПБНФ Леру Сом. Прычынаю пакараньня сталіся некалькі заяў жыхароў Полацку, нібыта давераная асоба кандыдаткі Ўладзімер Савіцкі разам зь перадвыбарнымі ўлёткамі Сом раскідваў па паштовых скрынях антырэфэрэндумныя лістоўкі кааліцыі «5+». Савіцкі пісьмова засьведчыў, што лістовак кааліцыі ён не раскідваў — маўляў, гэта нахабная хлусьня. Каманда Л.Сом у той самы дзень падала заяву ў гарадзкую пракуратуру, каб яна ўзбудзіла крымінальную справу за паклёп, і ў міліцыю, каб тая высьветліла, ці распаўсюджвалі насамрэч у горадзе антырэфэрэндумныя ўлёткі кааліцыі і калі распаўсюджваліся, дык хто гэта рабіў. Перадвыбарная кампанія кандыдаткі-пісьменьніцы была пабудавана выключна на легальных мэтадах агітацыі. Посьпех гэтай кампаніі, мусіць, і напужаў мясцовыя ўлады.

**ВК**

# «Пагоню» знайшлі дзякуючы «Воршагазу»

Сёлетні археалягічны сэзон у Воршы быў своеасаблівым. Плянамерных раскопак праз адсутнасьць фінансаваньня не было. Вялося толькі археалягічнае назіраньне за пракладаньнем траншэяў у гістарычным цэнтры гораду. Траса ад адной з падстанцый Аршанскай ЦЭЦ (ейныя магутнасьці выкарыстоўваюць пакуль усяго на 40%) прайшла па правым беразе рэчкі Аршыцы ля яе вусьця. Менавіта гэтая тэрыторыя засялялася першапачаткова. Больш чым 200-мэтровая траншэя пракладзена непадалёк ад касьцёлу Сьвятога Язэпа. Коўш экскаватара натрапіў тут на магутныя падмуркі з арачнымі скляпеньнямі. Некаторыя мясцовыя краязнаўцы спадзяваліся, што гэта рэшткі ад падземных хадоў, паданьні пра якія даўно ходзяць у Воршы. Але гэта тое, што засталося ад жылых будынкаў былога дамініканскага кляштару, заснаванага ў сярэдзіне XVII ст. Яны яшчэ пазначаныя на мапе гораду ў 1813 г.



Побач з царквою Раства Багародзіцы, якая будуецца якраз на месцы царквы 1661 г., разбуранай напрыканцы 1950-х г., натрапілі на могілкі, датаваныя XV—XVII ст. Некалькі мяхоў чалавечых костак пахаваны ў новай царкве. Сярод найбольш цікавых знаходак — шыфэрная прасьліца XII ст., фрагмэнт тэракотавай кафлі з кірылічным надпісам (пачатак XVII ст). Паводле слоў кіраўніцы археалягічнага назіраньня, доктаркі гістарычных навук Вольгі Ляўко, падобная кафля яшчэ не сустракалася.

Яшчэ адна траншэя прайшла сёлета і па тэрыторыі Куцеінскага Богаяўленскага мужчынскага манастыра, заснаванага ў 1623 г. Тут знойдзены падмуркі, датаваныя XVII—XVIII ст., пра існаваньне якіх археолягі раней не падазравалі. Сярод найболш адметных знаходак — фрагмэнт тэракотавай каробкавай кафлі XVII ст. **з выявай «Пагоні» (на здымку)**.

Трэба падзякаваць працаўнікам «Віцебскэнэргабуду» ды «Воршагазу», якія прыязна і добразычліва ставіліся да назіральнікаў (а гэта музэйшчыкі, краязнаўцы, школьнікі) ды дапамагалі ім у зборы прадметаў аршанскай мінуўшчыны.

**ЯЖ**

# Перамога на «Дынама», параза ў Даніі

**Беларусь—Малдова — 4:0. Першая гучная перамога беларусаў у афіцыйных матчах. Галоўнаму трэнэру малдаван Віктару Пасульку засталося толькі разьвесьці рукамі: «Мы цалкам правалілі другі тайм».**

На форумах у Інтэрнэце — эйфарыя. Аднак беларусы ў апошнім рэйтынг-лісьце ФІФА займаюць 73-е месца, Малдова — на 113-м. Майстэрства зборнай заключаецца ва ўменьні браць ачкі з камандамі, роўнымі па сіле. І лякмусавай паперкай для беларусаў стануць менавіта матчы ў наступным годзе са Славеніяй і Шатляндыяй. Бо мы дэкляравалі зрабіць зборную «сярэдняй эўрапейскай рукі».

Усе мячы забілі легіянэры. Адзіны прадстаўнік нацыянальнага першынства — Леанід Ковель (менскае «Дынама») — зьявіўся на полі толькі пры канцы гульні, пры ліку 3:0. У шэрагі зборнай нават ня быў выкліканы найлепшы на сёньня бамбардзір чэмпіянату Раман Васілюк. Паводле слоў трэнэра Байдачнага, ня тыя кандыцыі. Вось ён, узровень беларускага чэмпіянату. Колькі разоў казалі пра неабходнасьць скарачэньня колькасьці камандаў у вышэйшай лізе, каб павысіць канкурэнцыю. Галоўны аргумэнт спартовых чыноўнікаў — не зразумеюць нас заўзятары ў правінцыі.

Улады выкарысталі суботні матч, зрабіўшы перад рэфэрэндумам некалькі піяраўскіх хадоў. Гэта і танныя квіткі, калі найдаражэйшы каштаваў 9 тысяч, а для студэнтаў ад адной тысячы, і аж да болю ў зубах сардэчныя амапаўцы, якія прапускалі на трыбуну нават уладальнікаў бел-чырвона-белых шалікаў. Адзін з удзельнікаў форумаў іранізуе: «Паглядзім мы на дружалюбнасьць амапаўцаў 18 кастрычніка: дубінка, кутузка, штраф».

Гучная перамога беларусаў адсунула на другі плян аглушальную аплявуху, атрыманую айчынным мужчынскім гандболам у Лізе чэмпіёнаў. Мінулы год у Беларусі, здавалася, стваралася супэркаманда — Берасьцейскі гандбольны клюб імя Анатоля Мяшкова. Браты-бізнэсоўцы з Масквы Аляксандар і Сяргей Мяшковы вырашылі такім чынам ушанаваць памяць свайго бацькі, піянера гандбольнае справы на Берасьцейшчыне. У мінулым сэзоне канкурэнтаў на беларускай прасторы ў БГК не было — пры 31 гульні атрымалі толькі адну паразу і пуцёўку ў Лігу чэмпіёнаў. Праўда, супернік па кваліфікацыі «Порту» заканфліктаваў са сваёй фэдэрацыяй і ў Беларусь не паехаў. Партугальцам прысудзілі тэхнічную паразу. Першы групавы матч у Даніі супраць мясцовага «Гудмэ» БГК праваліў, забіўшы ўдвая меней, чым прапусьціў, — 17:36. Да таго ж берасьцейцы ня маюць магчымасьці праводзіць хатнія паядынкі. Адкрытыя з помпай і прыездам кіраўніцтва зь Менску спарткомплексы «Вікторыя» і лёгкаатлетычны манэж Эўрапейская гандбольная фэдэрацыя забракавала. Першы мае залю на 250 (!) гледачоў (такіх малых, напэўна, няма нават у Люксэмбургу), а манэж не прыдатны для вядзеньня тэлетрансьляцыі. Таму праводзіць хатнія паядынкі давядзецца ў Менску. Першы — 16 кастрычніка са славенскім «Гарэньне».

Усё можна было б сьпісаць на правінцыю, калі б не было галоўнай праблемы ў цэнтры. Беларускім гандболам кіруе прадстаўнік прэзыдэнта па Магілёўшчыне Юры Кулакоўскі.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Калі яго абіралі на пасаду кіраўніка фэдэрацыі ў 2001-м, верылі (усё ж набліжаны да прэзыдэнта!), што ён выведзе беларускі ручны мяч з крызысу: пойдуць інвэстыцыі, грошы. Але аднойчы сп.Кулакоўскі заявіў на паседжаньні: «Праца памочнікам не дазваляе ўдзяляць належнае ўвагі гандболу. Цяпер я тут, а празь дзьве гадзіны мушу быць у Бабруйску…»

Так што аматарам гандболу застаецца жыць успамінамі пра легендарны менскі СКА 80-х, калі прадстаўнікі Даніі ў якасьці канкурэнтаў нават не разглядаліся.

**Алег Раявец**

# Нобэлі-2004

Нобэлеўскую прэмію ў галіне фізіялёгіі і мэдыцыны прысудзілі амэрыканцам Рычарду Аксэлу і Ліндзе Бак за дасьледаваньні рэцэптараў паху і арганізацыі нюхальнай сыстэмы. Амэрыканскія дасьледнікі адкрылі і апісалі каля тысячы генаў, якія абумоўліваюць наяўнасьць каля тысячы тыпаў нюхальных рэцэптараў.

Рэцэптар паху ўяўляе сабой ланцуг амінакіслот, які прымацаваны да клетачнай мэмбраны і перасякае яе сем разоў, утвараючы пэўнага кшталту кішэнь, да якой можа «прыстыкавацца» малекула адаранту, зьмяняючы форму рэцэптара. Пасьля гэтага мозг атрымлівае электрычны сыгнал ад клеткі-рэцэптара. Бальшыня пахаў складаецца зь вялікай колькасьці розных малекул-адарантаў, нібы слова зь літар. Калі мы чуем нейкі пах, гэтыя малекулы актывізуюць кожная «свой» тып рэцэптараў, мозг атрымлівае камбінацыю сыгналаў, якая распазнаецца як менавіта гэты пах. Чалавек можа распазнаваць і запамінаць каля 10 тысяч пахаў.


AFP

Рычард Аксэл і Лінда Бак

## Асымптатычная свабода

Нобэлеўскую прэмію ў галіне фізікі атрымалі амэрыканцы Дэвід Грос, Дэвід Політцэр і Фрэнк Вілчэк. Дзякуючы іхным дасьледаваньням была завершана так званая стандартная мадэль фізікі часьцінак — мадэль, якая апісвае найменшыя вядомыя ў прыродзе аб'екты і ўзаемадзеяньне паміж імі. Сёлетнія ляўрэаты апісалі так званае моцнае, або каляровае, узаемадзеяньне — сілу, якая дзейнічае паміж кваркамі — часьцінкамі, зь якіх складаюцца пратоны, нэйтроны і ядры. Раней лічылася, што кварк ня можа выступаць у якасьці свабоднай часьцінкі, што магчымыя толькі камбінацыі з трох зьвязаных кваркаў. Грос, Політцэр і Вілчэк матэматычна давялі, што моцнае ўзаемадзеяньне паміж кваркамі павялічваецца пры аддаленьні кваркаў адзін ад аднаго і наадварот. Гэта значыць, што пры набліжэньні адзін да аднаго кваркі могуць паводзіць сябе як свабодныя часьцінкі. Гэтая зьява атрымала назву «асымптатычнай свабоды».


REUTERS

Дэвід Грос, Дэвід Політцэр і Фрэнк Вілчэк

## «Пацалунак сьмерці»

Нобэлеўскую прэмію ў галіне хіміі атрымалі ізраільцы Аарон Ціхановэр, Аўрам Гершка і амэрыканец Ірвін Роўз. Яны адкрылі мэханізм зьнішчэньня ў клетцы непажаданых бялкоў. Бялкі, якія не праходзяць унутрыклетачны «кантроль якасьці», пазначаюцца адмысловым поліпэптыдам — убіквітынам. Гэты «пацалунак сьмерці» служыць у якасьці пропуску ў пратэасому — прыладу для ўтылізацыі сьмецьця ўнутры клеткі, дзе бялкі разбураюцца.

Гэтае адкрыцьцё дазволіла зразумець, якім чынам кантралюецца шэраг вельмі важных біяхімічных працэсаў. Дасьледаваньні сёлетніх ляўрэатаў працягваюцца ў многіх лябараторыях ва ўсім сьвеце. Ужо вядома, што мэханізм зьнішчэньня бялкоў з дапамогай убіквітыну мае вялікае значэньне для работы імуннай сыстэмы чалавека, дзяленьня клеткі, узнаўленьня ДНК; увесь час адкрываюцца новыя яго функцыі.

Лекі, якія могуць быць створаны на аснове гэтага мэханізму, дазволяць кіраваць унутрыклетачнымі працэсамі — спыняць разбурэньне пэўных бялкоў альбо, наадварот, стымуляваць разбурэньне бялкоў, якія выклікаюць пэўныя хваробы. Ужо праходзяць клінічныя тэсты інгібітар пратэасомы Velcade (PS341), які выкарыстоўваюць супраць множнай міелёмы — ракавага захворваньня, якое пашкоджвае клеткі — вытворцы антыгенаў.

## Зялёны пояс Кеніі

Кенійка Вангары Маатаі стала першай афрыканскай жанчынай, якая атрымала ўзнагароду швэдзкай Акадэміі. У мінулым апазіцыянэрка, а цяпер дарадца міністра навакольнага асяродзьдзя, у 1977-м яна арганізавала жаночы рух «Зялёны пояс». За гады існаваньня руху яго ўдзельніцы пасадзілі больш як 30 мільёнаў дрэваў, прыпыніўшы такім чынам ператварэньне кенійскіх лясоў у пустыні. Сярод іншага арганізацыя Вангары Маатаі пераймаецца адукацыйнымі праграмамі ў галіне плянаваньня сям'і, выкрывае карупцыю, імкнецца паляпшаць умовы харчаваньня насельніцтва краіны.

## Мікра для макра

Ляўрэатамі прэміі Банку Швэцыі імя А.Нобэля ў галіне эканамічных навук сталі нарвэжац Фін Кідлянд і амэрыканец Эдвард Прэскат. Кідлянд і Прэскат паказалі, што эканамічная палітыка можа не дасягаць сваіх мэтаў, калі чаканьні пэўнай эканамічнай палітыкі загадзя ўплываюць на рынак. Пад уплывам іхных працаў былі праведзеныя рэформы цэнтральных банкаў і манэтарнай палітыкі ў такіх краінах, як Вялікая Брытанія, Швэцыя, Новая Зэляндыя, у зоне эўра. Другая частка ўганараванай Нобэлем працы — дасьледаваньне эканамічных цыкляў. Кідлянд і Прэскат упершыню ўжылі мікраэканамічныя прынцыпы для дасьледаваньня макраэканамічных цыкляў, паказаўшы, што цыклічныя ваганьні могуць залежаць ад зьменаў аспэкту прапановы.

**Алесь Пяткевіч**


WWW.UNESCO.ORG

Вангары Маатаі

# Тацяна — каралева Балівуду

## Беларуска заваёўвае індыйскую фабрыку мрояў

Здавалася б, рэжысэр Санджай Гупта знайшоў усё, што было трэба для стварэньня чарговага кінахіту. Шыкоўныя акторы, арыгінальны сюжэт, супэрновыя здымачныя пляцоўкі. Але легендарнаму гуру індыйскага кінэматографу не хапала самага галоўнага — партнэркі для танцу з галоўным ліхадзеем. Іх музычны нумар мусіў зрабіцца гваздом блякбастэру «Мусафір», што выйдзе на экраны 12 лістапада. Складанасьць была ў тым, што ролю сэксапільнага наркабарона выконваў індыйскі кінаідал Санджай Дат. Даць яму ў пару абы-каго не выпадала. Прэм’ера няўмольна набліжалася, а вартай дзяўчыны на прымеце не было.


WWW.INDIAFM.COM

Каб пазьбегнуць правалу, рэжысэр сумесна з кінакампаніяй «White Feather Films» аб’явіў міжнародны конкурс, пераможца якога мелася зрабіцца галоўнай «item girl» у фільме. Кастынгі танцорак адбыліся ў Мумбаі, Нью-Дэлі, Калькуце, Бангалоры, Дубаі ды Лёндане. Прэтэндэнтак было сьвет, але ў фінал, што прайшоў у гатэлі «Grand Hyatt» у Мумбаі, выйшлі толькі 14 зь іх.

І тут адбылася сэнсацыя — журы, што складалася са слынных актораў, аднагалосна выбрала пераможцай… беларуску Тацяну Бохан, якая ўжо доўгі час жыве ў Дубаі, дзе выкладае танцы. Паводле меркаваньня судзьдзяў, яна здолела ўдала спалучыць эратычнасьць рухаў і добры густ. Пакуль астатнія прыгажуні пакрыўджана кусалі пазногцікі, Тацяна ўжо давала інтэрвію журналістам. «Я ня дужа шмат ведаю пра Санджай Дата, але шчасьлівая магчымасьці танчыць разам зь ім. Я ведаю — працы будзе шмат, але я з радасьцю чакаю пачатку здымкаў», — сказала яна.


WWW.INDIAFM.COM

**Беларуска Тацяна Бохан,безь пяці хвілінаў індыйская тэлезорка, выкладае танцы ў Дубаі.**

Музыка да фільму ўжо выйшла ў сьвет і б’е рэкорды продажаў у Індыі. Праца над самой стужкай таксама практычна завершана — засталося толькі зьняць ды ўмантаваць сцэну танцу Санджай Дата ды Тацяны. Менавіта на іх нумар ляжа галоўная песьня з саўндтрэку «Мусафіра».

Размаўляць на хіндзі — мове фільму — Тацяне пакуль што цяжкавата, аднак мовай цела яна валодае фэнамэнальна. Пра яе ўжо кажуць як пра ўзыходзячую зорку Балівуду. Удалыя «item girls» карыстаюцца ў Індыі ня менш шалёнай папулярнасьцю, чым акторы, — дзяўчаты імкнуцца насьледаваць іх стылю, а хлопцы завешваюць сьцены постэрамі з фота танцорак.

**Алесь Кудрыцкі**

### Крыху пра Балівуд

**Тых, хто з усьмешкай думае пра «старае добрае індыйскае кіно», чакае сюрпрыз: яно засталося толькі на архіўных стужках. Цяпер прадукцыя Балівуду — цэнтру індыйскай кінаіндустрыі непадалёк ад Бамбэю — не нашмат саступае па якасьці галівудзкім фільмам. Штодзённа з балівудзкіх здымачных пляцовак выходзяць па два новыя фільмы, кожны зь якіх глядзяць за 10 мільёнаў чалавек. «Paramount Pictures» плянуе перанесьці ў Балівуд частку сваіх здымачных пляцовак: зрабіць фільм ў Індыі каштуе ў чатыры разы таньней, чым у Каліфорніі. Тацяна Бохан мае ўсе шанцы зрабіцца каралевай індыйскай фабрыкі мрояў.**

### Крыху пра фільм

Пісталет да скроні, па якой сьцякае кропля халоднага поту, шнар на няголеным твары, пстрык запальнічкі, дым ад цыгары, заціснутай у цынічна скрыўленых вуснах, погляд спадылба, стрэл, здрадлівы віск кулі, — такі вось відэашэраг прапануе гледачам анонс «Мусафіру». Па-за кадрам — нарастаючы бой тамтамаў ды злавесна-сіплаваты голас Санджай Дата. «Страляніна пачнецца 15 лістапада», — абяцаюць афішы.

Слова «Мусафір» нясе ў сабе сэнсавую алюзію на пілігрымку — духоўнае падарожжа з мэтай самаўдасканаленьня. Станоўчаму герою фільму па мянушцы Лакі («шчасьлівучык») хранічна не шанцуе. Ягонае дзяцінства прайшло паміж домам для беспрытульнікаў ды калёніяй для непаўналетніх злачынцаў, на хлеб ён зарабляў выпадковай працай ды дробнымі крадзяжамі. Мара Лакі — дом у Бангалоры, сям’я, сабака, новае жыцьцё. Здаецца, ён ужо блізкі да сваёй мэты, але ўсё зноў бурыцца. Лакі здраджвае яго каханая, а сам ён губляе грошы наркабарона-забойцы (Санджай Дата). Каб набыць права на жыцьцё, Лакі накіроўваецца ў падарожжа на курорт Гоа, дзе мусіць пракруціць зьдзелку з ізраільскай наркамафіяй. Па ягоных сьлядах ідуць прадажны сакрэтны агент ды таямнічая прыгажуня Сэмс, якая стамілася ад замужняга жыцьця і жадае экспэрымэнтаў з каханьнем ды сэксам. Але найбольшую небясьпеку нясе сам наркабос, які, нібы цень, неадступна спадарожнічае Лакі падчас ягонай небясьпечнай «пілігрымкі».

МУЗЫКА

# Адным — шчыт, другім — па гарбе

Калі дэмакратаў з рок-музыкамі пагналі зноў на Бангалор, то ўдзельнікаў акцыі «Музычны шчыт айчыны» шпурнулі за Ўручча.

Абедзьве музычныя акцыі былі нешматлюдныя. Праўда, на суботні «шчыт» сагналі вайскоўцаў з найбліжэйшых часьцей, ад чаго стадыён на 8-м кілямэтры быў афарбаваны ў колер «хакі». За «напаўненьне» адказваў Першы музычны канал, які склікаў дзясятак выканаўцаў — ад «ансамбляў вайсковай песьні» накшталт груп «Спэцназ» і «Мэханіка», улюбёнцаў Навумава, да Алесі і К.Слукі. Са сцэны палітычных лёзунгаў не гучала, затое збоку вісеў вялікі агітплякат са словамі «Аддамо галасы за нашага кандыдата В.Марахіна». Плякат вісеў такім чынам, што бачыць яго маглі толькі гледачы.


УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

Тое, што ён выступіў не на музычнай акцыі «Першага музычнага», а на агітмерапрыемстве, **Валік Грышко (на здымку)** даведаўся ад нас. «Калі б мы дазналіся пра плякат перад выступам, іграць бы адмовіліся», — абураўся Валік.

«Нам ужо неаднойчы прапаноўвалі выступіць у падтрымку розных кандыдатаў, аднак мы ня гралі. Адмовіліся б і ў гэтым выпадку. Выйшаў я на сцэну праз настальгію, бо калісьці служыў у 120-й Рагачоўскай дывізіі, якая непадалёк, і праз гэты стадыён бегаў на спатканьні са сваёй будучай жонкай», — кажа лідэр «Новага Ерусаліму» Аляксандар Патліс.

Арганізатары акцыі, што прайшла на плошчы Бангалор у нядзелю, не хавалі палітычнага характару іх мерапрыемства. Групы «Палац» і «Крама» прыйшлі на плошчу ў поўнай «экіпіроўцы». «Канцэрт дазволілі, але ўжо перад сцэнай нас праз арганізатараў папярэдзілі: выйдзеце на сцэну — атрымаеце па гарбе», — апавядае лідэр «Палацу» Алег Хаменка. Музыкі па гарбе атрымоўваць не пажадалі, таму паміж выступамі палітыкаў гучалі музычныя фанаграмы «Палацу».

Вось так і выходзіць: адны падтрымалі нечую выбарчую кампанію насуперак свайму жаданьню, а другім, якія мелі на тое жаданьне, гэта зрабіць забаранілі.

**Сяргей Будкін**

### Пахаваньне Асташонка

11 кастрычніка адбылося пахаваньне пісьменьніка Алеся Асташонка, які памёр 7 верасьня ў Кіеве. Прах літаратара знайшоў вечны спачын на Кальварыйскіх могілках.

### Федарэнкавы талеры

Андрэй Федарэнка стаў пераможцам конкурсу на найлепшы сцэнар для тэлесэрыялу пра жыцьцё моладзі. Прыз складаў 1000 даляраў. Ягоны сцэнар «Тры талеры» апавядае пра пошукі напалеонаўскага скарбу. Сцэнар грунтуецца на прыгодніцкай аповесьці «Шчарбаты талер».

### Прыватная ініцыятыва

Выдавец Алесь Суднік і прадпрымальнік Андрэй Супрановіч заснавалі кніжную сэрыю «Спадчына Полацкай зямлі». Першай у ёй стала кніга «Храм Покрова Пресвятые Богородицы во граде Полоцке». Выданьне прымеркавана да ўрачыстасьці аднаўленьня разбуранай саветамі царквы, якая адбудзецца 14 кастрычніка.

### Музэй касманаўтыкі

У вёсцы Тамашоўцы Берасьцейскага раёну пасьля 3-гадовай рэканструкцыі адчыніўся адзіны ў Беларусі музэй касманаўтыкі. У гэтай школе часам вучыўся Пятро Клімук. Сярод экспанатаў музэю клясны журнал, гідракамбінэзон, кіцель Клімука, касманаўцкія харчы. Абноўлены музэй мае выгляд касьмічнай стартавай пляцоўкі, на якой стаяць зьменшаныя копіі карабля «Ўсход», станцыі «Мір», спадарожнікаў Зямлі. Нацбанк шэфстваваў над рэканструкцыяй, выдзеліў на яе 300 млн руб.

### Уайлд на распродаж

У Нью-Ёрку ў кастрычніку мае адбыцца буйны аўкцыён, на які будуць выстаўлены рэдкія рукапісы, лісты й асабістыя рэчы пісьменьніка Оскара Ўайлда. Падзея прымеркаваная да 150-годзьдзя зь ягонага дня нараджэньня (16 кастрычніка). Выстаўлены рукапіс ацэньваюць у 145 тыс. даляраў.

### Прэмія для Эстэргазы

На Франкфурцкім кніжным кірмашы, прысьвечаным сёлета арабскай літаратуры, Прэмію міру нямецкіх кнігавыдаўцоў (15 тыс. эўра) атрымаў вугорскі празаік Пэтэр Эстэргазы.

### Дэрыды няма

На 75-м годзе жыцьця ад раку памёр францускі філёзаф Жак Дэрыда. Дэрыда найбольш вядомы як заснавальнік дэканструктывізму — разьвіваў ідэю разбурэньня ці, прынамсі, крытычнага асэнсаваньня характэрнага для заходняй думкі «словацэнтрызму». Настойваў, што аўтар не заўжды разумее сэнсы, закладзеныя ў сваім творы, а важней тое, як разумее яго чытач. Па-беларуску асобным выданьнем выйшла праца Дэрыды «Акрамя імя».

**АВ, Васіль Кроква; БелаПАН, Gazeta.pl**

# Чаму яны галасуюць

Барыс Тумар

Вялікі, бязьмежны зялёны спакой. Дрэвы, хмызы, пясчана-ржавая стужка рэчкі Віць і далёка-далёка — сіні прасьвет Прыпяці. Вакол назіральнай вежы ў вёсцы Тульгавічы зялёным морам сыпіць чарнобыльская зона. Хмызы занялі месца, якое вякамі адваёўваў чалавек. Так будзе выглядаць сьвет, закіданы нэйтроннымі бомбамі.

Раптам у абалоні Віці заўважаю загон з бульбаю. Ёсьць людзі! Значыць, нездарма мы дабіраліся сюды. Нам казалі, што ў Тульгавічах жывуць, але з машыны мы не заўважылі ў вёсцы прысутнасьці чалавека.

## Бульбяное поле сярод нябыту

У вёсцы застаецца дзясятак старых, якія адмовіліся высяляцца. Плюс адзін самасёл — бомжык, што прывалокся аднекуль з Расеі. Спачатку жыў у суседніх Кажушках, дык тамака яго білі тамтэйшыя насельнікі-алькаголікі. А тут добрая грамада. Бомж дапамагае ў гаспадарцы, яго за тое кормяць. «Мэр» Тульгавічаў — Іван Шамянок, Есіпаў сын, прадстаўляецца ён па бацьку, мае 79 гадоў, а здаровы, як дуб мароны. Садзіць 60 сотак бульбы, трымае два кані. Жывы, бо не ўзялі на фронт у 44-м — захварэў на тыф.

Вакол старых — зьдзічэлы абшар радыяцыйнага запаведніку. У старых адвечныя клопаты. Дзікі ламаюць платы, дабіраюцца да бульбы. Рыюць пад хатамі, асабліва дзе растуць шаўкоўніцы. За 10 гадоў на бедненькай тульгавіцкай зямлі бяз догляду згінулі ўсе чыста яблыні й абрыкосы, выжылі толькі неперабарлівыя палескія сьліўкі ды шаўкоўніцы.

Сяло палескае, на дзясятак вуліц, сотні хатаў. Хаты так і стаяць, разныя птушачкі над аканіцамі п'юць з чарак, нават глякі старажытныя вісяць на платах, толькі марадзёры паабдзіралі шыфэр ды правалiліся дранкаю крытыя стрэхі. Адна вуліца выгарала пару гадоў таму. Валацугі запалілі. Гэта й была найбольшая падзея апошніх гадоў. Параўнаўся б зь ёю па значэньні хіба што прылёт Лукашэнкі.

Старыя сабралі сабе з дэталяў камбайн. Ды толькі бяда з саляркай: мала дзеці давозяць.

Каровы і сьвіньні вольна пасуцца між хатамі, як мо сямсот гадоў таму. Да найбліжэйшае жылое вёскі — 15 км лесам.

Убогія могілкі на пясчаным груддзе — толькі яны з антрапагеннага растуць у зоне адсяленьня. Тыя, хто памірае, просяць хаваць іх тут, вераць, што нашчадкі вернуцца на старыя котлішчы, што род адродзіцца і не расьцярушыцца. Крыжы, трое камуністаў пад тумбачкамі замест крыжоў, пусты грудок зь ледзьве знанымі пагорачкамі мінулавечных магілаў, ніжэй — дзясятак сьвежых горбікаў. «З Маскву бабу прывезьлі хараніць!» — расказвае цётка Алена. У тутэйшай гаворцы замест «ы» кажуць «у». Зьнікне гаворка, як памруць гэтыя дзесяць старых.

## Адчуйце вечнасьць

У былым клюбе на сьцяне — графікі росту паказнікаў жывёлагадоўлі, спыненыя на 1986 г.

Трохпавярховая школа разьбітая ўшчэнт. Толькі на сьцяне ў холе непераможны росьпіс «Партыя — розум, гонар і сумленьне», ды на савецкім сьцягу напісана слова з трох літар. Так маглі біць толькі падлеткі і дэгенэраты — мэтадычна, дзень пры дні, пакуль ня струшчылі ўсё непрыдатнае на вываз. Нават трубы павырывалі з-пад падлогі.

У Фінляндыі ці Японіі ніхто не крануў бы й шыбы. Так і стаяла б стагодзьдзямі школа помнікам выгнаньню і дастаяла б да поўнага распаду калі ня стронцыю, дык цэзію.

## Антрапаэкатурызм

Ігару, кіроўцу аўтакрамы, 28 гадоў. Ігараў брат хварэе на лейкемію ў Берасьці ўжо пяць гадоў, але ня падае духам, купіў два шапікі на базары, ажаніўся, нарадзілася дзіця. У людзей не прападае адчуваньне, што яны трусы для экспэрымэнтаў, — на братавым выпадку доктар абараніў дысэртацыю.



Хмызы занялі месца, якое вякамі адваёўваў чалавек.

Аўтакрама прыязджае ў Тульгавічы ў аўторак і суботу ад 13-й да 14-й. Тады па хлеб і газваду да Шамянковага падвор'я выбіраюцца ўсе насельнікі — гэта найлепшы дзень, каб нанесьці ім візыт. Прыязджайце — яны рады гасьцям. Такі экстрэмальны антрапаэкатурызм магчымы яшчэ хіба ў джунглях Амазоніі. Адчуйце вечнасьць — у вашым Менску залеташнія штаны здаюцца верхам старамоднасьці. А там стронцый і амэрыцый праляжаць яшчэ тысячу гадоў, і пушча будзе стаяць тысячагадовая. Прыяжджайце, пакуль старыя жывуць.

Яны апошнія жыхары зоны адсяленьня. Улады навялі парадак. Бадзяг і сьнежных людзей тутака больш не засталося. Толькі ў Белай Сароцы жыве яшчэ анахарэт, кажуць, ловіць рыбу начальству. Ды за вальерамі запаведнікавымі наглядае егер, каржакаваты дзядзька, які 25 гадоў адседзеў за крымінал. Тут лепш, чым там было, пасьміхаецца ён. Ваўкі зьелі ў яго пяць сабак гэтай вясной.

Старыя абладзілі адну з кінутых хатаў пад капліцу, пакуль былі жвавейшыя. Але ня надта ходзяць у яе. Замок, што вісеў у яе на дзьвярах, вырвалі і скралі, усярэдзіне мышы паразгрызалі папяровыя абразы. «Хоць бы які бацюшка да нас заехаў», — уздыхае баба Алена. Яна мае кватэру ў Рэчыцы, але ня хоча туды выбірацца.

Немцы наведваюцца сюды штогод, прывозяць па 50 эўра кожнаму, японцы мераюць радыяцыю. Маланка трапіла ў тэлефон, аўстрыйцы прывезьлі новы.

Самаарганізацыя чарнобыльскіх супольнасьцяў — гэта трохі самаарганізацыя дзеля разьмеркаваньня дапамогі. Вымушаны паразытызм.



79-гадовы Іван Шамянок трымае коні, каровы і садзіць 60 сотак бульбы

## За Пальмірай і Дублінам

Зусім інакш, чым разрабаваныя Тульгавічы, выглядаюць вёскі поўдня, дзе радыяцыя зашкальвае, адкуль людзей вывезьлі ў першыя дні пасьля аварыі. Людзі кідалі ўсё. У хатах валяюцца картачкі — унікальная савецкая традыцыя калярызаванай фатаграфіі, адзеньне, посуд. Часопіс «Вожык» за красавік 86-га… Станеш пад штрыфэлем — яблыкі як гарбузы, вісяць, водар мядовы. І школкі стаяць некранутыя. Значыць, у Тульгавічах крушылі свае, робіць выснову фатограф Анатоль Кляшчук, ён перабачыў многа чарнобыльскіх сёлаў, але такое дзікунства сустракае ўпершыню.

Графіт у рэактары гарэў 10 дзён. Увесь гэты час на Беларусь рухаліся аблокі сьмерці, і найбольш насыпала тут. У Масанах, зь якіх відаць саркафаг над атамнай станцыяй, ёсьць плямы да 1000 мікрарэнтген за гадзіну.

Вёска Пальміра пад Хвайнікамі, вёска Дублін пад Брагінам, Жалібор у зоне адчужэньня — запаведныя назвы, запаведныя мясьціны. Вы ня бачылі паў-Беларусі, калі ня бачылі дванаццацімэтровых дзюнаў у Краснасельлі. Тут пасьля векавога перапынку па зыбучых пясках ізноў бегаюць дропаты — беларускія стравусы, якія вярнуліся сюды з украінскага стэпу, калі зону пакінулі людзі. А вакол Прыпяці разрастаюцца зарасьнікі ядзянога арэху. Чыстыя, дарэчы, — 13 мкр/г — бо вада праточная.

## Беларускі экстрым

На КПП на выезьдзе з запаведніку дзяжурыць хлопец з Гомелю, іншы вартуе на вышцы. 2 сутак вахты, 8 сутак дома. Каля іх лашчацца кацяняты, пасецца конь, сьпеюць буйныя таматы. На прыбіральні вісіць шыльда, сьцібраная недзе ў парку: «русский экстрим». «Ня страшна такому маладому працаваць у зоне?» — «А дзе я шчэ знайду працу, каб 300 тысяч у месяц зарабляць?» — адказвае хлопец.

Пасьля паездкі па зоне ў мяне складаецца цьвёрдае перакананьне, што сярэдні заробак у краіне набліжаецца да 200 даляраў толькі на перадавіцах «Саўбеліі».



Уладзімер з Казялужжа зарабляў у калгасе 40 тысяч за месяц, а цяпер на базары ўтаргоўвае 30 тысяч за дзень.

# за Лукашэнку

## Рэпартаж з краю сьвету


З вышкі ў Масанах відаць чарнобыльскі саркафаг.

А ў гарадках чарнобыльскіх раёнаў — як і ў кожных гарадках. На базары сьвежае сала па 5000 рублёў за кілаграм. Уладзімер з Казалужжа прадае капусту. «40 тысяч заробак у калгасе, дык чаго працаваць? Тут за дзень на базары ўтаргую 30 тысяч. А там жа развал, праводка падае, адказнасьці страшна». Ён падпісчык «Народнай волі». «На выбарах у нас нават фальсыфікацыі не было», — сьведчыць ён. «Хто ўместа яго?» — усе пытаюцца. «Ды, кажу, на дзесяць мільёнаў чалавек разумных людзей хіба ня знойдзецца?!» — гарачыцца ён.

«Нашто яны правяраюць малако на цэзій, калі немагчыма праверыць на стронцый?» — хітае галавой мэдсястра. Усе ядуць і мясцовую бульбу, буракі, хоць у зямлі яны набіраюцца нуклідаў…

У чарнобыльскай зоне ўражвае кантраст. Толькі што ты хадзіў па хатах, дзе 15 гадоў не ступаў чалавек, — лёзныя людзі ня ў лік. Дзясятак кілямэтраў — і коціцца нармальнае жыцьцё. Прынамсі, людзі робяць выгляд нармальнага жыцьця.

Моладзь розная, ня толькі сьпітая — шмат густоўна апранутых, са сьветлымі тварамі. Апошняе чамусьці часта спалучаецца з даўгімі валасамі. Гэта студэнты павярталіся да бацькоў. Як у часы Гарэцкага, нясуць у родныя лазьні жаданьні лепшага ладу. Прычым ладу тут і цяпер, на дзедаўшчыне, а не ў нямецкіх наймах.

Лазьня працуе толькі ў выхадныя. Ля пошты, акрамя рэклямак газэт урадавых, вісяць постэры «Обозревателя» і «Роднай прыроды». Пад помнікам Леніну жанчынкі — адна старая, другая кульгавая — вучаць хлапчанё езьдзіць двухколавым роварам. У крамах на выбар гарэлкі, але досыць і вінаў, беларускага, праўда, разьліву. У шапіку на відне выстаўлены часопіс «Красота и здоровье». Пустыя хаты з забітымі вакніцамі скрозь, нават на цэнтральных вуліцах. Нерухомасьць тут не каштуе нічога. Замкнёны стаіць і касьцёлік. А вось пры царкве дзейнічае кляштарчык.

За помнікам мёртвым вёскам на палетках упраўляюцца навюткія «Беларусы». Старыя аўтобусы «MAN» возяць пасажыраў па маршрутах. Пяць дзяцей ляжаць у радзільні доктара Малгажаты Яваж. Усё гэта Хойнікі. Ці Хвайнікі, як гаварылі даўней.

## Цар-сьлімак

Мала дзе я адчуваў такі турыстычны кайф, як у зоне. Фантастычныя лясы, суровыя насельнікі, пачуцьце рызыкі — гэта вам не даляравы адрэналін пэйнтболу. Гэта ня Менск і нават ня Лепель. Тут усё — праўда.

Калі сёньня тут мала турыстаў, дык толькі праз адсутнасьць хаця б аднаго добрага гатэлю і аднае добрае кухні пры ім.

Пераяжджаючы з зоны адчужэньня на начлег у мястэчка, міжволі пачынаеш адчуваць сябе перадусім вандроўнікам, як у любым іншым сафары, і думаць пра камфорт.

У Хвайніках працуе добры рэстаран «Палесьсе», але нікчэмны гатэль. Не выдаюць нават ручнікоў. Калі камусьці з генэтыкаў патрэбен экзэмпляр унікальных памераў смаўжа, вы знойдзеце яго ў душавой кабінцы хвойніцкага гатэлю.

Маім сябрам-французам гатэльны душ падаецца фэномэнам, больш значным за радыяцыю. У ім вялізныя празрыстыя вокны. Вада цячэ толькі халодная, і яшчэ на цябе глядзіць царскім поглядам са сьцяны кабінкі гіганцкі сьлімак. Нават ён не наважваецца спускацца на патаптаную ботамі вахтавікоў падлогу.

## Сярдзючка сьпявае ў Хойніках

У Брагіне дзейнічае прыстойны гатэль. Але ў Брагіне рэстаран на рамонце і ўвечары няма дзе паесьці. Ах, як згадваецца тады фірмовы булён з хатнімі пяльменямі ў хвойніцкім «Палесьсі»!

Пасьля Менску цэны ў корчмах падаюцца проста мізэрнымі. Паабедаць можна за 2000, а павячэраць адборным — за 4000 рублёў.

У стылі раённых рэстаранаў падаюць чай не пытаючыся — адзін раз каркадэ, другі — суніцы. Усякі ёсьць у наяўнасьці. Адной прыхмялелай афіцыянткі хапае на цэлую залю. І раве Верка Сярдзючка. Лабухам здаецца, што ўкраінскі travesti мусіць сьпяваць гучна-гучна. Размаўляць немагчыма, нават пад графінчык гарэлкі. Затое можна танчыць, трэба танчыць. Здаецца, у чарнобыльскай зоне ў рэстарацыях больш жанчын, чым мужчын-наведнікаў. У зоне ўвогуле больш жанчын, чым мужчын. Тых, што ня страцілі чалавечага выгляду. Ах, як кружацца яны пад «Шчэ нэ вмэрла Украіна, есьлі мы гуляем так»! Няма сьмерці, няма радыяцыі, калі ў рэстаране «Палесьсе» грае Сярдзючка.



Трохпавярховая школа ў Тульгавічах раструшчана ўшчэнт.

## Акліматызаваныя да радыяцыі вітаюць цябе

Ларыса Лінкевіч, бібліятэкарка з Кірава, набрала дозу радыяцыі ажно 650 бэкерэляў на кілаграм. Больш за 200 доктар Бандажэўскі называў сьмяротна небясьпечнай. Так і казалі Ларысе дактары, адраджвалі нараджаць, рэкамэндавалі аборт. Яна не паслухалася. Дачка расьце здаровая, і Ларыса здаровая — ні разу ў жыцьці не хварэла. Грыбы, ягады? «Ямо, вядома!» — са своеасаблівым гонарам распавядае Ларыса. Яна лічыць сябе «акліматызаванаю» да радыяцыі.

Вёска Кіраў на самым поўдні Нараўлянскага раёну, ля мяжы з Украінай, — рэкардыстка па накапленьні радыяцыі людзьмі.

Самы страшны Ларысін успамін? Яна сядзіць у падпечку, а па хаце ходзяць чужыя людзі ў плямістай форме. Яны ходзяць і забіраюць дзяцей.

Родам яна з Вуглаў, самага блізкага да Чарнобылю кутка Нараўляншчыны, і самага забруджанага. Калі выбухнула ў 86-м, яе сям'я вырашыла не адпускаць дзяцей ад сябе. Кожны памятаў, як разлучаліся сем'і ў апошнюю вайну. Пяцёра дзяцей сядзелі пры лучынцы ў падпеччы, пакуль маці адгаворвалася ад эвакуатараў. Так і не аддалі дзяцей у санаторый.

Пра што шкадуе Ларыса? Прапаноўвалі ёй зьезьдзіць у Нарвэгію з дачкой на лета, яна адмовілася. Хацелася трапіць у цяплейшы край, а зараз ці надарыцца яшчэ нагода павандраваць?

## З дозай у вантробах

У ахайнай Ларысінай бібліятэцы выстава Быкава суседнічае са стэндам аб прэзыдэнту Лукашэнку пад назваю «Мая Беларусь». З новых выданьняў паступае «Беларуская энцыклапэдыя». А так увогуле няшмат — 18 кніг сёлета пакуль. У тым ліку ўсё на чарнобыльскую тэму.

Залятае пажарнік зь мясцовай дружыны. Войкае — ён босы і напаўголы, не чакаў убачыць чужых.

Больш за палову насельнікаў Кірава жывуць зь небясьпечнаю дозай у вантробах. Тут лясы, лясы і балоты. Колісь Кіраў называўся Махаеды. Як тут не хадзіць у лес, калі ў цябе заробак 80 тысяч і дзеці просяць есьці?

Лукашэнка ўжо двойчы прылятаў у суседнія Грыдні — адселеныя, куды павярталіся людзі. Нібы Хрыстос, сыходзіць ён са свайго магутнага верталёта. «Зра сагналі людзей!» — кідае хрыплаватым галасам, і словы бальсанам кладуцца на сэрцы гэтых людзей. «Слава богу, што людзі захацелі вярнуцца. Дайце ім вазможнасьць нармальна работаць».

«Пры нашай радыяцыі можна жыць!» — паўтарае стары й малы. Далоў асабістыя лічыльнікі накапленьня, да якіх былі прывучылі мэханізатараў у гады «разгулу нацыяналізму». Далоў дакучнае самаабмежаваньне ад чарніцаў і журавін. Не Лукашэнку і нават ня гэтым людзям плаціць па рахунках будучай — мусіць, ужо страхавое — мэдыцыны. Іхная праца — гэта збожжа і драўніна, якія спажываем мы ўсе.

«Хто любыя ягады бярэ, а хто ў чыстую зону езьдзіць пад Красноўку», — тлумачыць хлопец Юрка на мапэдзе. Гляджу на мапу: чыстая — гэта ад 5 да 15 кюры на квадратны кілямэтар…

«Хто зьехаў — даўно паўміралі ўсе, а мы тут жывём». Гэтую магічную, самазаспакаяльную формулу чуеш у паўадселенай зоне скрозь. «Панікёры зьехалі, сьмелыя засталіся», — удакладняе загадчыца Кіраўскага лясьніцтва, дужая, літая цётка з тых, хто прывык ісьці з жыцьцём у барушкі. І сама папраўляецца: «А мо наадварот: зьехалі тыя, хто не збаяўся невядомасьці».

## Усіх павесіць!

Навасёлкі: 90% дамоў стаяць пустыя, каля астатніх сядзяць бабы і скачуць унукі.

Стралічаў: дзеці купаюцца ў сажалцы, каровы ідуць з пасты. Загаворваем зь цёткай. Наша літаратурная беларуская мова бабу арыентуе адразу: «Мы не дапусьцім, каб Лукашэнка пайшоў, мы не дамо яго скінуць! — заяўляе яна ў адказ на нашы роспыты, як жывецца. — Ён нам пэнсію дае! Ён сказаў, што ў Бабчын трэба вярнуць людзей! Я сама чула па тэлевізары, і мая нябога чула, — ківае яна на маладзейшую, што прыехала ў адведкі да цёткі са Жлобінскага раёну. Абедзьве яны эвакуяваныя з Кажушкаў, вёскі ў зоне адчужэньня, якая пару гадоў таму цалкам выгарала і дзе цяпер стаяць адны коміны, як у Хатыні, і гэта яшчэ страшней, чым разрабаваныя марадзёрамі Тульгавічы — іншага помніка Чарнобылю і ня трэба. — Судзіць трэба тых, што нас павывозілі!»

«Павесіць прадсядацеля калхозу й прадсядацеля райіспалкаму за тое, што яны наш калгас закрылі!» — зноў чуем мы ў напаўадселеных Сабалях пад Брагінам.

Такія вешалі і ў 1917-м, і ў 1939-м. Гэтыя старыя нікому не патрэбны. Адзіны чалавек, які сьцьвярджае, што пра іх клапоціцца, — гэта Лукашэнка. І яны будуць ізноў галасаваць за яго. Яны знаць ня хочуць прычынаў і наступстваў, тэорыі і практыкі. Яны знаюць адно: нас выгналі з родавых сядзібаў, і толькі Лукашэнка сказаў, што нас трэба вярнуць у старыя хаты, каб было, як раней.

Працяг на старонцы 10.


Да аўтакрамы па хлеб і газваду выбіраюцца ўсе насельнікі Тульгавічаў.

# Чаму яны галасуюць



Вёска Кіраў на поўдні Нараўлянскага раёну — рэкардыстка па накапленьні радыяцыі людзьмі.

Працяг са старонкі 9.

## Верую ў Лукашэнку

Яны славяць свайго Лукашэнку, тут жа плачуць пра свае хваробы, клянуць дактароў, няздольных вылечыць іх, чухаюць пад пахамі, хваляцца, як добра ім жывецца, якія пэнсіі яны палучаюць і як усё маюць, бо ядуць усё сваё.

Вера ў Лукашэнку сярод неадукаваных слаёў насельніцтва ў чарнобыльскай зоне паўсюдная. Апошні раз так верылі ў Сталіна, Чарвякова і Мікалая II.

Калі трохі адукацыі ў чалавека ёсьць, адразу іншая гаворка. «Хацелі б выехаць?» — «Вядома, хацелі б. Хто б жа не хацеў. А куды паедзеш? Дзе жыць будзеш? Раней атрымлівалі двайны заробак, а цяпер грошай няма, усё Лукашэнка паадбіраў». — «А што ж рабіць?» — «А што ты зробіш, будзем жыць патроху». Або пра фінансаваньне мэдыцыны: «У Брагіне пабудавалі з помпай бальніцу, а цяпер скарачаюць аддзяленьне за аддзяленьнем». Але людзі просяць не называць імёнаў — і гэта найлепш гаворыць пра сытуацыю са свабодай.

Нават з больш адукаваных, калі не лічыць вузкага кола кіраўнікоў раённага зьвяна і апазыцыйных асяродкаў, ніхто не апэруе паняцьцямі накшталт «скарачэньне бюджэтных выдаткаў на Чарнобыль» ці «разьвіцьцё альтэрнатыўных вытворчасьцяў». Мысьленьне людзей за апошнія дзесяць гадоў жудка прымітызавалася.

Лукашэнка зьмясьціў краіну ў камэру маўчаньня. Грамадзтва больш не абмяркоўвае сваіх праблем ні ў СМІ, ні іншымі публічнымі спосабамі. Незалежныя трыбуны думак даступныя некальнім працэнтам насельніцтва. СМІ замбуюць людзей прапіснымі ісьцінамі і прапагандысцкімі штампамі — і бабыклікушы іх паўтараюць.

Людзі страцілі здольнасьць аналізаваць грамадзка значныя факты і падзеі ды рабіць выбар.

Выбар стаў прывілеем вузкага кола вэртыкальна-сілавое эліты, якая ставіць грамадзтва перад фактам. Дыскусія перастала лічыцца нармальнай зьявай. Нічога прынцыповага ў Беларусі не дыскутуецца. Двух меркаваньняў ня можа быць. Таемнае кола аналізуе, затым Лукашэнка фармулюе, потым дзяржаўныя СМІ і інтэлігенцыя абгрунтоўваюць і памнажаюць. Іншыя думкі не агучваюцца, зь імі можна азнаёміцца толькі «ад праціўнага», калі яны разьвенчваюцца. Не, вядома, вы можаце дыскутаваць на тэму шкоды курэньня.

Адключэньне мэханізмаў крытычнага аналізу і публічнае дыскусіі зрабілі наша грамадзтва крайне здатным на ўсялякія памылкі і залежным ад добрае ці злое волі, разумных ці дурных надумкаў вузкай групы людзей. Прымітывізацыя мысьленьня ў гістарычнай пэрспэктыве вядзе да росту цемрашальства ва ўсіх яго праявах. Беларускае грамадзтва адстае ад эўрапейскіх па здольнасьці самаарганізацыі зьнізу.



Салома для хойніцкай фабрыкі сувэніраў.

## Кіргізы апанавалі

Расказвае сяброўка Люды Ігнаценкі, сястры пажарніка-героя, які загінуў на ЧАЭС і помнік якому стаіць напамінам на цэнтральнай плошчы Брагіна. «26 красавіка Люда счапілася з двума «кіргізамі» на жалобным мітынгу. «Для нас гэта плач — ня выплачашся, а для іх — сьвята, дай напіцца! Адны мы ведаем, што гэта такое было. Нас ужо мала й засталося такіх, што ўсё перажылі. Пасьля ўжо ўсякая навалач наехала».

«Навалач» называюць без разбору «кіргізамі». Такая народная назва для «асоб каўкаскай нацыянальнасьці».

За хвойніцкімі могілкамі ўбіраюць збожжа. Бабкі стаяць. Прыватнік? Не, хвойніцкая фабрыка сувэніраў на салому. Адзін са жняцоў — узбэк з Ошаўскай вобласьці. Прыехаў тры гады таму. О, вельмі падабаецца. Дзеці вучаць беларускую мову. Ужо паставіў у доме ваду, газу няма. Не баіцца дзяцей у школу пасылаць. Радыяцыя? Дык яна ўсюды. Вахабіты горшыя за радыяцыю. Дзявятая ранку, а ён ужо выпіўшы. Як і ўсе.

## Ці ёсьць небясьпека

Замежныя інфармацыйныя агенцтвы Беларусь цікавіць толькі як Чарнобыль і Лукашэнка. І, як мы ні ганьбім павярхоўнасьць сучаснага Захаду, па-свойму яны маюць рацыю. Гэта дзьве галоўныя праблемы.

Васіль Несьцярэнка, галоўны канструктар беларускай АЭС, пасьля Чарнобылю стаў катэгарычным праціўнікам атамнае энэргетыкі. Гістарычная заканамернасьць ёсьць і ў тым, што фізік-ядзершчык Станіслаў Шушкевіч стаў кіраўніком постчарнобыльскае Беларусі, а пасьля быў скінуты народам, якому зацяжка было перабудоўвацца на іншы лад і абмяжоўваць сябе.

Аналізуючы ўрокі Чарнобылю, Шушкевіч ня схільны дэманізаваць ні навукоўцаў (прыклад сумленнасьці — акадэмік Лягасаў), ні партыйных кіраўнікоў (першы сакратар Гомельскага абкаму Грахоўскі нахапаўся сьмяротнай дозы радыяцыі, матаючыся па зоне), ні апазыцыі пачатку 90-х, што выкарыстоўвала чарнобыльскую тэму ў папулісцкіх мэтах і паспрыяла траўматызацыі грамадзтва, — безь яе праўда пра Чарнобыль не прагучала б і многія жыцьці не ўдалося б ўратаваць. Шушкевіч нават не дэманізуе інжынэра Дзятлава, які аддаў загад на правядзеньне таго злашчаснага экспэрымэнту на станцыі з мэтай дасягнуць большай эканамічнае эфэктыўнасьці і зьніжэньня сабекошту кіляват-гадзіны энэргіі. Калі ўсё было дзеля перавыкананьня пляну, калі ўсё рашалася ў тагачаснай «вэртыкалі», партыйных структурах, а не спэцыялістамі. Але нават такі памяркоўны чалавек, як Шушкевіч, вельмі крытычна ставіцца да інфармацыйнае блякады чарнобыльскае тэмы. Бо менавіта зь недахопу інфармацыі нараджаецца радыянігілізм.

У апавяданьні Ніны Рыбік «Права на адсяленьне» добра выпісана, як цесна радыянігілізм спалучаецца з радыяфобіяй. Ад першага да другога адзін крок. Гэты крок робіцца, як толькі захварэе нехта блізкі.

## Ніякай панікі

Недаравальна, што афіцыйны дыскурс і дзяржаўныя СМІ культывуюць радыянігілізм. Як ні банальна гучыць, але мы сапраўды ня ведаем да канца, якімі будуць урэшце наступствы доўгатэрміновага ўзьдзеяньня радыяцыі на значную частку беларускае папуляцыі. Нават да канца ня высьветлена, ці радыяцыя правакуе рост саматычных і сардэчных захворваньняў.

Не перастрахоўвацца — злачынна ў дачыненьні да нашчадкаў.

Мае француcкія сябры мяркуюць, што высновы з Чарнобылю не былі б зроблены і на Захадзе і што заходняе атамнае лобі і сёньня зрабіла б усё, каб замаўчаць наступствы, калі б такая аварыя здарылася ў Францыі. Лукашэнка для атамнага лобі — сапраўдная знаходка, бо ў нашай краіне, па якой быў нанесены найбольшы радыяцыйны ўдар, усё пачало несьці ідэалягічную нагрузку, у тым ліку і статыстыка, важны інструмэнт прапаганды, тым часам Чарнобыль пачаў разглядацца як цяжкі перажытак мінулага, які трэба хутчэй забыць.

Фільм Мэрыён Дэлеа пра дзяцей Чарнобылю не пакажуць на БТ. Беларусь — адзіная краіна Эўропы, дзе не пакажуць гэты фільм, уганараваны «Оскарам».

«З 1998 г. не назіраецца тэндэнцыі да росту захворваньняў у дзяцей у забруджаных раёнах. Яна нават на 15% ніжэйшая за сярэднюю ў краіне», — пішацца ў брашуры Дзяркамчарнобылю. Хочацца ў гэта верыць. Чаму тады статыстыка засакрэчаная?

Можна доўга спрачацца, ці Бандажэўскі — вязень сумленьня, ці не, але навуковая супольнасьць прачытала арышт Бандажэўскага як безумоўны знак: маўчыце пра наступствы радыяцыі.

Патрэбная грамадзянская сьмеласьць, каб гаварыць, каб галасаваць у такіх умовах.

# за Лукашэнку

Рэпартаж з краю сьвету

## Расейская рулетка

Радыяцыя на адным нiяк не адбiваецца, другога зжывае са сьвету. З 28 пажарнiкаў, якiя першымi ўступiлi ў двубой з агнём на даху рэактара, жывымi застаюцца 12. Нарадзiлi здаровых дзяцей, усё о'кей.

Мы вандруем па зоне адчужэньня ўтраіх. Адзiн з нас за тры днi набiрае 24 бэкерэлi на кiляграм, другi — 0, трэцi — 9. (20 бк/кг, паводле праф. Бандажэўскага, мяжа дазволенага.) Ямо тое самае, п'ём з адных пляшак. Ну хiба што адзiн зьядае салату з капусты, а другi — селядзец у нараўлянскiм рэстаране. Аднолькава мыем рукi на рэстаранных кухнях — прыбiральнi тут не працуюць.

Платы Лукашэнка паставiў паўсюдна. Капiтальныя дзьверы вартуюць уваход у большасьць дзейных установаў. Новыя крамы гандлююць у асобных пунктах. Туалетаў i iншых гiгiенiчных установаў, прыходзiцца канстатаваць, кiраўнiк дзяржавы не наведвае нiдзе. Мусiць, за iм возяць асабiсты.

Скрозь iдуць вялiкiя дарожныя i будаўнiчыя работы, i адначасова амаль не заўважны iх вынiк. Цi то iдуць яны *per se*, цi то да iх пачатку ўсё было настолькi фатальна.

I сюд-туд вулiцы мятуць стайкi жанчынак зь венiкамi. На газонах — касмэі й бархоткi вясёленькiх колераў, але чэзлага выгляду. Няма соку на дэзактываванай глебе.

Ваенныя помнiкi вычышчаныя i выбеленыя нават у самых блiзкiх да рэактара вёсках. Трохi здароўя камусьцi гэта каштавала.

## А што нам зробiцца

Сярэдняя працягласьць жыцьця хiрасiмскiх хiбакуся нават большая за сярэднюю па iх пакаленьнi ў Японii — дзякуючы выдатнаму мэдычнаму абслугоўваньню. Ня тое з нашымi чарнобыльцамi. У чарнобыльскiх раёнах выслухоўваеш два тыпы гiсторый: як добра тут жылося, пакуль ня сталi адсяляць. I як хто i на што хварэе.

Беларусы ставяцца да ўласнага здароўя, як спартоўцы — да допiнгу. «А што нам зробiцца» i «Ўсе так робяць» — новыя рэгiяналiзмы Ўсходняга Палесься.

Брагiнцы Мiкалай i Галiна сустракаюць нас у калiдоры, застаўленым слоiкамi з кампотамi. Яны расказваюць, а ў тэлевiзары БТ каторы раз паўтарае «Славянскi базар». Iхная дачка перажыла лейкемiю, тры апэрацыi ў Нямеччыне. Пасьля замужжа зрабiла два аборты, бо дактары катэгарычна забаранялi ёй нараджаць. Прайшоўшы праз такое, пра маральныя аспэкты аборту, мусiць, мала задумваешся. Зрабiць трэцi спарон ёй забаранiла Галiна. I вось — расьце хлопчык, яму ўжо год i сем месяцаў. Гэта для яго ўсе гэтыя слоiкi — усё з уласнага гароду, а то скуль жа. Мiкалаю 44, Галiне — 47. У яго белакроўе, у яе — хворыя вочы й сэрца. Яны не афармляюць другой групы iнвалiднасьцi толькi таму, што з групай iх ня возьмуць на працу, а трэба ж дзецям дапамагаць. «Дзiўны ест тэн сьвят…» — пяе ў тэлевiзары Ялфiмаў.

## Вярнуць жыцьцю сэнс

Гарбачову на народ было напляваць, i Мiкалай з Галiнай у 1986-м рачкавалi на моркве ў адселенай зоне — як гэта, каб згнiў ураджай. Элiтакрат Гарбачоў прагнуў захаваць уладу i ўласнасьць за намэнклятурай. Жыцьцё нейкiх палешукоў яго мала хвалявала.

Незалежная Беларусь нейкi час спрабавала гэтых людзей перавучыць, убiць iм у галовы, што пры радыяцыi ранейшы лад жыцьця немагчымы. Сьмялейшыя разьехалiся, рэшта засталася — дэзарыентаваная пераменамi i без надзеi: жыць паранейшаму было страшна, а па-новаму не дазваляла галеча.

Тым часам людзi прызвычаiлiся да паразытызму — бясплатнае дапамогi, бясплатных паездак дзяцей на аздараўленьне. I да радыяцыi, «якая нам ужо ня шкодзiць».

Лукашэнка захацеў вярнуць жыцьцю гэтых людзей сэнс, хаця б стары сэнс. Але як? Заняўшы людзей, вярнуўшы iм працу i заробкi. Трэба аддаць належнае яго рацыяналiсцкаму мысьленьню. Прамысловасьць у раёнах убогая, iнвэстара ў радыяцыю не зацягнеш, дый якасьць працоўнае сiлы — з найгоршых. Тады хай людзi робяць самае простае, тое, што рабiлi iх продкi да саракавога калена, — сеюць жыта. Лукашэнка рашыўся заняць людзей у сельскай гаспадарцы. Лепш радыяцыя, чым беспрацоўе. Бо беспрацоўныя — некiраваныя. Павялiчце ўмалоты i надоi! I ён вярнуў зоне кiраванасьць.



**«Панікёры зьехалі, сьмелыя засталіся», — ганарыцца сабой загадчыца Кіраўскага лясьніцтва.**

## Рыбы i вуды

Апазыцыя абяцае, што пераселiць гэтых людзей у чыстыя зоны, але баюся, што аб гэтым жаданьнi яна змушана забудзе, як толькi прыйдзе да ўлады. Перасяліць усiх адразу Беларусь ня ў сiлах. Новая эўрабеларуская праграма «CORE» ў Столiнскiм, Брагiнскiм, Чачэрскiм i Слаўгарадзкiм раёнах скiраваная на мiкракрэдытаваньне, разьвiцьцё альтэрнатыўных вытворчасьцяў i выхаваньне радыялягiчнае культуры. «Трэба не раздаваць людзям рыбу, а навучыць iх рабiць вуды», — мэтафарай тлумачыць вельмi сучасны i адкрыты старшыня Дзяржкамчарнобылю Ўладзiмер Цалко. У кантэксьце радыялягiчнае культуры гучыць двухсэнсоўна, ды ня гэта галоўнае. Кропля ў моры — гэтая праграма.

Вось што аказалася: простая, здавалася б, iнфармацыя пра тое, што ежа ў краме чыстая, а лес, балота, грыбы, ягады, рыба брудныя, — заскладаная для людзей зь сярэднебеларускiм узроўнем асьветы. Хто з нас ведае, напрыклад, што, калi ў нашым целе не стае калiю, мы набiраем цэзiй, што недастача кальцыю замяшчаецца стронцыем.

Большасьцi жыхароў чарнобыльскай зоны ня хочацца вучыцца цi перавучвацца. Яны ня маюць для гэтага неабходнае мабiльнасьцi і адукацыi. Лукашэнка адзiны iх разумее i гаворыць тое, што яны хочуць пачуць. Называйце гэта легендамi. Называйце гэта новым цемрашальствам. Яны галасавалi i будуць галасаваць за яго. Бо яны безабаронныя, а ён пра iх дбае. Бо iх сагналi з бацькаўшчыны, а ён плацiць iм пэнсii. Бо ў iх заробкi малыя, а ён думае пра людзей.

Мы вяртаемся ў сталiцу. Ля шашы на бiгбордзе замест бiгморды — цытата. «Белая Русь павiнна быць белай, чыстай, прыгожай». А.Р.Лукашэнка.

Чарнобыльскiя тэрыторыi застаюцца чорным дном Беларусi, куды асядае ўсякi асадак i скуль распаўзаюцца сацыяльныя i экалягiчныя праблемы. Сваiх грошай на радыкальнае вырашэньне праблемы чарнобыльскiх рэгiёнаў — поўнае адсяленьне людзей стуль, дзе жыць шкодна, i пераход зь сельскагаспадарчых на прамысловыя вытворчасьцi там, дзе больш варта захаваць паселiшчы, — няма. Расея на Чарнобыль грошай не давала i ня дасьць, бо ня мае. Досыць грошай — трэба мiльярды — ёсьць толькi ў Эўропы. Па-сапраўднаму вырашыць чарнобыльскiя праблемы можна будзе толькi з дапамогай сыстэмных эўрасаюзаўскiх iнвэстыцый. То бок толькi пасьля далучэньня да Эўразьвязу. Гэта значыць пасьля Лукашэнкi. Таго самага, у якога так вераць стралiчаўскiя бабы.




### ФАКТЫ

У зоне наступнага адсяленьня (там, дзе ўзровень забруджаньня перавышае 15 кюры на км², небясьпечны для жыцьця) яшчэ **застаецца 16 тыс. чалавек**, у тым лiку 4 тыс. дзяцей. Летась для адсяленцаў пабудавана **ўсяго 432 кватэры**. Гэта значыць, што адсяленьне расьцягнецца мiнiмум на **12 гадоў**.

**У 2002 г. у 273, а ў 2003 г. — у 214** населеных пунктах фiксавалiся пробы малака з павышаным утрыманьнем цэзiю.

**335 тыс. дзяцей i 63 тыс. дарослых** карыстаюцца правам на бясплатны адпачынак у чыстай зоне. Каштуе гэта бюджэту 46 млн даляраў.

Гомельская вобласьць укамплектавана дактарамi **толькi на 64%**.



**Цэнтральную плошчу Нароўлі па-ранейшаму ўпрыгожваюць прапаганда й лужыны.**



### ЛIЧБЫ

**135 000 чалавек** переселена з забруджаных тэрыторый.

**100 000 чалавек** з адносна забруджаных тэрыторый выехалi сваiмi сiламi.

**$13 млрд** выдаткавала на пераадоленьне наступстваў Чарнобылю Беларусь.

**$200 млн** складаюць выдаткi на чарнобыльскiя патрэбы ў 2004-м.

### СЛОЎНIЧАК ТУЛЬГАВIЧАЎ

**Хвайнiкi** — мясцовая назва Хойнiкаў, увайшлi ў афiцыйныя слоўнiкi пад спольшчаным назовам.

**Рукаты** — з рукамi. «Ён рукаты, ён сам сабраў».

**Пра сьмерць** — на сьмерць, на выпадак сьмерцi. «Я пра сьмерць трымаю сабе iкону».

# Заўтра не надыдзе ніколі

Віталь Тарас

Заўтра мы ўсе зноў пачнём лаяць апазыцыю. За тое, што яна была непадрыхтаваная да рэфэрэндуму, за адсутнасьць прадуманай тактыкі й стратэгіі, за тое, што дэмакратычныя кааліцыі існавалі толькі на словах.

Але дзе пры гэтым будзем мы самі? Як будзем пачувацца: мы асобна, апазыцыя асобна? Зразумела, частка бяз цэлага не існуе. Але ж і цэлае бяз часткі — ужо ня цэлае. Вядома, апазыцыя заўсёды будзе ў меншасьці, на тое яна і апазыцыя. Зразумела, рэвалюцыі заўсёды робіць меншасьць, інакш рэвалюцыі называліся б не рэвалюцыямі, а неяк інакш.

Аднак калі на вуліцы Бялграду на дэманстрацыі пратэсту супраць Мілошавіча выходзіла сто тысяч чалавек — хіба сярод іх былі адны толькі апазыцыянэры? Калі мільёны грамадзян аддалі галасы на прэзыдэнцкіх выбарах за малавядомага датуль Каштуніцу й фактычна сарвалі пляны кіраўніцтва сфальшаваць вынікі — хіба гэта былі галасы толькі апазыцыі?

Меў рацыю Маркс, калі казаў, што ідэя становіцца матэрыяльнай сілай, калі яна авалодвае масамі. Можна крывіць губы ў цынічнай усьмешцы, прыгадваючы лёзунг францускай рэвалюцыі «Свабода, роўнасьць, братэрства!». Можна лічыць гэты лёзунг небясьпечным і шкодным мітам, які каштаваў Францыі мільёнаў жыцьцяў. Але бясспрэчна й тое, што гэтыя словы, падобна да «Марсэльезы», успрымаліся масамі як нешта безумоўна каштоўнае і вартае змаганьня.

Справа ня ў тым, каб выцягваць сёньня на сьвет старыя лёзунгі — можна знайсьці новыя. Справа й ня ў тым, што трэба адчуваць настрой грамадзтва — гэта аксіёма. Грэх беларускай апазыцыі не ў адсутнасьці згаданых чыньнікаў. Значна страшнейшы за гэта грэх нявер'я. Немагчыма патрабаваць ад людзей самаахвярнасьці ці хоць бы актыўнасьці, калі ня верыш ні ў людзей, ні ў самога сябе, ні ў сваіх калегаў па партыі. Калі займацца палітыкай толькі падчас афіцыйных выбарчых кампаній — ад выпадку да выпадку, паміж прыватнымі справамі й партыйнымі справаздачамі, — то нічога й ня ўдасца на выхадзе. Калі чуеш ад вядомага палітыка, што выбары далі яму цудоўную магчымасьць паразмаўляць зь людзьмі ў якасьці зарэгістраванага кандыдата ў дэпутаты, бо ў іншы час яго проста арыштавалі б, то разумееш: беларуская апазыцыя самая сьціплая ў сьвеце.

Прынцып «Галоўнае не перамога, а ўдзел» даўно ўжо ня дзейнічае нават на Алімпійскіх гульнях. Каб прыстойна выступіць, трэба мець сучасную сыстэму сэлекцыі й падрыхтоўкі спартоўцаў, найноўшыя мэтодыкі й абсталяваньне. Але самае галоўнае — гэта тое, што называецца спартовай злосьцю. Безь яе, без настрою змагацца да самага фінішу няма сэнсу выходзіць на спартовую арэну, ня кажучы пра палітычную. Заўзятары тонка адчуваюць фальш. Яны даруюць любімай камандзе паразу, але не імітацыю барацьбы.

Але што зробіш, калі частка апазыцыі ў якасьці свайго роду нацыянальнага спорту выбрала маханьне кулакамі пасьля бойкі. Сярод іншых падобных мэтадаў барацьбы за перамогу можна згадаць таксама апэляцыю да міжнародных арбітраў.

Так, апазыцыі даводзіцца ўвесь час працаваць ва ўмовах калясальнага прэсінгу ўлады, якая гуляе па ўласных правілах ды яшчэ з гандыкапам. Нельга ўявіць больш абсурдных абвінавачаньняў у яе бок, чымся абвінавачаньні ў нейкіх тэрарыстычных памкненьнях, як гэта робіць афіцыйная прапаганда. Параўнаньні беларускіх апазыцыянэраў з чачэнскімі ваяўнікамі ці з актывістамі IRA або ETA не вытрымліваюць крытыкі. І дзякаваць Богу, між іншым. Адсутнасьць фанатызму — рэлігійнага і ўсялякага іншага, інтэлігентнасьць і адсутнасьць агрэсіўнасьці ў апазыцыі ў іншых умовах можна было б лічыць перавагай. Дзеля справядлівасьці варта зазначыць, што менавіта савецкая дзяржава, у вернасьці ідэалам і прынцыпам якой клянецца прэзыдэнт Беларусі, стваралася фанатыкамі й тэрарыстамі найвышэйшай маркі. Хіба «эксы», якімі займаўся, напрыклад, «легендарны» Камо, не былі тэрактамі? І хіба яго паплечнік Фэлікс Дзяржынскі, юбілей якога ўрачыста адзначаўся нядаўна ў горадзе, што носіць яго імя, у прысутнасьці прэзыдэнта Беларусі й чэкістаў краін СНД, ня быў адэптам рэвалюцыйнага тэрору? Выраз «чырвоны тэрор», дарэчы, не гісторыкі прыдумалі, а самі бальшавікі на чале зь Леніным. Маштабы тэрору чэкістаў супраць айчынных капіталістаў, а заадно пралетароў і сялян, а таксама агентаў сусьветнага імпэрыялізму былі такія, што Асама бэн Ладэн мусіў бы пазелянець ад зайздрасьці (хоць і зрабіць гэта пад зялёным сьцягам ісламу даволі цяжка).

Варта нагадаць таксама, што стваральнік першай у сьвеце Краіны Саветаў разам з паплечнікамі ня грэбаваў атрымліваць замежную дапамогу дзеля справы партыі. І прытым грошы былі ня проста ад нейкіх дабрачынных спонсараў — ад нямецкага генэралітэту, які разьлічваў такім чынам нанесьці паразу Расеі ў вайне. Але ўсё, што працавала на перамогу сусьветнай рэвалюцыі і на карысьць саміх бальшавікоў, яны лічылі маральным. Тут яны былі ня першыя й не апошнія. Ірляндзкія незалежнікі, напрыклад, рэальна разьлічвалі на фінансавую дапамогу фашысцкай Нямеччыны ў барацьбе з Брытаніяй.

Няможна, напэўна, знайсьці ў найноўшай гісторыі прыклад, каб апазыцыя ў барацьбе з рэакцыйнымі рэжымамі ці за нацыянальнае вызваленьне зусім не карысталася падтрымкай звонку. Іншая рэч, што ніколі яна не была дый не магла быць вырашальным фактарам. Можна купіць карумпаваных палітыкаў, генэралаў, чынавенства, але ніхто ня здольны купіць народ у цэлым. І ня толькі з прычыны непад'ёмных выдаткаў. А проста таму, што купленая такім чынам падтрымка нічога ня вартая. Некалі здавалася, што кандыдаты ад «блёку камуністаў і беспартыйных» на выбарах у СССР заўсёды будуць мець свае 99,9 працэнта галасоў — дастаткова, каб на выбарчых участках былі танная каўбаса, піва ды апэльсыны. Народ сапраўды «Жыгулёўскае» піў, апэльсыны жор, але на першых жа вольных выбарах любімае камуністычнае кіраўніцтва здаў. Гэтаксама беларусы «здалі» Кебіча разам з тагачаснай намэнклятурай. Аднае толькі незадаволенасьці ўмовамі жыцьця і ў першым, і ў другім выпадку было мала. Народ мусіў мець альтэрнатыву, і дзесяць гадоў таму такой альтэрнатывай яму падаўся Лукашэнка.

> Народ «Жыгулёўскае» піў, апэльсыны жор, але на першых жа вольных выбарах любімае камуністычнае кіраўніцтва здаў.

Ці ёсьць альтэрнатыва цяпер? Трэба прызнаць, што сытуацыя выглядае значна горш, чым дзесяць гадоў таму, і яна, відаць, будзе пагаршацца. Бо за ўсё ў гісторыі трэба плаціць. У тым ліку за незалежнасьць, якая раптоўна звалілася на Беларусь. Гэта толькі здавалася, што можна карыстацца гэтым неспадзяваным дарункам, не ахвяруючы нічым узамен. Насамрэч за гэтую «безахвярнасьць» народу ўжо давялося заплаціць вельмі высокую цану. Гэта тое, што мы атрымалі за дзесяць гадоў «разьвіцьця», — паўфэадальны сацыялізм азіяцкага кшталту, неэфэктыўная карумпаваная эканоміка, адсутнасьць нармальнай пэрспэктывы. Народ ахвотна ўхіліўся ад цяжкай працы пабудовы незалежнай дзяржавы, аддаўшы нацыянальную ідэю на водкуп аднаму чалавеку, які зрабіў сувэрэнітэт крыніцай сваёй улады, а саму краіну — асабістай уласнасьцю. Апазыцыя даволі хутка і незаўважна сама для сябе перайшла на другія ролі ў пытаньні, дзе яшчэ нядаўна заставалася духоўным лідэрам. Нават Беларускі народны фронт вуснамі сваіх лідэраў голасна заявіў аб падтрымцы палітыкі Лукашэнкі, што да абароны дзяржаўнага сувэрэнітэту. Такім чынам, засталося толькі прызнаць, што крыніцай сувэрэнітэту зьяўляецца не народ, а правіцель, які ўзурпаваў права гаварыць ад імя народу. Мабыць, стратэгічныя мэты нацыянальна сьвядомай апазыцыі й кіраўніка дзяржавы супалі і ў іх застаюцца толькі асобныя разыходжаньні ў тэрміналёгіі ды артаграфіі беларускай мовы? Які ж тады застаецца ў выбарцаў выбар?

З другога боку, колькі можна гаварыць пра акупацыю й задушэньне беларушчыны? Што гэта за акупацыя, калі пераважная большасьць «акупаваных» гаворыць на мове «акупантаў» і нават чуць ня хоча, каб родныя дзеці вывучалі матчыну мову? Хутчэй, гэта можна назваць добраахвотным рабствам. Расплата за яго, як ужо гаварылася, — страта нацыянальнай саматоеснасьці, веры ў будучыню, усеагульная апатыя, духоўная распуста й маразм. Беларусы па-ранейшаму адчуваюць сябе ў сваім доме не гаспадарамі, а ў найлепшым выпадку гасьцямі, якіх пусьцілі пераначаваць ды яшчэ далі выпіць і закусіць. Еж, што даюць, гуляй — пакуль гаспадар добры. З такімі настроямі прагаласуем мы на гэтых выбарах, хутчэй за ўсё, не за апазыцыю і не за начальства, але зноў за саміх сябе — пакорлівых, абыякавых, ніякіх…

Герой аднаго фантастычнага фільму, прачнуўшыся аднойчы раніцай, убачыў, што на календары ўчарашні дзень. У яго зьявілася магчымасьць перажыць яго занава, выправіць усе свае памылкі, зробленыя напярэдадні. Але шматлікія спробы перайначыць мінулае вялі толькі да новых, яшчэ горшых памылак. І ўчарашні дзень паўтараўся зноў і зноў, бясконца. Нарэшце, герой зразумеў: для таго, каб зламаць волю абставінаў, недастаткова жыць днём сёньняшнім ці нават ведаць будучыню. Галоўнае — мець волю зьмяніцца самому. Інакш заўтра не надыдзе ніколі.

## Мяне не заганяць

Зьвярнуцца да вас прымусіў мяне наступны выпадак, які, думаецца, тыповы для сёньняшняга часу. Я працую ў мэдыцынскай установе Менску. На чарговай паліклінічнай канфэрэнцыі 8 кастрычніка галоўны доктар зьвярнуўся да супрацоўнікаў з хвалюючай прамовай. Сказаў прыкладна наступнае: «Я ўсіх заклікаю да ўдзелу ў датэрміновых выбарах у ППНС і ў рэспубліканскім рэфэрэндуме. Пасьля таго, як вы датэрмінова прагаласуеце, вам на выбарчым участку дадуць паперу. Гэты квіток вы павінны мне асабіста прынесьці. Ваша датэрміновае галасаваньне я буду расцэньваць як лаяльнасьць да галоўнага доктара, і гэта будзе ўлічана пры заключэньні кантракту». Супрацоўнікі крыху пагулі ў знак абурэньня, і канфэрэнцыя працягвалася далей.

Я пішу гэты ліст для таго, каб падобныя факты прымусу з боку кіраўніцтва на супрацоўнікаў да ўдзелу ў датэрміновых выбарах мелі канкрэтныя адрасы. Удзельнічаць у датэрміновых выбарах я не зьбіраюся.

**Ірына Чатырка, inbox.ru**

P.S. Калі пасьля працоўнага дня я прыйшла дахаты, мой сын, вучань чацьвёртага клясу, сказаў, што настаўніца прасіла перадаць бацькам, каб яны прыйшлі на выбарчыя ўчасткі… не, не 17 кастрычніка, а раней…

## Так клапаціцца яшчэ трэба ўмець

Насуперак усім законам прыроды асеньні Менск не спакойны: паўсюдна адчуваецца броўнаўскі рух. На павестцы — рэфэрэндум. Горад увесь расклееты й размаляваны — літаральна на кожным кроку агромністыя плякаты; і не саромеюцца, малююць выбарчыя бюлетэні й мэтровымі літарамі пішуць «За»!

Зайшоў у адзін з кінатэатраў зірнуць, што за фільмы ідуць, — дык там ледзьве не самлеў — на чатырох мэтрах вісіць плякатаў з 15. Прычым зусім ня выбары ў ПП анансуюць, а рэфэрэндум. І ўсё за аднаго кандыдата. Памер плякатаў — ня ў кожнага дома тэлевізар з такім кінэскопам стаіць…

Гледзячы на сваіх аднагрупнікаў, з жахам уяўляю, што магло б быць, калі б унівэрсытэт знаходзіўся ня ў Менску і я б у такім разе апынуўся ў ролі іншагародніка… З адзінаццаці такіх у маёй групе інтэрнат далі дваім, прычым апошняму зусім нядаўна і з такімі «баямі»… А з інфармацыйных стэндаў так весела ўсьміхаюцца маладзёны!

А калі ўбачыў такое буйства фарбаў на сьценах кінатэатру, міжволі падумалася: у колькі грошай абышлася (і абыходзіцца!) такая паліграфія вышэйшай якасьці? У колькі сапраўды патрэбных краіне рэчаў гэтыя грошы можна было ўкласьці!..

**Алесь Квіткевіч, Менск**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

Мінінфармацыі 20 верасьня прыпыніла на 3 месяцы выхад газэты **«Молодёжный проспект»**. 4 кастрычніка ў в.Крупіца падчас распаўсюду ўлётак затрыманыя **Генадзь Таляронак**, **Аляксей Сычык**, **Аляксей Рамадан**. Падчас прыезду Лукашэнкі ў Глыбокае 5 кастрычніка быў затрыманы назіральнік грамадзянскай ініцыятывы «Партнэрства» **Андрусь Храпавіцкі**. Ленінскі суд Менску 5 кастрычніка пастанавіў спагнаць з газэты **«Народная воля»** 840 тыс. руб. у якасьці кампэнсацыі судовых выдаткаў ТАА «Альянс-Мэдыя», што належыць С.Атрошчанку. 5 кастрычніка адміністрацыйныя камісіі аштрафавалі давераных асобаў кандыдата Рыгора Костусева (ПБНФ) **Аляксандра Шчарбака** (Шклоў), **Рыгора Вырвіча** (Бялынічы) — кожнага на 5 б.в. 5 кастрычніка ў Барысаве міліцыянты ўчынілі бяз ордэруператрус у гаражы **Юрыя Шапчыца**, даверанай асобы кандыдата Віктара Гарбачова (АГП). У Полацку 6 кастрычніка пазбавілі рэгістрацыі кандыдатку **Алену Сом** (ПБНФ). 6 кастрычніка вынесьлі папярэджаньне кандыдатам ад ПБНФ **Сяргею Салашу** (Барысаў), **Алесю Міхалевічу** (Менск). Праваабаронцу **Тацяну Рэвяку** аштрафавалі 6 кастрычніка на 5 базавых велічынь за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак. У Берасьці кандыдата **Андрэя Сумара** 6 кастрычніка адлічылі са студэнтаў Берасьцейскага дзяржаўнага тэхнічнага ўнівэрсытэту. Актывістка «Зубра» **Маргарыта Анцілеўская**, зьбітая міліцыянтамі, 6 кастрычніка падала скаргу ў пракуратуру. Намесьніку старшыні АГП **Аляксандру Дабравольскаму** 6 кастрычніка вынесьлі папярэджаньне, а 11-га разам з **Валянцінай Палевіковай** пазбавілі рэгістрацыі кандыдатаў. У Магілёве актывіста «Зубра» **Максіма Дварэцкага** 6 кастрычніка звольнілі з працы ў абласным упраўленьні Міністэрства па надзвычайных сытуацыях. Пасьля першага ж нумару, датаванага 6 кастрычніка, Мінінфармацыі на 3 месяцы прыпыніла выхад газэты **«Неделя»**. 6 кастрычніка ў Менску былі затрыманы памочнікі кандыдата Юр'я Хадыкі (ПБНФ) **Ларыса Ляпарская**, **Сяргей Шынкевіч** і **Віктар Лісоўскі**. У Гомелі 6 кастрычніка міліцыянты затрымалі машыну старшыні мясцовай філіі БХК **Алеся Яўсеенкі** й канфіскавалі 30 тыс. асобнікаў бюлетэню ГІ **«Партнэрства»**. У Гомелі 7 кастрычніка ў офісе **ГА «Прававая ініцыятыва»** міліцыянты наладзіліператрус. Намесьніца старшыні АГП, кандыдатка **Людміла Гразнова** 7 кастрычніка атрымала папярэджаньне ад акруговай камісіі. Адміністрацыя Барысаўскага заводу аўтатрактарнага абсталяваньня 7 кастрычніка звольніла з працы актывіста РЭПАМ **Віктара Каўбаску**. Сябру АГП **Зьмітру Шкулькову** 7 кастрычніка, на наступны дзень пасьля адмовы ў рэгістрацыі кандыдатам, міліцыянты вярнулі канфіскаваны раней кампутар. На 10 сутак 8 кастрычніка быў асуджаны ў Віцебску за непадпарадкаваньне міліцыянтам **Валер Шчукін**, затрыманы 7 кастрычніка за раздачу ўлётак. Кандыдат па Менскім раёне ад ПБНФ **Юрась Зянковіч** 8 кастрычніка атрымаў ліст ад падатковай інспэкцыі з прадпісаньнем падаць да 8 кастрычніка дэклярацыю аб падатках за 2001—2003 г. Суд Шчучынскага раёну 8 кастрычніка вынес папярэджаньне кандыдату **Аляксандру Мілінкевічу**. Кандыдату ад ПБНФ **Віктару Раманішку** 8 кастрычніка ў рэчыцкай друкарні сапсавалі перадвыбарныя ўлёткі. Студэнтка Гомельскага дзяржунівэрсытэту **Юлія Сівец** 8 кастрычніка падала скаргу на адміністрацыю ВНУ, якая перашкаджае ёй выконваць абавязкі даверанай асобы кандыдата Алеся Карніенкі. Магілёўскі гарвыканкам 8 кастрычніка адмовіўся паставіць на ўлік мясцовую філію прафсаюзу **РЭПАМ**. Блізу Хойнікаў 8 кастрычніка быў затрыманы кандыдат па акрузе **Леанід Судаленка** (АГП) — у яго канфіскавалі перадвыбарныя ўлёткі, а самога пад эскортам ДАІ выдалілі з раёну. Маладэчанская друкарня 8 кастрычніка выпусьціла ўлёткі кандыдата ад АГП **Уладзімера Малярчука** без указаньня накладу. У Віцебску падчас палітычнага пэрформансу 8 кастрычніка затрымалі **Барыса Хамайду**. 8 кастрычніка міліцыянты наладзіліператрус у сядзібе **ГА «Сузор'е»** (Берасьце) і канфіскавалі ўлёткі кандыдата ад ПБНФ Зьмітра Шыманскага. У Наваполацкім офісе **«Партнэрства»** 8 кастрычніка адбыўсяператрус: міліцыянты канфіскавалі ўсю знойдзеную літаратуру, дакумэнты і дыскі з інфармацыяй, затрымалі кіраўніка філіі **Алега Пашкевіча**. Падчас расклейкі ўлётак 9 кастрычніка ў Менску быў затрыманы **Юры Чавусаў**. На мітынгу 10 кастрычніка ў Менску былі затрыманы сябар ПКБ **Уладзімер Карпухін**, а таксама «маладафронтаўцы» **Барыс Гарэцкі** й **Зьміцер Дашкевіч**, прэвэнтыўна затрымалі намесьніка старшыні ПБНФ Віктара Івашкевіча, у якога канфіскавалі плякаты й сьцягі. У Гомелі пасьля мітынгу 10 кастрычніка быў затрыманы легкавік сябра АГП **Уладзімера Кацоры**. Кандыдатку ад ПБНФ **Ніну Кавалёву** ды ейную давераную асобу **Лявона Панкрацэнку** 10 кастрычніка затрымалі ў Віцебску падчас агітацыйнай акцыі. Мінюст 11 кастрычніка адхіліў скаргу **АГП** наконт незаконнасьці ліквідацыі Васьняцоўскай нізавой арганізацыі ў Менску. У Барысаве 11 кастрычніка актывісту «Зубра» **Аляксандру Казакову** прысудзілі 10 сутак арышту за распаўсюджваньне кнігі Паўла Шарамета і Сьвятланы Калінкінай «Выпадковы прэзыдэнт». 11 кастрычніка ў Віцебску за распаўсюд улётак затрымалі непаўналетняга **Вячаслава Андрэева**.

**АШ**

# Жыцьцё наладжваецца

**Усе маюць намер галасаваць на рэфэрэндуме station... станоўча. Лёгіка простая: пэнсій хапае на жыцьцё ды выпіўку. Супраць — вясковая інтэлігенцыя і прадпрымальнікі.**

Абы не сурочыць, але ў параўнаньні зь летам жыцьцё ў Раёўцы пакрысе наладжваецца. Адна фірма выкупіла фабрыку. Працуе на ёй пакуль каля дзясятка чалавек — робяць скрынкі з гафраванага кардону. Аднак новыя ўладальнікі абяцаюць пад канец восені запусьціць цэх па вытворчасьці кардону, а пазьней запусьціць і лесапілку. А пакуль выплацілі людзям грошы за некалькі месяцаў. Некаторым — па 300 тысяч рублёў. Для многіх гэта шалёныя грошы, бо на біржы працы атрымлівалі па 30—40 тыс.

Вяскоўцы таксама дарма часу не гублялі. У верасьні езьдзілі на бульбу. Суседні саўгас пастанавіў наступным чынам: дзесяць мяхоў выбіраеце, адзін сабе. Ня хочаш бульбы — бяры зернем. У канкурэнта-фэрмэра ўмовы былі іншыя: дзень аплачваўся шасьцю тысячамі ды

> Саўгас пастанавіў наступным чынам: дзесяць мяхоў выбіраеце, адзін сабе. У канкурэнта-фэрмэра ўмовы былі іншыя: дзень аплачваўся шасьцю тысячамі ды вядром бульбы.

вядром бульбы. Калі фэрмэр убачыў, што людзі больш ахвотна езьдзяць у саўгас, падняў «грашовы» заробак да дзевяці тысячаў. Да таго ж, час ад часу дажджыла, ля поля пастаянна дзяжурыў ягоны аўтобус — каб людзі не моклі дарэмна.

Зазначу, што і саўгасны, і «прыватны» аўтобусы ад'яжджалі ранкам ад месца збору запоўненымі.

Так што вяскоўцы ня толькі падзарабілі, але й забясьпечылі бульбай суседзяў.

Што да выбараў, то агітацыі амаль ніякай. Толькі пару абадраных улётак на вокнах крамы. Ніхто з кандыдатаў пакуль да вёскі не дабраўся, і людзі ня ведаюць нават прозьвішчаў патэнцыйных дэпутатаў. А пра альтэрнатыўную думку і гаворкі няма. Як за маёй памяцьцю, то апошнім разам дэмакраты завітвалі ў вёску зімой 1994/1995. Былі гэта паплечнікі Зянона Пазьняка. На палову тысячы жыхароў — толькі пяць падпісчыкаў «Народнае волі» і столькі ж — ужо закрытай «Рэгіянальнай газеты».

Абсалютна ўсе маюць намер галасаваць на рэфэрэндуме станоўча. Лёгіка простая: пэнсій, а палова жыхароў — пэнсіянэры, хапае на жыцьцё ды яшчэ на выпіўку ёсьць. Тых, хто будзе галасаваць супраць, можна пералічыць на пальцах — вясковая інтэлігенцыя. А таксама прадпрымальнікі, якіх душаць падаткамі. А Лукашэнкава «вета» на заробак у капэртах выклікае ў іх здаровы сьмех.

**Алег Раявец, Раёўка (Маладачаншчына)**

# Навошта школе грамадзянская адукацыя

Тамара Мацкевіч

**Легенда, што наша сыстэма адукацыі — найлепшая ў сьвеце, бурыцца вельмі лёгка. Досыць задумацца, чаму пасьля ВНУ немагчыма знайсьці працу? Чаму рынак патрабуе людзей «з досьведам працы», гэта значыць перавучаных пасьля нашай адукацыі? Чаму беларус, які лёгка разгадвае крыжаванкі на трох мовах, падчас выбараў у парлямэнт арыентуецца на нейкага «незалежнага кандыдата»? Няўжо ён ня ведае, што партыі ва ўсім сьвеце ствараюцца дзеля таго, каб у палітыку не прыйшлі непрадказальныя, незалежныя ад выбаршчыкаў людзі? У суседняй жа Латвіі ў парлямэнце няма ніводнага беспартыйнага дэпутата! І наагул, якіх ведаў не хапіла нашай адукаванай нацыі, каб зразумець, што краінай павінны кіраваць кваліфікаваныя прыстойныя людзі, а Канстытуцыя — гэта асноўны закон, у тым ліку і для прэзыдэнта? Усе гэтыя пытаньні тычацца зьместу адукацыі. Ён, на жаль, далёкі ад патрэбаў часу, ад сусьветных ды эўрапейскіх стандартаў. Зьмяніць зьмест навучальных праграм у нашых умовах нашмат цяжэй за Канстытуцыю. Таму гаворка далей пойдзе пра тое, што мы можам і павінны зьмяніць, — пра грамадзянскую і патрыятычную адукацыю.**

Паводле дасьледаваньняў НІСЭПД (верасень 2003), 40% дарослага насельніцтва хацелі б кудысьці эміграваць. Найбольш схільныя зьмяніць краіну пражываньня маладыя адукаваныя беларусы — выпускнікі сярэдніх і вышэйшых навучальных установаў (больш за 75%). Такі высокі эміграцыйны патэнцыял прынята тлумачыць сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі прычынамі: большасьць з апытаных незадаволеныя разьвіцьцём дэмакратыі ў краіне, станам правоў чалавека, адсутнасьцю палітычных ды эканамічных свабод. І слова «стабільнасьць», якім так ганарацца нашы цяперашнія ўлады, для гэтых людзей азначае стабільную немагчымасьць наладзіць нармальнае годнае жыцьцё на Радзіме.

Аднак нежаданьне прыкладаць намаганьні, каб зьмяніць сытуацыю да лепшага ў сябе дома й будаваць сваю будучыню на Радзіме, цяжка растлумачыць толькі эканамічнымі прычынамі. Тое, што каля трох мільёнаў людзей упэўнены, што для пасьпяховай кар'еры лепш паехаць за мяжу, тлумачыцца элемэнтарнай грамадзянскай неадукаванасьцю гэтых людзей. На жаль, сярод іх ёсьць вялікі адсотак бацькоў, настаўнікаў, якія шчыра хочуць навучыць сваіх дзяцей, як і дзе знайсьці лепшую долю, тым самым пазбаўляючы пэрспэктывы ня толькі іх, але й краіну.

Грамадзянская адукацыя — гэта адукацыя грамадзяніна сваёй краіны. Галоўнаю мэтаю сыстэмы адукацыі любой краіны ёсьць фармаваньне грамадзяніна-патрыёта. Бяз гэтага немагчыма існаваньне самой дзяржавы.

Пасьля 1991 г. ва ўсіх постсавецкіх краінах адукацыя атрымала першачарговую замову ад дзяржавы — выканаць сваю сацыякультурную місію фармаваньня нацыі. На жаль, наша сыстэма адукацыі гэтай місіі яшчэ ня выканала (альбо яшчэ не атрымала замовы), пра што сьведчаць вынікі сацыялягічных дасьледаваньняў, прыведзеных вышэй. Без патрыятычнага й грамадзянскага выхаваньня, без арыентацыі на нацыянальныя інтарэсы наша адукацыя траціць сэнс. Яна накіраваная на бясплатную падрыхтоўку кваліфікаваных маладых кадраў для іншых дзяржаў, але ніякім чынам не спрыяе паляпшэньню становішча ў сябе дома.

Зьвернемся да тэорыі, каб лепш зразумець, што павінна быць закладзена ў падмурак патрыятычнага выхаваньня.

Амэрыканскі псыхоляг Абрагам Маслоў вызначыў пяць груп базавых патрэбаў, якія зьвязаны ў пэўную гіерархічную залежнасьць. Паводле Маслоў, гіерархія выглядае так: фізіялягічныя патрэбы (1-ы ўзровень), патрэбы ў бясьпецы (2-і ўзровень), патрэбы ў сацыяльным аб'яднанні і ўзаемінах (3-і ўзровень), яшчэ вышэй ідуць патрэбы ў ацэнцы й павазе — прэстыж, статус, прызнаньне, увага, гонар (4-ы) і патрэбы ў самаактуалізацыі (5-ы).

Кожны чалавек мае права выбіраць месца жыхарства й месца працы, але грамадзянская адукацыя вучыць яго рабіць гэта сьвядома й адказна. Ці ўсьведамляе наша моладзь, што задаволіць нават ніжэйшыя патрэбы, да якіх Абрагам Маслоў адносіць першыя тры ўзроўні, можна толькі на Радзіме? Калі чалавек накормлены й не адчувае небясьпекі, яму як паветра патрэбне не хапаць сяброў, аднадумцаў, пачуцьця еднасьці, далучанасьці да супольнасьці, павагі, а потым і статусу, прызнаньня, гонару, разуменьня.

Чалавек пачынае надзвычай востра адчуваць гэтыя патрэбы. Ён хоча гэтага больш за ўсё на сьвеце й звычайна абсалютна забываецца на тое, што ў час, калі ён быў галодны, пачуцьцё прыналежнасьці да «сваіх», паважныя адносіны — ўсё гэта адмяталася. «Немагчымасьць задавальненьня гэтых патрэбаў звычайна зьяўляецца прычынай шматлікіх расстройстваў і больш сур'ёзных псыхічных паталёгій», — сьцьвярджае Маслоў.

Адна з задачаў грамадзянскай адукацыі — давесьці гэтыя тэарэтычныя высновы да патэнцыйных эмігрантаў, каб яны задумаліся, ці настолькі яны галодныя тут, каб ахвяраваць сваёю будучыняй.

Ёсьць яшчэ адна праблема, якую мы атрымліваем, калі не надаём патрэбнай увагі грамадзянскай адукацыі ў школе.

Насаджэньне «правільнай ідэалёгіі» й прымусовае стварэньне псэўдапатрыятычных арганізацый дыскрэдытуе само паняцьце «патрыятызм», якое асацыюецца зь бясплатнымі дыскатэкамі. Да гульні ў патрыятызм дадаецца ўстарэлы зьмест праграм, які не забясьпечвае ведаў, якіх патрабуе жыцьцё. Як вынік, нашы дзеці растуць наіўныя, выходзяць з навучальнай установы ў ружовых акулярах і думаюць, што, калі яны вырвуцца за мяжу з багажом назапашанай энцыкляпэдычнай інфармацыі, там іх чакае рай. Першыя ж праблемы лёгка выбіваюць з каляіны інфантыльных, непадрыхтаваных да жыцьця людзей, нават калі ў іх адны «дзясяткі» ў атэстацы.

Галоўная мэта грамадзянскай адукацыі — даць вучню неабходныя кожнаму чалавеку веды й уменьні, якія дапамагаюць яму арыентавацца ў жыцьці, у сьвеце палітычных падзей, адстойваць свае інтарэсы ды бараніць правы ў розных сытуацыях.

Сёньня перад нашай краінай стаіць вельмі актуальная праблема — кансалідацыя грамадзтва дзеля дэмакратычных пераўтварэньняў, далучэньня Беларусі да эўрапейскай культурнай, інфармацыйнай ды эканамічнай прасторы. Яна можа быць вырашана пры ўмове, што актыўныя, адукаваныя беларусы ня будуць разглядаць варыянт эміграцыі як адзіны шлях паляпшэньня ўласнага жыцьця. І грамадзянская адукацыя павінна адыграць у гэтым працэсе вядучую ролю.



**Тамара Мацкевіч — каардынатарка праграмы «Настаўнік. Школа. Грамадзтва» грамадзкага аб'яднаньня «Цэнтар «Супольнасьць»**

> Без арыентацыі на нацыянальныя інтарэсы адукацыя накіраваная на бясплатную падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў для іншых дзяржаў, але не спрыяе паляпшэньню становішча ў сваёй краіне.

> Свае патрэбы ў камунікацыі і статусе чалавек паўнавартасна рэалізуе толькі на радзіме.

## Фуражка сяржанта

Едучы ў мэтро, бачыў мянта-сяржанта, дык у яго фуражка знутры абклееная зуброўскімі налепкамі. Вэрсіі:

1) рысоўка трафэямі (накшталт вушэй віетнамцаў, засечак на вінтоўцы, нямецкіх запальнічак);
2) падпольная пазыцыя дзяржслужбоўца (на налепках рэкляма сайту «Zakolebal.org»);
3) утылітарнае ўжываньне матэрыялу (уцяпленьне галаўнога ўбору);
4) камбінацыя пунктаў 1—3.

Вашы варыянты?

**ВК, Менск**

## «Вучыся, студэнт, а то прэзыдэнтам станеш»

Акруговая камісія 110-й Партызанскай акругі Менску вынесла папярэджаньне намесьніцы старшыні АГП Людміле Грызновай. Членам камісіі не спадабаўся зьмест лістовак Л.Грызновай. Асабліва незадавальненьне выклікала фраза «Вучыся, студэнт, а то прэзыдэнтам станеш».

**Лібэрал**

## Ніякай свабоды

Менскі аблвыканкам вызначыў пералік свабодных гандлёвых плошчаў у Слуцку — па дзесяці адрасах, — дзе жадаючыя займець офіс ці прыватную краму могуць атрымаць у часовае карыстаньне месцы. Першы аўкцыён па продажы плошчаў адбудзецца ў другой палове кастрычніка. Ці можна ўявіць сабе нешта падобнае ў суседняй Польшчы, каб кіраўніцтва ваяводзтва давала дазвол мясцовым уладам на тое, якія плошчы ім можна вызначаць на аўкцыён? А ў нас у глыбінцы, выходзіць, выканкамы пазбаўлены права вызначаць, што і дзе лішняе прадаць на тым жа аўкцыёне. Там, у суседзяў, за мяжой, магазыны прыватныя, а тут амаль усе пакуль дзяржаўныя.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

* * *

Мне падабаецца Ваша газэта, але ж бачу адну праблему: на жаль, вы зашмат выкарыстоўваеце маскоўскамоўных «аналітыкаў», «палітыкаў» і г.д., якія кажуць толькі тое, што патрэбна дзеля іх мэтаў. Мы ўсе, замежныя беларусы, стаміліся ад маскоўскіх «аналітыкаў», яны ж нас за поўных дурняў трымаюць.

**Яўген Францішак Літвін, Стакгольм**

ІНІЦЫЯТЫВА

## За беларусізацыю МТС

Моладзевая ініцыятыва «Вока» сумесна з Таварыствам беларускай мовы распачала акцыю па зборы подпісаў за беларусізацыю кампаніі «МТС», якая называе сябе галоўнай беларускай кампаніяй сотавай сувязі, але нічога ня робіць па-беларуску.

У зваросе, пад якім пакідаюць свае подпісы абанэнты «МТС», згодныя зь неабходнасьцю беларусізацыі, сказана: «Мы, абанэнты «МТС», патрабуем забясьпечыць нам доступ да аўтаматычнай службы сэрвісу абанэнта, інтэрнэт-сыстэмы сэрвісу абанэнта на дзяржаўнай **беларускай** мове, а таксама магчымасьць атрымліваць SMS-паведамленьняў ад Вашай кампаніі на нашай **роднай** мове. Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусь гарантуе нам права карыстацца роднай мовай, а стварэньне перашкод і абмежаваньняў у карыстаньні ёю цягне за сабой адказнасьць паводле артыкулу 1722 Адміністрацыйнага кодэксу Рэспублікі Беларусь».

Збор подпісаў ідзе поўным ходам, і ўсе ахвотныя могуць узяць удзел у гэтай акцыі. Для гэтага трэба напісаць ліст на адрас **voka@date.by**, у якім выказаць адпаведнае жаданьне. Таксама Вы можаце самі раздрукаваць **блянк для збору подпісаў (www.voka.tk)**, назьбіраць іх і даслаць на адрас: а/с 104, 220006, г.Менск (Алесю).

**Алесь Мазанік**, каардынатар моладзевай ініцыятывы «Вока»

УДАКЛАДНЕНЬНІ

У артыкуле «Каляровыя сны Дунечкі» (№36) дапушчаная прыкрая недакладнасьць. Актор Аляксандар Маўчанаў у фільме «Яшчэ пра вайну» ня грае. Прыношу свае прабачэньні.

**Андрэй Расінскі**

У №37 у артыкуле «Кардынал веры» прайшла памылка: кардынал Казімер Сьвёнтэк зьяўляецца грамадзянінам Беларусі і, адпаведна, усе дакумэнты падпісвае сам як арцыбіскуп Менскі й Магілёўскі і як старшыня Канфэрэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

## Выставы, імпрэзы

**Дзіцячы малюнак**

На сядзібе БНФ «Адраджэньне» ідзе выстава дзіцячага малюнку «490 гадоў вялікай перамогі пад Воршай». Кіраўнік — Мікола Купава.

**Мацьвей Басаў**

**Да 2 лістапада** ў нацыянальным музэі гісторыі і культуры Беларусі працуе экспазыцыя прац Мацьвея Басава. Квіткі: 2000.

**Ілюзія часу**

**Да 31 кастрычніка** ў музэі Акадэміі мастацтваў (пр. Ф.Скарыны, 81а) — выставачны праект «Ілюзія часу». Гэта вынік супрацоўніцтва нямецкіх, беларускіх і францускіх мастакоў. Сярод удзельнікаў — Юры Алісевіч, Міхал Баразна, Багдан Канопка (Францыя), Цім Ульрыхс (Германія) і інш. У лістападзе **(з 3 па 28)** выстава пераедзе ў Магілёўскі абласны мастацкі музэй, а ў сьнежні **(з 1 па 29)** — у Гомель, у мастацкую галерэю Г.Вашчанкі.

**Адкрыты ліст**

У музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Ф.Скарыны, 47) **да 27 кастрычніка** працуе выстава жывапісу Аляксандра Верашчагіна «Адкрыты ліст». Квіткі: 2000.

**Парлямэнт Вялікага Княства**

**20 кастрычніка** ў Гістарычнай майстэрні (вул.Сухая, 25) адбудзецца паседжаньне на тэму «Эвалюцыя парлямэнцкай сыстэмы ВКЛ». Выступоўца — Уладзімер Падалінскі, кандыдат гістарычных навук. Пачатак а 18-й.

**Сьвет, зьменшаны ў 35 разоў**

У Доме-музэі І зьезду РСДРП з **19 кастрычніка** да **14 студзеня** адбудзецца ІІ выстава Менскага клюбу аматараў стэндавага мадэлізму «Мікрамадэль». Выявы танкаў, самалётаў, аўтамабіляў, фігуркі салдацікаў — у маштабе 1:35.

## Канцэрты

**Бардаўская восень-2004**

**З 22 да 24 кастрычніка** ў Бельску-Падляскім (Польшча) адбудзецца 11-ы фэстываль беларускай бардаўскай ды аўтарскай песьні «Бардаўская восень-2004».

**Тодар — найлепшае**

**21 кастрычніка** ў Палацы культуры вэтэранаў (Я.Купалы, 21) — вялікі сольны канцэрт Зьмітра Вайцюшкевіча. Слухачы пачуюць творы з праграм «Цацачная крама», «Балады», «Паравіны году», зь міжнародных праектаў — творы на японскую паэзію, італьянскія песьні. Цана квіткоў — ад 6000 да 10000 руб. Ня будзе толькі песень на вершы Р.Барадуліна — ім прысьвечаная асобная праграма «Паравоз каханьня». Прэзэнтацыя — у лістападзе.

**Будуць «Танкі»**

**22 кастрычніка** ў клюбе «Рэактар» — прэзэнтацыя беларускамоўнай праграмы «Нэйра Дзюбелю» «Танкі». Некалькі песьняў гурт выканае пад дуду. Сярод гасьцей імпрэзы — Лявон Вольскі і Алег Хаменка. Пачатак у 19.00.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Імпрэсіі. Барвы восені

**Музэй М.Багдановіча запрашае наведаць мастацкую выставу Алеся Шатэрніка «Імпрэсіі. Барвы восені». Жывапіс. Скульптура. Слова. Упершыню прадстаўленыя творы з пленэру, які летась адбыўся на радзіме Васіля Быкава. Выстава працягнецца да сярэдзіны лістапада. Музэй працуе з 10 да 17-й штодня акрамя панядзелка.**

Цана квіткоў — 8000 руб. (танцпол), 10000 руб. (столік).

**Сустрэча з «Indiga»**

**23 кастрычніка** «БМА-груп» і інтэрнэт-партал «Тузін гітоў» ладзяць сустрэчу з новай рок-князёўнай Русяй і яе групай «Indiga». Пабачыць музыкаў і паслухаць акустычны канцэрт можна а 12-й у клюбе філяфаністаў, што ў ДК МТЗ. Тамсама можна набыць апошнія дыскі айчынных музыкаў па зьніжаных цэнах. Уваход вольны.

**Беларуская Эльба**

**16—17 кастрычніка** пад Воршай адбудзецца VII Беларуская Эльба (зьлёт аўтастопнікаў). Збор на скрыжаваньні трас М1 (Масква—Берасьце) і Е95 (Санкт-Пецярбург—Адэса) у раёне Воршы.

Можна даехаць на электрычцы да Воршы, а адтуль прыгарадным цягнікам Ворша—Смаленск да станцыі «Барсукі» альбо «Хлусава» (ад Воршы другая); там выбіраецеся на трасу Е95 і топаеце альбо стопіце на кілямэтраў 5 да скрыжаваньня з М1. Альбо дызэль Ворша—Віцебск да станцыі «Юрцава» — адтуль выбіраецеся на М1 і пехатой у бок Масквы кілямэтраў 4—5. Каля трас будзе арганізаванае «сустрэчнае» вогнішча.

**Мэбля-2005**

**З 19 да 23 кастрычніка** ў павільёнах на пр.Машэрава, 14 і вул.Я.Купалы, 14 будзе праходзіць 11-я спэцыялізаваная выстава-кірмаш «Мэбля-2005».

## Тэатры

**Опэра**

14 (чц) — канцэрт «Гучыць раманс...».
16 (сб) — «Турандот».
21 (чц) — «Тоска».
23 (сб) — «Баль-маскарад».
24 (ндз) — «Сэвільскі цырульнік».

**Балет**

15 (пт) — «Легенда аб Уленшпігелю».
17 (ндз) — «Рамэо і Джульета».
19 (аўт) — «Сьпячая прыгажуня».
22 (пт) — «Дон Кіхот».
24 (ндз) — «Лебядзінае возера».

**Драматычны тэатар імя Горкага**

**Вялікая заля**

15 (пт) — «Перад захадам сонца».
16 (сб), 26 (аўт) — «Вольны шлюб».
17 (ндз) — «Суцяшальнік удоў».
19 (аўт) — «Ад'ютант-Ша яго Вялебнасьці».
20 (ср) — «Дзівакі».
21 (чц) — «Адзіны насьледнік».
22 (пт) — «Анджэла ды іншыя».
23 (сб) — «Дэтэктар хлусьні».
24 (ндз) — «Амфітрыён».

**Малая заля**

16 (сб) — «Пэрпэтум мобіле, альбо Вечар габрэйскай показкі».
21 (чц) — «Цяжкія людзі, альбо Жаніх зь Ерусаліму».

**Купалаўскі тэатар**

14 (чц) — «Эрык XIV».
22 (пт) — «Згубленны рай».
23 (сб) — «Ромул Вялікі».
24 (ндз) — «С.В.».

**Малая сцэна**

14 (чц) — «Баляда пра каханьне».
16 (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
17 (ндз) — «Муж для паэтэсы».
18 (пн) — «Салямэя».
20 (ср) — «Налу».
22 (пт) — «Барух-Эмануэль».

**Тэатар беларускай драматургіі**

14 (чц) — «Чарнобыльская малітва».
15 (пт) — «П'емонцкі зьвер».
16 (сб) — «Адэль».
17 (ндз) — «Толькі дурні сумуюць».
19 (аўт) — «Песьні ваўка».
20 (ср) — «Чорны квадрат».
21 (чц) — «Адвечная песьня».
22 (пт), 23 (сб) — «Містэр розыгрыш».
24 (ндз) — «Жанчыны Бэргмана».

**Беларускія сэзоны**

18 (пн) — «Ці лёгка падмануць жанчыну».
20 (ср) — «Сублімацыя каханьня».

**Новы драматычны тэатар**

14 (чц) — «Дазвольце спадзявацца».
15 (пт), 22 (пт) — «Квадратура кола».
19 (аўт) — «Жанчыне не забароніш».
20 (ср) — «Гарбата з вэрблюдам».
21 (чц) — «Ня бойся быць шчасьлівым».

**Сучасны мастацкі тэатар**

16 (сб) — «Мяшчанскае вясельле».
22 (пт) — «Галасы».
23 (сб) — «Дурное каханьне».

**Агенцыя «Альфа-канцэрт»**

23 (сб) у клюбе імя Дзяржынскага (вул.Камсамольская, 30) адбудзецца спэктакль «Валянцінаў дзень». Квіткі: 5000—10000.

**Моладзевы тэатар эстрады**

14 (чт) — «Эстрадны кактэйль».
15 (пт) — «Белы голуб».
22 (пт) — «Танцы ў чырвоным».
23 (сб) — «Блазны і лялькі».
24 (ндз) — «Уся справа ў капелюшы».

## Клюбнае жыцьцё

**Графіці** (280-01-54)

14 (чц), 20.00 — канцэрт Аляксандра Круглага.
15 (пт), 20.00 — вечар ROCKавай музыкі. Гурт «Варацень».
19 (аўт), 20.00 — канцэрт Аляксея Шадзька і Сяргея Анцішына.
20, 20.00 (ср) — вечар джазавай музыкі.
22, 20.00 (пт) — вечар ROCKавай музыкі. Гурт «LA BOMBA».

**Bronx** (288-10-61, «Velcom»: 103 і 105)

14 (чц), 22.00 — dj Kulikov.
15 (пт), 22.00 — жывая музыка: Flat (флямэнка).
16 (сб), 23.00 — «Playboy party»: dj James Fierce (UK, London). Квіткі: 20000—40000, playboy dresscode.

**Белая Вежа** (284-69-22, 239-16-00)

14 (чц), 22.00 — «White Tower Party»: dj Dee, dj Top, dj Bergamo.
15 (пт), 24.00 — дыскатэка «Euroclub»: dj Mixell, go-go.
16 (сб), 22.00 — дыскатэка «Euroclub».
17 (ндз), 22.00 — дыскатэка «Europop»: dj Alex.

**Гудвін** (226-13-06)

14 (чц), 21.00 — жывая музыка: «Мадэра Хард Блюз».
15 (пт), 21.00 — жывая музыка: джаз-трыё «N.C.».
17 (ндз), 21.00 — жывая музыка: Аркадзь Эскін і яго джаз-квартэт.

**Бліндаж** (219-00-10, 671-58-65)

14 (чц), 23.00 — resident dj Egor.
16 (сб), 23.00 — resident dj Egor.

**X-Ray** (223-93-55)

15 (пт), 22.00 — dj Bergamo.
16 (сб), 22.00 — dj Top.

## Менская кінаафіша з 15 па 17 кастрычніка

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Дзевяць ярдаў-2»: **15** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **16, 17** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
«Гульні матылькоў»: **15—17** (пт—ндз) 16.40, 18.40, 20.40.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Шырокім крокам»***: **15—17** (пт—ндз) 16.30, 21.00.
«Весьнягонская ваўчыца»: **15** (пт) 19.00; **16, 17** (сб, ндз) 14.30 (іл), 19.00.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Вакол сьвету за 80 дзён»: **15** (пт) 18.00 (іл); **16, 17** (сб, ндз) 18.00.
«Гульні матылькоў»: **15, 16** (пт, сб) 20.00; **17** (ндз) 20.00 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Паляўнічыя на розум»*** (прэм'ера): **15—17** (пт—ндз) 18.50, 21.00.
«Настасься Слуцкая»: **15** (пт) 14.50; **16, 17** (сб, ндз) 14.50 (іл), 16.40.

**«Масква»** (223-27-10)
«Паляўнічыя на розум»*** (прэм'ера): **15** (пт) 19.00 (пд), 21.00 (пд); **16, 17** (сб, ндз) 15.00 (іл), 19.00 (пд), 21.00 (пд).
«Дунечка» (прэм'ера): **15, 16** (пт, сб) 17.00 (іл); **17** (ндз) 13.00 (іл), 17.00 (іл).

**«Мір»** (284-37-71)
«Прадвесьнікі буры»: **15** (пт) 17.20; **16, 17** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.20.
«Эўратур»***: **15—17** (пт—ндз) 19.20, 21.20.
«Тата»: **15—17** (пт—ндз) 16.30, 18.30.
«Прынц і я»: **15—17** (пт—ндз) 20.30.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Дзевяць ярдаў-2»: **15** (пт) 21.00; **16, 17** (сб, ндз) 16.20 (іл), 18.40.
«Шырокім крокам»***: **16, 17** (сб, ндз) 21.00.
Фэстываль міжнароднай анімацыі «Крок па Менску»: **15** (пт) 18.00.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Шрэк-2»: **15** (пт) 15.00, 19.10; **16** (сб) 19.10; **17** (ндз) 11.00, 15.00, 19.10.
«Ван Хельсынг»: **15—17** (пт—ндз) 16.50, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Вадзіцель для Веры»***: **15** (пт) 13.30, 18.30; **16, 17** (сб, ндз) 11.00 (іл), 16.00.
«Вакол сьвету за 80 дзён»: **15** (пт) 11.00, 16.00, 21.00; **16, 17** (сб, ндз) 13.30, 18.30, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
(пд) — падоўжаны сэанс
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Для дзяцей

**Тэатар юнага гледача**

14 (чц), 20 (ср) — «Паганага нораву годныя вынікі».
15 (пт) — «Рыцар Сонца».
16 (сб) — «Апошняя дуэль».
16 (сб), 21 (чц) — «Палачанка».
17 (ндз) — «Дзень нараджэньня ката Леапольда».
19 (аўт) — «Каліф-шавец».

**Опэра**

17 (ндз) — «Кот у ботах».

**Новы драматычны тэатар**

16 (сб) — «Чароўная скрыпка».
23 (сб) — «Новыя прыгоды старых знаёмых».

**Сучасны мастацкі тэатар**

17 (ндз) — «Усе хлопчыкі — дурні».
24 (ндз) — «Малыш і Карлсан».

**Тэатар беларускай драматургіі**

16 (сб), 17 (ндз), 23 (сб), 24 (ндз) — «Хрустальны туфлік».

**Кіно**

**«Аўрора»**
«Скарб»: **15** (пт) 14.00; **16, 17** (сб, ндз) 14.30.

**«Берасьце»**
«Цімур і яго камандас»: **15** (пт) 14.30; **16, 17** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**
«Агент Кодзі Бэнкс»: **15** (пт) 12.00, 14.00; **16, 17** (13.00, 15.00).

**«Мір»**
«Браток медзьведзяня»: **15** (пт) 14.00; **16, 17** (сб, ндз) 12.00, 14.00.

**«Піянер»**
«Ліла і Стыч»: **15** (пт) 11.00; **16** (сб) 10.20.
«Зорныя сёстры»: **16** (сб) 14.00; **17** (ндз) 13.00.

КІНО Ў МЕНСКУ

# Сьвежыя трупы ў форце «Баярд»

Студэнты, якія вучацца ў ФБР на псыхолягаў-крыміналістаў, трымаюць на непрыветнай высьпе іспыты. У бязьлюдным горадзе з манэкенамі (адзін зь іх выпатрашаны й падвешаны на круках) кандыдаты ў адмысловыя агенты мусяць знайсьці ўяўнага забойцу. Але лялькамі справа не абмяжоўваецца — хтосьці пачынае забіваць і самых вучняў.

Карціна спалучае ў сабе інтэлектуальныя намёкі на «Дзесяць мурынчыкаў» Агаты Крысьці й моладзевую павярхоўнасьць крывавых жудасьцікаў (слэшэраў). У «Паляўнічых за розумам» юнацтва перамагае, але спосабы душагубства абстаўлены як старасьвецкія лягічныя пасткі з гадзіньнікамі, электрычнасьцю і атрутаю ў каве. Пасткі выглядаюць больш відовішчна за герояў, але акторам можна тэта дараваць, бо фільм не занудны.

У карціне ёсьць некалькі годных момантаў, калі страх разьліты ў атмасфэры й праточваецца праз вільгаць кафлі й шурпатых сьценаў. Аматары жахаў ацэняць забойства вадкім геліем, а фінальны падвоны паядынак выглядае надзвычай цікава й вынаходліва.

Але фільм падаецца высокабюджэтнай кінавэрсіяй папулярнай тэлегульні «Форт «Баярд». Толькі на кінавысьпе парасківаны сьвежыя трупы, а ўзнагарода за разгадку — ня грошы гульцам, а жыцьцё герояў.

**Андрэй Расінскі**



«Паляўнічыя на розум» («Mindhunters») ЗША—Нідэрлянды—Вялікабрытанія, 2004, каляровы, 106 хв.
**Жанр:** дэтэктыў, трылер
**Адзнака:** 5 (з 10)

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Болбас В. Этыка-пэдагагічная думка Беларусі (ад старажытнасьці да XVIII ст.).** — Менск: Беларуская навука, 2004. — 260 с. 700 ас.

У дасьледаваньні разглядаюцца фактары й умовы разьвіцьця этычнай і пэдагагічнай думкі на беларускіх землях, шырока аналізуюцца ідэі дзеячоў розных эпох — ад Кірылы Тураўскага да Ф.Бохвіца й інш. Цана 13000 руб.

**Бондар Т. Павуціньне:** Раман-містэрыя. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 223 с. 1000 ас.

Пісьменьніца зьвяртаецца да часоў Ісуса Хрыста.

**Выхота В. Беларуска-расейскі слоўнік: міжмоўныя амонімы, паронімы й полісэмія.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 120 с. 300 ас.

«Маніць»—«манить», «дыван»—«диван»... Аўтарка слоўніка, грунтуючыся на ўласнай памяці, лексыкаграфічных крыніцах і шматлікім тэкставым матэрыяле, назьбірала каля 2200 цалкам або часткова сугучных расейскіх і беларускіх слоў.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Школа

Эльфрыда Елінэк


TRAUMLANDSHAFTEN.AT

Літаратурную Нобэлеўскую прэмію атрымала аўстрыйская пісьменьніца, аўтарка п'ес, перакладчыца Эльфрыда Елінэк. Яна дэбютавала зборнікам вершаў «Цені Лізы» ў 1967 г. Пад уплывам студэнцкага руху ў 1970-м яна публікуе свой першы сацыяльна-крытычны раман — «Мы прынада, бэбі». Найбольш вядомыя творы: «Каханкі» (1975), «Юр» (1989), «Прагнасьць» (2000). Пісьменьніца мае дзясяткі прызоў за прозу і драматургію, у тым ліку Бюхнэраўскую прэмію. Фільм Міхаэля Ганэке паводле яе раману «Піяністка» перамог на Канскім кінафэстывалі 2001 г.

Ісьці ў школу — гэта як ісьці на сьмерць, ня ведаючы яе, але хто ж яе ведае? Пра сьмерць і пасьля нічога ўжо нельга расказаць. Але і школу разумееш, калі яна ўжо за плячыма. Гэта ў іх таксама супольнае, у сьмерці і школы. Бо загадзя ня ведаеш, як гэта скончыцца і ці скончыцца гэта; звычайна канчаецца, гэта значыць, у мяне было такое падазрэньне, бо перад прыватнай кляштарнай школай, у якую я хадзіла на паўінтэрнат (да пяці гадзінаў вечара), я наведвала яшчэ дзіцячы садок пры ёй. Я ўжо ў дзіцячым садку ведала, што пасьля нічога лепшага ня будзе. Вось жа, я заўсёды шыбавала туды вялікімі крокамі, душа мая звонка сутыкалася з душамі іншых падарожніц, бо менавіта душам прысьвячалася больш клопату і працы, чым целам, якія нават падчас гімнастычных практыкаваньняў былі схаваныя ў сацінавыя штаны да калена (агідны матэрыял, дагэтуль памятаю гэтае адчуваньне), каб іх не было відаць, а была відаць толькі душа, за якую вялося змаганьне з чортам пры дапамозе добрых твораў і «ахвяраў». Выглядала гэта так: дзяўчынкі, якія мелі прыгожую душу, у залежнасьці ад таўшчыні бацькоўскіх партманэ насілі шырокія ці вузкія стужкі як адзнакі за добрыя паводзіны і посьпехі. Сёньня мне кажуць, што гэта зламысная інтэрпрэтацыя, — былыя носьбіткі стужак кажуць гэта так, як быццам яны і сёньня хочуць прыкласьці руку да грудзей, дзе пад стужкай невідочна прысутная адданасьць мэце гэтай дзяржавы і яе дзяржаўнай рэлігіі, якая палягае ў тым, каб — чаго б гэтая роля ні патрабавала — належаць да найлепшых яе грамадзянаў, якія амаль усе з вышэйшай адукацыяй або замужам за вышэйшай адукацыяй. Ну, я такой ня стала, а гэта ж было сэнсам школы — стаць чымсьці. У кляштарнай школе я навучылася ўключаць і выключаць пабожную міну, залежна ад таго, дзе тая міна мела выбухнуць. Што паўсюль аднолькавае ў школе: трэба зважаць! А малітва — гэта тое, што ў кляштары залічваецца: можна зрабіць уражаньне на Бога і памучыцца самой. На настаўніцу глядзець паслухмяна і аддана, каб ёй не прыйшло ў галаву спраўдзіць, што ў цябе пад партай, о Божа, сшытак зь Мікі Маўсам. На першым прычасьці руплівa глядзець на партрэт Бога і яго мамы. Усё забаронена, улучна са сшыткам зь Мікі. Школа мае ўладу, яна можа ўсё праверыць, а тады кагосьці праверыць дадаткова. Цяжкі экзамэн. Мне сёньня яшчэ невыносна думаць, што хтосьці мае столькі ўлады, што можа чагосьці патрабаваць ад іншага, пагатоў уменьня, якое заўжды так недалікатна вырывае чалавека зь ягонай утульнасьці. Уменьне павінна было б заўсёды прыходзіць да чалавека зь яго ўласнага пачыну, а замік гэтага хтосьці ўвесь час паганяе, бо вынік мусіць быць дасягнуты — гэта і ёсьць выхаваньне: ёсьць мэта, і апроч мэты нічога няма. Пустыя вынікі, найглыбейшае сплашчэньне, у тым, што зьяўляецца, няма нічога лепшага, тым ня менш, яно застаецца, чапляецца за чалавека. Такім чынам, першы школьны час, да гімназіі, — духоўныя дасягненьні, нічога такога, у чым было б хоць штосьці вясёлае, усё гэта было забаронена, хаця Бог хоча, каб дзеці былі вясёлыя, але гэта ўсё толькі на словах, перадусім для дзяцей, якія пакутавалі так многа, як я. Мала хто пакутаваў больш, каб стаць цэлым. Да таго ж кепскія сямейныя ўмовы ў мяне дома. Крыкі бацькоў, шалёныя звадкі. Калі хочаце дапоўніць карцінку, то бок сабраць кавалкі, якіх яшчэ не стае, спакойна пасылайце сваіх дзяцей у кляштарную школу, каб яны зусім замкнуліся ад жыцьця, перш чым яны ўвогуле навучыліся адмыкаць дзьверы — ключом, які вісіць на матузку на шыі. Дзіця з ключом на шыі, але ключ не спачывае сабе спакойна, як расьліна ў зямлі, ён зноў і зноў адмыкае дзьверы да жаху. Калі ты дзіця, ты ж ня ведаеш, куды яшчэ можна пайсьці апроч дому, дзе цябе папраўляюць высьпяткамі і тычкамі. Фільм жахаў. Напісанае кідаюць на парты, дзіця просіць распавесьці, чаму яно навучылася. Гэта пыха людзей, якіх саміх нікому не даводзілася мераць, бо яны ніколі не апранали строю, якога ім хацелася б. Цяпер, я думаю, напэўна ўсё іначай. Я ня ведаю. Магчыма, сёньня дзеці насяляюць школы па сваёй волі. Мне ўсё яшчэ цяжка падумаць, што можна ісьці ў школу добраахвотна. Школа — супрацьлегласьць жыцьця, і, што яшчэ горш, у ёй можна развучыцца жыць, бо трэба вучыцца. Юнацкі ўздым падае і хутка памірае, бо ўжо не ўстае на ногі.

*28.5.2004*



Андрэй Хадановіч

## Яшчэ адзін літоўскі дывэртысмэнт

(з кнігі «Сто лі100ў на tut.by»)

@ @ @

*І разумееш: сьвяты, бляха, сьвяты...*
А.Хадановіч

Ці то сон, ці то новы сполах
вершаваньня ў чарговым опусе.
Дзьве гадзіны сяджу на колах —
паўдарогі да Вільні ў аўтобусе.

У мазгох — касьмічныя войны,
у вачох — усё перакулена:
і касьцёлу сьпічак падвойны,
і царквы малая цыбуліна.

На шляху — памежнік і мытнік,
спадарожнікі — мат на маце;
ты і сам нішто сабе «бітнік»
з каньяком у кішэнным фармаце.

Твая ўдача хадзіла ў прымах,
а цяпер — апусьціл ў кіпень.
А калісьці ў лагодных рымах
ты пісаў пра сьвяты і ліпень.

І нібыта — *в полном порядке*,
абмінуў падводныя міны...
Толькі згадкі, халера, згадкі,
успаміны, блін, успаміны...

@ @ @

Паэтычны запаведнік,
сотня блазнаў у вальеры.
Хто тут зубр, а хто наведнік —
два бакі адной кар'еры.

Хто ахвяра, хто заступнік,
хто нарэшце стаў шчасьлівым,
хто мяшае піва й крупнік,
хто мяшае крупнік зь півам.

Хто — наяве, хто — у сьненьні,
але ўсе глядзяць ільвамі:
хто кайфуе, бо натхненьне,
хто сумуе, бо ня з Вамі.

@ @ @

Залатая восень. Друскенікі.
Віртуозы й проста пісьменьнікі.
На квадратным мэтры — па мэтры.
І — дыскусія аб паветры.

Недзе блізка — віно й паненкі,
як паветра глыток дармовы...
А навокал — чатыры сьценкі
і — прамовы, прамовы, прамовы.

Прамаўляючы ў стылі рэтра,
задыхаюся на паўслове,
бо даўно не стае паветра,
а, магчыма, проста любові.

@ @ @

У кавярні, якую наведваў Бродзкі (ці Троцкі),
дзе, паводле зьвестак, павольна бягуць хвіліны,
прыдумляй свой вершык задроцкі,
жуючы свае цэпэліны.

Ля французкай кнігарні ці муру старой друкарні
зь беларускамоўнаю шыльдай пі з рыльца
брэндзі,
у каменнага польскага парня
запытаўшыся: «Co to bedzie?»

Да сярэдзіны ночы ля сажалкі на Зарэччы
зь сябрукамі-літоўцамі ладзь шчасьлівую п'янку.
А пасьля хапайся за рэчы
і дадому цягніся зранку.

Нібы Троцкі, ці Бродзкі, ці нехта трэці,
руш у Трокі, у Броды, у тагасьвецце.

@ @ @

Вершаваны літоўскі нарыс.
Павуціны апошні волас.
Прагулянка берагам Нярыс.
Паляваньне на рыфму ўголас.

Рандэву на віленскім бруку.
Унівэрсытэцкі падворак.
Дыялёгі, лішнія ў друку.
Постпахмельны звыклы аўторак.

Мэдытацыя ў Вострай Браме
і блуканьне ў краме зь сябрамі.
Зноў бухаю, але цывільней,
бо заключны вечар у Вільні.

@ @ @

...і чуеш, як родны памежнік
кажа мне:
«Здравствуйте!»
У.Арлоў

Між Летувой і РБ — тэрыторыя нічыя.
Колы змаўкаюць. Мытнікі абыходзяць вагоны.
Зараз будуць глядзець у пашпарт, бы там — ня я,
а каляровы здымак Мэдузы Гаргоны...

Толькі раптоўна:
«Спадар Хадановіч? Андрэю!»
Слухаю — і дурэю.

Нібы з марозу добра заліў за каршэнь,
я адчуваю радасьці поўную аблачыну
ў штанах, куды за пашпартам лезу ў кішэнь,
зачараваны ілюзіяй, што вярнуўся ў сваю айчыну.

*30 верасьня — 6 кастрычніка 2004,*
*Менск—Вільня—Друскенікі—Вільня—Менск*

# Новы пах Нобэлю

**Працяг са старонкі 2.**

Апісаньне падлізваньня задніцы — цяпер амаль што акадэмізм і ўжо бясспрэчна эстэтычная норма (цікава, што сюжэт раману «Норма» папулярнага расейца Ўладзімера Сарокіна — паяданьне гаўна).

Усё гэта я як чалавек хаця і прыналежны да гетэрасэксуальнай традыцыі ў асабістым жыцьці, а літаратуры — да рэалізму гатовы прызнаць. І ўсё ж.

Ці не зашмат гаўна?

У дзень абвяшчэньня імя новай нобэлеўскай ляўрэаткі я патэлефанаваў у Менск некаторым пісьменьнікам — ніхто, ніводзін ня чуў гэтага прозьвішча — Елінэк. Дарэчы, практычна невядомымі ня толькі чытачам, але і літаратарам былі і большасьць зь ляўрэатаў папярэдніх дзесяці гадоў (гэта ўжо Нобэль прынёс ім вядомасьць. Хаця некаторыя імёны і сёньня, пасьля цырымоні ў Стакгольме, нічога ня скажуць). А з далёкіх дзесяцігодзьдзяў — што вам скажуць імёны Гілерупа, Пандапідана, Бака, Сьпітэлера?

А тым часам, бяз прэміі засталіся Леў Талстой, Марсэль Пруст, Шолам-Алейхем, Франц Кафка, Уладзімер Набокаў… Ня маюць прэміі Сэлінджэр, Апдайк, Норман Мэйлер з амэрыканцаў, Мілян Кундэра, Умбэрта Эка з эўрапейцаў — называю толькі тых, хто вядомы, думаю, кожнаму чытачу «Нашай Нівы» і чые літаратурныя заслугі прызнаныя прыхільнікамі якіх хочаце мастацкіх плыняў.

Гэта азначае толькі адно: прэмія ня ёсьць аб'ектыўным выяўленьнем літаратурнага ўзроўню. Яна адлюстроўвае нешта іншае.

У розныя дзесяцігодзьдзі на рашэньне Нобэлеўскага камітэту ўплывалі розныя палітычныя меркаваньні, хаця трэба прызнаць, што даволі часта палітычныя рацыі супадалі зь літаратурнымі, эстэтычнымі вартасьцямі (ад таго, што Шолахаў быў членам ЦК КПСС і апраўдваў камуністычны рэжым, «Ціхі Дон» не перастае быць геніяльным раманам. Гэтак жа і проза Салжаніцына, якая была зброяй у барацьбе з камунізмам, застаецца і пасьля таго, як памрэ апошні камуніст).

Цяпер прэмія — даніна паліткарэктнасьці, што пацьвярджае і апошняе ляўрэацтва — пры ўсёй, здавалася б, «адвязнасьці» ляўрэаткі (Елінэк прадкрэсьлівае сваю апалітычнасьць).

Некаторыя крытыкі вызначаюць Елінэк як «марксісцкую фэміністку», што сымпатызавала левым поглядам. Вось гэта, мне падаецца, і адыграла найбольшую ролю. Цяперашняе рашэньне Нобэлеўскага камітэту цалкам супадае з пафасам рашэньня журы апошняга Канскага кінафэстывалю, дзе гран-пры дастаўся дакумэнтальнаму антыбушаўскаму фільму (вядома, члены журы — пацыфісты; паняцьце вайны цывілізацыяў — гэта нешта далёкае для іх. Вось калі ісламісцкія экстрэмісты навязкуць сваю волю іншым краінам, як зрабілі гэта ў Гішпаніі, калі джэнтэльмэнаў прымусяць пяць разоў на дзень апускацца на калені, каб узнесьць хвалу Алаху, а левалібэральных кабет замест дэкальтэ апрануць у паранджу — вось тут зробіцца блізка. Але позна).

І што з усяго гэтага нам, беларусам?

З таго, што ўжо ня выправіш толькі адна высновa: да Нобэлеўскай прэміі, якая ёсьць вынікам спалучэньня палітычнага ды нацыянальнага лабіяваньня, мы павінны былі паставіцца выключна прагматычна. Зразумела, што галоўнае ў той прэміі — ня грошы; сёньня трохпакаёвая кватэра ня ў самым прэстыжным раёне Мангэтану каштуе больш за мільён. Васіль Быкаў не атрымаў Нобэлю не таму, што ў свой час атрымаў Ленінскую прэмію (была Ленінская і ў Шолахава). Быкаў ня меў якасных перакладаў на швэдзкую мову. Трэба было зрабіць падрадкоўнік «Мёртвым не баліць», «Сотнікава» і «Знаку бяды» на швэдзкую, знайсьці ў бюджэце тысяч сто — сто пяцьдзясят даляраў ды падпісаць кантракт з добрым швэдзкім пісьменьнікам на якасны пераклад. Аналягічныя прапановы на пачатку 90-х гадоў выказваліся дэпутатамі БНФ, ды дзеля гэтага патрэбна было ўладнае рашэньне. Было б добра і для Быкава, і для Беларусі, якой гэтая прэмія дала б прызнаньне як сувэрэннай краіне — не палітычнае, а інфармацыйнае.

Пасьля сьмерці Быкава я страціў цікавасьць да рашэньняў швэдзкай Акадэміі, а пасьля мінулага чацьвярга ўжо і ня вельмі сумую, што Быкаў не атрымаў Нобэлю. Хай ён застанецца ў кампаніі Талстога, Пруста ды іншых слынных.

А спадарыня Елінэк, кажуць, адмовілася ехаць у Стакгольм на цырымонію — сказала, што ёсьць куды больш вартыя прэміі пісьменьнікі. Сумленьне ў гэтай фраў, бясспрэчна, ёсьць.

*Прага*

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Апошні рэфэрэндум



Мой прагноз: гэты рэфэрэндум — адзін з апошніх у гісторыі РБ. Іх прагрэсуючая колькасць і прадказальныя вынікі лягічна выклікаюць эфэкт інфляцыі — недавер.

Нават на Захадзе, калі мяне не падводзіць памяць, быў толькі адзін выпадак, калі ўлада, што ініцыявала рэфэрэндум, засталася ў аўце: у красавіку 1969 г. дэ Голь прайграў плебісцыт наконт рэформы мясцовай адміністрацыі і пайшоў у адстаўку. Самае прыкольнае, што сапраўднай прычынай рэфэрэндуму былі пацукі, якія масава прапісаліся на Парыскім рынку. Чамусьці генэралу было мала «Ордэну Пачэснага Легіёну» — яму не давалі пакою ляўры мітычнага музыкі, які дзякуючы чароўнай дудзе выратаваў горад ад пацукоў. Сваім праектам прэзыдент парушаў прэрагатывы парыскага муніцыпалітэту, які лічыў сталічных грызуноў суб’ектамі сваіх паўнамоцтваў. Фіналам непаразуменьня паміж галінамі ўлады і стаў рэфэрэндум, на якім дэ Голя апусьцілі.

Зразумела, што ў краіне пад белымі крыламі ды ўвогуле ва ўсім былым саўку такое пакуль было немагчыма. Калі б дэголеўская Францыя была адным з былых бантустанаў СССР, сцэнар падзей быў бы наступны: уся краіна была б пакрыта бігбордамі «За Францыю!», прафэсары Фуко, Крысьцева і Жак Іў Кусто пагналі б сваіх студэнтаў на датэрміновае галасаваньне, де Голь «на дыване» ў Елісэйскім палацы асабіста паадшыбаў бы рогі дырэктару «Рэно», работнікі якога не далі б патрэбнага паказчыку падчас папярэдняга галасаваньня, Гадар — рэжысэр тэлесэрыялу «Найноўшая гісторыя Францыі» — параўнаў бы апазыцыянэраў, якія б нешта вякалі за самакіраваньне, з дэструктыўнымі пацукамі.

Рэфэрэндумы ў нашым рэгіёне далёкія ад заходніх стандартаў, таму ў будучым гарантаваць легітымізацыю ўлады яны наўрад ці будуць здольны. Ну, яшчэ адзін рэфэрэндум у 2011 г. мы пацягнем, а потым вусы і брыфінгі прэс-сакратара МЗС Савіных пра «двайныя стандарты» прымільгаюцца. Калі дынастыі Назарбаевых, Аліевых і Шклоўскіх зьбіраюцца руліць намі і далей, ім ужо цяпер трэба падумаць пра замену інстытуту рэфэрэндуму больш сучасным.

Тым болей што нашы продкі ў хвіліны, калі на кану стаяў лёс радзімы, ніколі не карысталіся плебісцытамі, а прыдумалі сапраўды эфэктыўныя тэхналёгіі выяўленьня народных забабонаў. Напрыклад, практыка веча.

Чаму б, калі бацька абвясьціў сябе архіватарам спадчыны, беларусам не вярнуцца да вечавых кагалаў? …17 кастрычніка на перазвон у цэрквах да плошчы Бангалор з усёй краіны падцягваецца піпл. ЦВК выносіць на агульнанароднае абмеркаваньне пытаньне аб трэцім тэрміне. Пачынаецца народнае волевыяўленьне: партыі равуць «Так!» або «Не!», аргумэнтуючы свае пазыцыі плюхамі па мардасах. Бацькавы тыфозі на чале з Паўлючэнкам калашмацяцца з адмарозкамі «Зубра» і белымі легіянэрамі. Вакол бегаюць сябры КХП-БНФ, заклікаючы грамадзян ня ўдзельнічаць у дыктатарскім фарсе. У восем гадзінаў вечара рэфэрэндум скончаны. Ярмошына падлічвае колькасьць параненых з абодвух бакоў і абвяшчае вынікі.

Або чаму, напрыклад, напрамак магістральнага шляху разьвіцьця нацыі не вызначаць праз знак волі боскай? 17 кастрычніка выбаршчыкі зьбіраюцца каля мосту на Нямізе і шпурляюць зьвязанага кандыдата ў Сьвіслач. «Шаноўныя назіральнікі АБСЭ, — тлумачыць старшыня ЦВК правілы рэфэрэндуму, — калі дайвэр здужыць выплыць, то, значыць, багі падтрымліваюць яго новую рэдакцыю Канстытуцыі. Калі пойдзе карміць акунёў — Пярун і Ярыла палічылі яго недастойным тытулу прэзыдента РБ». Як бачым, адміністрацыйны рэсурс і манапалізацыі СМІ тут ніякай ролі не адыгрываюць — хіба што прэзыдэнту, як Іхтыяндру, прышчэпяць шчэлепы акулы. Таму калі над рачнымі хвалямі зьявяцца знаёмыя вусы, назіральнікам АБСЭ нічога не застанецца, як канстатаваць факт «элегантнай перамогі».

Для папулістаў-палітыкаў, якія ганарацца нябачнай пупавінай, што зьвязвае іх з народам, можна ўвесьці ўвогуле брутальны рэфэрэндум: застанешся на нагах, засасаўшы брацін чарніла «Крыжачок», — ідзеш на наступны тэрмін.

Якія яшчэ могуць быць гарантыі жыцьцяздольнай дэмакратыі, што можа выратаваць нас ад атручальнага эфэкту ператтаксыкацыі рэфэрэндумамі?

**Лёлік Ушкін**


WWW.INDIAFM.COM

**Беларусы ў Балівудзе. Старонка 7.**

**Беларусы ў Балівудзе. Старонка 7.**

**Запрашаем у падарожжа**
**16 кастрычніка** (субота)
**«Астравецкі раён»**: Менск —Смургонь—Жодзішкі—Гервяты—Міхалішкі—Варона—Варняны—Трокенікі—Гудагай—Менск. Цана 20000 рублёў.
**24 кастрычніка** (нядзеля): **Сынкавічы — Слонім — Альбярцін — Ружаны — Косава**. Цана 21000.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал).

## КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на стар. 16

**Рэклямныя расцэнкі:**
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль)— 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764. На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».
Даведкі праз т. (017) 284-73-29

КАІСА

# Радзіма шахматных зуброў

Сутнасьць шахматаў — у пэрманэнтным аналізе і выбары працягаў, пры гэтым нішто не замінае гульцам выбраць альбо стварыць іншы варыянт шахмат. Спробы пашырэньня дошкі, увядзеньня нязвыклых правілаў рабіліся і 100 год назад, у тым ліку асобамі рангу Капаблянкі. Постмадэрн накладае адбітак на прастору інтэлектуальных гульняў. Ледзь не штогод на рынак укідваюцца розныя прыдумкі для аматараў аўтэнтычнасьці. Згодна з законамі маркетынгу, новае выдаецца за добра забытае старое.

Вось «расейскія шахматы», што маюць дабрадзеяў ва ўрадзе Масквы. Экс-чэмпіён сьвету Анатоль Карпаў таксама наважыўся згуляць колькі паказальных партый у «гульню расейскіх князёў». Гібрыд шахматаў і шашак, квазіпаганскія назвы фігур — «хелга», «грыдзень». Маруднае перасоўваньне шашак-«таўрэляў», што нагрувашчваюцца адна на адну, фармуючы кшталт вежаў. Не іначай як за спінай інаватараў стаіць адзін вядомы архітэктар з грузінскім прозьвішчам…

Ці «палестынскія шахматы» — таксама нешта сярэдняе паміж шахматамі і шашкамі, але досыць просталінейнае: фігура, што бярэ фішку суперніка, гіне ўсьлед за ёй. Думаецца, не далёкі той дзень, калі Ясыр Арафат падзякуе сваім верным расейскім сябрам за гэткі арыгінальны падарунак — шахматны па форме, палітычны па зьмесьце. Дагэтуль тэма «фігур-камікадзэ» разьвівалася хіба што ў шахматнай кампазыцыі, дзе ёсьць адмысловы разьдзел «fairy chess» — «казачныя шахматы». Напрыклад, жырафа рушыць на адну клетку па гарызанталі і чатыры па вэртыкалі альбо, наадварот, скача церазь фігуры.

Калі беларуская зборная на 36-й Сусьветнай шахматнай Алімпіядзе ў Гішпаніі раптам выступіць няўдала, трэба чакаць зьяўленьня вэрсіі беларускіх шахматаў з «зубрамі» ды «бабрамі» заміж сланоў і коней. Зубр, дарэчы, ужо існуе ў «казачных шахматах»: тамака ён спалучае якасьці каня і жырафы. А мо ўвесьці фігуру «Прэзыдэнт», якая, нібы ў паказцы з кнігі С.Калінкінай і П.Шарамета, пойдзе, куды захоча, і возьме, што захоча?

**ВР**

## Як бы вы згулялі?

**А.Лукашок — В.Цацераў, Віцебск, 2004. Ход белых.**

**В.Цацераў мае матэрыяльную перавагу і зрабіў «вілку». Як бараніцца белым?**



У канцы верасьня гадаванец наваполацкай шахматнай школы Віталь Цацераў выканаў норму міжнароднага гросмайстра на турніры ў Запарожжы. Далучаемся да віншаваньняў.

**Адказ**: 1. Тg7! Крg7 2. e5 Фd3 3. cd fe 4. Фg5+ зь вечным шахам і нічыёй.

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Юрка**, з народзінамі! Хопіць забівацца, яна шматкроць пашкадуе, што здрадзіла, а ў цябе ўсё будзе добра! Азірніся навокал! С.

**Віншуем** зацную пані Тацяну Лецку з Днём сочыва! Ву зэт шармант, ком тужур! Ну ву з’амбрасон трэ форт! Ле каляларатор дэ ОДЫГР

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Кнігаабмен.** Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 8-029-753-91-96

**Беларуская музыка** ў Слуцку. Вялікі выбар CD, аўдыёкасэт зь беларускай музыкай і ня толькі ў павільёне №153 на Базарнай плошчы ў Слуцку

**Ствараецца фан-клюб** беларускай музыкі ў Слуцку. Далучайцеся. Т.: 2-44-68 (Сяргей), 2-99-83, 8-029-691-86-25 (Артур)

**Куплю кнігу** І.Марзалюка «Людзі даўняй Беларусі». Т.: 243-98-10, Натальля

**Прадаю** CD: «NRM»: «Spravazdača» (з аўтографам Вольскага), «Стары Ольса», «Шлях», «Ulis»: «Падарожжа», «Viza NRM». Т.: 8-029-509-18-23, Зьміцер

**Прадаю** CD: «Partyzone»: «Трэба рабіць», «Генэралы айчыннага року». Т.: 8-029-509-18-23, Зьміцер

**Прадам** кнігі: «Энцыклапэдыя гісторыі Беларусі», т.1, 2, «Археалёгія Беларусі» ў 4 т., «Беларускія пісьменьнікі» ў 6 т., часопіс «pARTisan» 1/2—2. Т.: 283-37-45

**Прадам** кнігі: В.Ластоўскі «Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» (Коўна, 1924), Байкоў, Некрашэвіч «Беларуска-расійскі слоўнік», В.Ластоўскі «Творы» («Беларускі кнігазбор»), збор твораў В.Быкава ў 6 тамах, 1994 ды інш. Т.: 236-02-15

**Прадам** кніжку (3 тамы) Аляксандра Афанасьева «Мифы, поверья и суеверья славян». Т.: 205-97-72. Аляксандар

**Куплю** «Беларускую энцыклапэдыю», т.1—3, 6, 7; «Энцыклапэдыю гісторыі Беларусі», т.4, 5. Т.: 613-70-85, Алесь

**Новыя нумары** «Arche», «Расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік» Власта, «Беларуска-расійскі слоўнік» Байкова і Некрашэвіча, «Слоўнік мовы Янкі Купалы» (т.1), «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», іншыя кнгі, часопісы, відэа, аўдыё, CD, майкі з нацыянальнай сымболікай на Румянцава, 13 (ТБМ) з панядзелка па пятніцу, 11.30—17.30

### ПРАЦА

**Вэб-майстра** адказнага і кваліфікаванага (HTML, PHP, MySQL) шукаем для працы за грошы над беларускімі праектамі. Дасылайце CV на адрас ja-ja@tut.by

**Калі хто можа** загрузіць у мабільны тэлефон беларускія мэлёдыі, адгукніцеся! Т.: 8-029-636-43-08, Купалінка

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Аўтару «Бабы Броні».** «Баба Броня» — выдатная стылізацыя, аўтар якой адчувае тонкасьці беларускіх гаворак і сьвядомасьці. Аднак ёй бракуе вострай праблемнасьці, так неабходнай гумарыстычнаму твору. Калі яе няма, чытачу цяжка зразумець, што аўтар хацеў усім гэтым сказаць, дзеля чаго пісаў, з чаго, уласна, сьмяяцца. Бо з дапамогай стылізацыі можна раскрываць праблему, падмяняць апошнюю стылізацыя ня можа. Іначай пісаньне ператвараецца ў чысты прыкол, адрасаваны дзясятку сяброў. Пакуль баба Броня мае толькі фармальную прывязку да рэчаіснасьці, а яе рэфлексіі вядуць нас у гушчэчу інтэлігенцкай герметычнасьці. Гляньце яе вачыма ня ўглыб сябе, а навокал, на рэальную Беларусь зь яе рэальнымі праблемамі. Творы, напісаныя ад імя «беларускай бабулькі» сёньня былі б запатрабаваныя.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3499. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 13.10.2004.
Замова № 6282.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а